
Невядомыя старонкі
беларускага нацыянальнага руху

Пётр Сяўрук

НЕБЫЦЦЯ НЕ ІСНУЕ



Тарадзінская бібліятэка

НЕБЫЦЦЯ НЕ ІСНУЕ

Невядомыя старонкі
беларускага нацыянальнага руху

Гародня – Wrocław



Серыя „Гарадзенская бібліятэка" выдаецца пад патранатам Аляксандра Мілінкевіча, лідэра Руху „За Свабоду", лаўрэата прэміі Еўрапейскага парламента імя А. Сахарава „За свабоду думкі"

Copyright © by Гарадзенскі Рух „За Свабоду", 2008
Copyright © by Kolegium Europy Wschodniej
im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego, 2008

Укладанне, уступныя тэксты, каментары і карэктура:
Андрэй Вашкевіч і Сяргей Токць
Лагатып серыі і праект вокладкі: Алеся Раднова
Рэцэнзент: Алесь Смалянчук, доктар гістарычных навук
Графічная апрацоўка і дызайн: Юлія Радс
Фота з прыватных архіваў М.Францавай, В.Сяўрук

Каардынатар серыі: Павал Мажэйка

Дапамога ў выданні:

Гміна Вроцлаў,
www.wroclaw.pl

Польска-
амерыканскі фонд
Свабоды (PAFW)

Выданне серыі стала магчымым дзякуючы праграме замежнай дапамогі Міністэрства замежных спраў Польшчы ў 2007 годзе

Друк:
Wrocławska Drukarnia Naukowa PAN im. S. Kulczyńskiego Sp. z o.o.
ISBN: 978-83-89185-68-6

Гарадзенскі Рух „За Свабоду"
e-mail:
zasvabodu.hrodna@gmail.com

www.milinkevich.org

ЗМЕСТ

З іх пачыналася сучасная
беларуская ідэя нацыянальнай незалежнасці 5
Пётр Сяўрук і сучаснасць 8
Жыццёвая дарога Пятра Сяўрука і яго час 10
Беларускі нацыянальны рух на Скідзельшчыне 17

ПУБЛІЦЫСТЫКА
Мова і нацыя 33
Аб беларускай літэратуры 35
Аб мове, народзе і друку ў роднай мове
(з поваду 20-х угодкаў беларускае прэсы) 42
Родная мова і навука. Да "Заранкі" 47
Агляд жыцьця Заходняе Беларусі 48
Даклад аб стане гурткоў Таварыства
Беларускай школы ў Горадзенскім павеце 52
Аб беларускай прэсе 54
Нацыя і нацыяналізм 58
Аб чым пішуць газэты 62
Хто сьвядомы чалавек 65
Да "правадыроў" беларускага народу 68
Ліст да кіраўніцтва Таварыства Беларускай Школы 71

У ПОШУКАХ СЭНСУ ЖЫЦЦЯ:
ФІЛАСОФСКІЯ РАЗВАЖАННІ П.СЯЎРУКА
Бо ёсьць... 75
Моя философия 77
Мое исповедание 88
Што такое п'янства 94
Краса і радасьць жыцьця 106
Самаузгадаваньне 106
Тэстамэнт свабоды 106
Права на зямлю 107

ПАЭЗІЯ
Селяне цёмныя пакутнай Беларусі 111
Пра сваю працу 112
Не хачу 113
Вымаганьне 114
Песьні сэрца 115
Як пачуеш... 116
Хто шчасьця жадае... 117
Хто хоча мяне зразумець... 119
Здавальненьне 120

Памяці Казімера Сваяка 122
Найвялікшая ў жыццьці людзкая задача... 123
Прыкметы 124
Пранясі мяне лёт па-над жыцем.... 125
Песня ратая-беларуса 126
Як сум ў душэ маей таўпіцца 127
Маё... 128
Самае лепшае 129
У касьбу 129
Мне не страшна... 130
Камбінацыя думак М.Багдановіча 131
Міхасю Васільку 131
Вязьням 133
Памяці Максіма Багдановіча 134
Чаго сэрца баліць?.. 135
Гляне сонца з-за хмараў 136
Адказ па пытаннне Максіма Багдановіча 137
Розныя колеры вясёлкавай дугі 138
На магілу М.Багдановіча 138
Нудную песьню вецер заводзіць... 139
Агарнуліся родныя далі туманамі... 139
Мы маліліся... 140
Песьня сьмерці. Наследаваньне з Некрасава 141
Працоўны Волат, бяры свой молат... 141
Я працую, як вол – Пан без працы жыве... 142
Ўсё шуміць і шуміць векавечны наш бор... 143
Якубу Коласу 143
З зімовых настрояў 143
Беларусь! Ты мой край дарагі 144
Запалілася сэрца каханьнем 144
Я радзіўся ў краіне лясоў і балотаў 144
Нашто сэрца мае растраўляеце 145

ПРОЗА
Тайна маны 149
Гісторыя аднае сьмерці 151
Чыталі 154
Споведзь Беззямельнага 157

ЛІСТАВАННЕ 161

УРЫЎКІ З ДЗЁННІКА (1921—1929 г.) 181

І не згарэлі, і сёння патрэбныя 214

Каментары 218
БІБЛІЯГРАФІЯ публікацый твораў
Пятра Сяўрука і прац аб яго жыцці і творчасці 239

З іх пачыналася сучасная беларуская ідэя нацыянальнай незалежнасці

Імёны некаторых выдатных беларускіх пісьменнікаў, вучоных, культурных ці палітычных дзеячаў вядомыя сёння амаль кожнаму беларусу, які ведае айчынную гісторыю, а часта таксама чытачам іншых нацыянальнасцяў і ў іншых краінах. Такімі постацямі з'яўляюцца, напрыклад, Браніслаў Тарашкевіч, вучоны, дзеяч, палітычны вязень у Польшчы, які стаў ахвярай рэпрэсій у СССР, а таксама браты Іван і Антон Луцкевічы, палітычныя дзеячы, пісьменнікі. Шмат беларускіх дзеячаў, абвінавачаных у антыдзяржаўнай дзейнасці, пабывала перад 1939 годам у польскай турме. Многа інтэлектуалаў, падманутых лозунгам інтэрнацыяналізму і кароткатэрміновай палітыкай "карэнізацыі" ў Савецкім Саюзе, разгарнула на Радзіме навуковую працу, папулярызавала веды аб беларускай культуры і мове, каб праз некалькі год трапіць у лагер, альбо стаць ахвярай забойстваў па прысуду псеўдасудоў паводле сфальсіфікаваных абвінавачванняў. Прычынай, фактычна адзіным праўдзівым абвінавачваннем супраць іх, была праца на карысць нацыянальнай культуры і абарона беларускай мовы. Іх творчасць на роднай мове, асветніцкая і палітычная праца былі перашкодай як для русіфікацыі, так і для паланізацыі беларусаў, якіх трактавалі як звычайны "этнаграфічны матэрыял".

Выдатныя дзеячы і інтэлектуалы пакінулі пасля сябе працы (часам такія, як беларускі пераклад паэмы "Пан Тадэвуш" пяра Адама Міцкевіча, апублікаваны праз шмат гадоў, калі ўдалося вярнуць у нацыянальную памяць імя Браніслава Тарашкевіча). Даведваемся пра іх дзейнасць з дакументаў, часам успамінаў, а таксама з газет і стэнаграм Сейма Рэчы Паспалітай Польскай.

Аднак, бясспрэчна, выключны — без перабольшання — росквіт беларускага нацыянальнага і грамадскага руху ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя быў бы немагчымы без многіх, не так шырока вядомых, дзеячаў, сёння, як правіла, забытых, якія станавіліся ініцыятарамі і арганізатарамі разнастайных лакальных гурткоў, чытальняў, пачатковых школ, тэатральных гурткоў і іншых суполак. Праўда, пра многіх з іх згадваюць дакументы паліцыі, але яны часта ўтрымліваюць інфармацыю, якая не адпавядае рэчаіснасці, хоць бы па той прычыне, што аўтары рапартаў не надта добра разумелі сапраўдны сэнс падзеяў, аб якіх даносілі. Для многіх функцыянераў паліцыі кожная "антыдзяржаўная" дзейнасць ва ўсходніх ваяводствах асацыявалася з камунізмам. Зрэш-

ты, так думалі не толькі шэраговыя паліцэйскія. Скрайняй праявай быў пастырскі ліст віленскага арцыбіскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага. Ён ў 1928 годзе абвінаваціў Беларускую Хрысціянскую Дэмакратыю, якая адкідала камуністычныя канцэпцыі, у "памылках рэлігійнай індэферэнцыі і бальшавізму", паколькі партыя абараняла ідэю бясплатнай перадачы зямлі сялянам і аддзяленне касцёла ад дзяржавы.

Без гэтых шматлікіх лакальных дзеячаў не было б ні слаўнай Грамады, ні Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, ні іншых беларускіх палітычных партый, таварыстваў, чытальняў і разнастайных інстытуцый. Яны былі змушаны пераадольваць перашкоды не толькі з боку ўладаў, але і абыякавасць сваякоў, іх галечу, неабходнасць выключна цяжка працаваць на зямлі ці ў майстэрні, пасля чаго ў іх не заставалася сілы на зацікаўленасць культурай. Як правіла, памятала пра іх сям'я, прыяцелі і суседзі, часам яны пакінулі некаторыя дакументы, нататкі, часам артыкулы, якія не з'явіліся ў друку і перахоўваліся на паддашшах гарадскіх будынкаў і вясковых хат. Але праходзілі гады. Пераслед беларускіх дзеячаў пасля 17 верасня 1939 года савецкімі органамі бяспекі схіліў шмат сем'яў да знішчэння сямейных архіваў, якія маглі стаць матэрыялам для пракурора. Нямецкі напад на СССР меў вынікам некалькі год новай акупацыі, а таксама двухразовае праходжанне фронту праз беларускія землі. Беларусь належала да найбольш знішчаных краінаў Еўропы з найбольшымі людскімі стратамі. Гінулі людзі, якія памяталі мінулае. Гарэў набытак, а з ім і паперы. Вярнулася савецкая ўлада, пры якой нават згадваць аб нацыянальных дзеячах было небяспечна; лепш было зацiраць памяць, нішчыць дакументы.

Але нягледзячы ні на што, адшукваюцца сёння сведчанні пра людзей, якія ва ўласнай вёсцы ці мястэчку спрычыніліся да таго, каб беларуская культура, бацькоўская мова не загінулі насуперак усім перашкодам. Шкода, што знаходзяць іх няшмат, але тым большы гонар для тых, хто гэтыя сведчанні захаваў, а таксама вучоным, якія адшукалі іх уладальнікаў, пераканалі ў іх каштоўнасці для ўсяго беларускага грамадства, давялі да публікацыі.

Пётр Сяўрук належаў, нягледзячы на свой малады ўзрост, да дзеячаў, без якіх у Польшчы паміж войнамі не было б Таварыства Беларускай Школы, а таксама іншых культурна-асветніцкіх пляцовак. Падчас вайны, у бежанстве, ён наведваў рускую школу, чытаць і пісаць па-беларуску навучыўся пазней. Маючы толькі пачатковую адукацыю, Пётр быў захопленым чытачом кніжак і атрымаў значныя веды, а таксама меў літаратурныя здольнасці. У сваіх артыкулах і дзённіку ён адмяжоўваўся ад палітыкі, але незалежна ад сваіх словаў, быў у яе ўплецены, неаднаразова змагаўся словам з левымі радыкаламі, крытычна ацэнь-

ваў дзейнасць камуністаў у Польшчы і іх эксперыменты ў СССР. Таксама і праца над пашырэннем беларускай асветы і абарона роднай мовы (у яго публіцыстыцы бачны ўплыў думкі знакамітага паэта Францішка Багушэвіча) атрымлівалі ў савецкіх і польскіх умовах палітычны характар, незалежна ад памкнення вызваліць ТБШ ад палітычных уплываў, асабліва камуністычных, паколькі П.Сяўрук слушна бачыў у іх пагрозу для легальных беларускіх асветніцкіх арганізацыяў.

Сацыёлаг крытычна паставіцца да яго канцэпцыі народу і роднай мовы, аднак яна вартая ўвагі як сведчанне перадумоваў, на якіх пачаткова будавалася ідэя беларускай нацыянальнай свядомасці. Я не з'яўляюся літаратурным крытыкам і мне цяжка ацаніць літаратурныя вартасці паэзіі і прозы П.Сяўрука. У яго літаратурных творах таксама знаходзім выражэнне ідэйных перакананняў аўтара. Асабліва звяртаю ўвагу чытачоў на фрагменты дзённіка, які ён вёў больш-менш сістэматычна ад часу прыняцця рашэння аб вяртанні сям'і з ваколіц Тамбова, куды яна была накіравана ў час бежанства. Не ведаю іншага такога дзённіка, які так выразна апісваў бы цяжкасці і небяспекі вяртання ў роднае мястэчка з глыбіні Расеі. Не менш годныя ўвагі занатоўкі пазнейшых гадоў, у якіх аўтар апісвае клопаты штодзённага жыцця беларускага дзеяча, які стараецца цвяроза глядзець на сваё атачэнне, захаваць незалежнасць думкі і не быць уцягнутым у палітычнае жыццё, рэалізаваць ідэю беларускай асветы, беларускай нацыянальнай ідэі.

Петр Сяўрук памёр маладым, на што, няма сумневу, паўплывалі цяжкасці ваенных вандровак, а таксама галеча разбуранага вайной мястэчка. Ён заслугоўвае сёння памяці як адзін з пачынальнікаў сучаснай беларускай ідэі нацыянальнай незалежнасці. Я перакананы, што ніводная з яго думак не страціла актуальнасці і сёння.

Ежы Тамашэўскі, прафесар
(Uniwersytet Warszawski)

Пётр Сяўрук і сучаснасць

Чалавек фармату Пётра Сяўрука — гэта рэдкасць у гісторыі беларускага руху. Праўда, шмат хто з выдатных прадстаўнікоў беларускага народу зрабіў значна больш за Сяўрука, але ніхто з іх не атрымаў ад лёсу так мала часу на выкананне свае жыццёвай місіі. Пётр Сяўрук пражыў усяго 24 гады. У такім узросце ў нармальны час большасць толькі пачынала адчуваць патрэбу далучэння да грамадскай ці палітычнай дзейнасці.

Пятру Сяўруку давялося жыць у пераломным моманце гісторыі, у час падзення Расейскай імперыі і нараджэння палітычных патрабаванняў народа, эліты якога зусім нядаўна марылі толькі аб тым, каб "людзьмі звацца". Дзяцінства і маладосць прайшла ў час бурлівых падзеяў у Расеі, дзе апынуўся ён разам з паўтарамільённай масай бежанцаў з заходняй Беларусі. На багатым Паволжы быў сведкам голаду і пераўтварэння квітнеючай правінцыі ў зону смерці.

Пасля вяртання на Гарадзеншчыну ў 1921 годзе стаў грамадзянінам Польшчы, новаўтворанай дзяржавы, якая абрала рашучы курс на асіміляцыю беларусаў. Сяўрук хутка асабіста адчуў, што значыць чужая ўлада. Некалькі разоў ён быў арыштаваны, сядзеў у турме. А ўсё па той прычыне, што хацеў ён, пражываючы на сваей зямлі, заставацца беларусам. Публіцыстычная творчасць і грамадская актыўнасць ставілі яго ў шэрагі людзей, небяспечных для польскай дзяржавы. Асабліва ж дзейнасць на карысць асветы на роднай мове ў структурах Таварыства беларускай школы лічылася тады адной з праяваў антыдзяржаўнай актыўнасці. Ахвярная грамадская праца, пераслед і арышты падарвалі здароўе Сяўрука. Ён памёр ад сухотаў — хваробы, якая была адным са спадарожнікаў апошніх хвілін жыцця многіх беларускіх дзеячоў у Польшчы міжваеннага перыяду.

Інтэлектуальную спадчыну Пятра Сяўрука, якая прапаноўваецца чытачу ў гэтым зборніку, можна акрэсліць агромністай, з увагі на кароткі час, дадзены яму лёсам. Пісаў ён вершы і празаічныя творы, філасофскія разважанні і публіцыстычныя каментары пра актуальную сітуацыю беларусаў у польскай дзяржаве. Асабліва вялікае ўражанне выклікае публіцыстыка Сяўрука, а менавіта трапнасць палітычнага аналізу інтэлектуальнага стану беларускіх элітаў і ўсяго насельніцтва.

Сяўрук слушна заўважыў, што не толькі польскі паліцыянт ці ўраднік прагнулі знішчэння беларускага руху, але таксама актыўна руйнавала яго камуністычная агентура, якая, уваходзячы ў структуры

беларускіх асветніцкіх і культурных арганізацыяў, паслабляла іх знутры і давала нагоду палякам да дэлегалізацыі і арыштаў адданых беларускай справе актывістаў. Камуністы часам адкрыта падтрымлівалі беларускі нацыянальны рух, але толькі таму, каб чыста інструментальна пакарыстацца ім для сваіх мэтаў. Меў рацыю малады назіральнік палітычнага жыцця, што пасланцы Камінтэрна былі гэтаксама небяспечныя для беларускага руху, як польскія дзяржаўныя службы. Адны і другія імкнуліся да яго знішчэння.

Некаторыя заўвагі Пётра Сяўрука наконт беларускіх элітаў і беларусаў у цэлым, напісаныя ў сярэдзіне дваццатых гадоў, актуальныя па сённяшні дзень. Хаця свет вакол змяніўся, выраслі новыя пакаленні, веды і досьвед дазваляюць больш аб'ектыўна глянуць на мінулае і сучаснасць, беларусы са сваімі элітамі як бы застылі у пачатку XX стагоддзя. Правадыры беларускага руху, пісаў Сяўрук, вядуць за сабой не еўрапейскі народ, а масу, якая можа толькі стаць народам. Што змянілася ад таго часу? Пісаў ён таксама пра запазычанасць ідэяў — адныя бралі іх з усходу, другія з захаду, чужая дэмагогія замяшчала свае нацыянальныя мэты. Усё гэта засталося так, як было восемдзесят гадоў таму. А эліты — пісаў Сяўрук — у асноўным займаліся сабою, заблыталіся ў сварках, высвятленні асабістых крыўдаў і прапагандаванні поспехаў, якія ў сапраўднасці служылі чужым інтарэсам. Правадыры ніколі ў нас не будавалі нацыянальнай супольнасці, не вызначалі стратэгічных мэтаў, не стварылі, узорам суседніх народаў, нацыянальнай міфалогіі, сваімі паводзінамі вялі да разгубленасці грамадства і замацоўвання ўсялякіх праяваў тутэйшасці.

Прачытаўшы радкі, напісаныя Сяўруком, і падумаўшы пра сучасны стан беларускага нацыянальнага жыцця ў Беларусі і на Беласточчыне, само сабой паўстае пытанне: што ў нас змяніліся за апошнія восемдзесят гадоў?

Яўген Мірановіч, прафесар
(Uniwersytet w Białymstoku)

Жыццёвая дарога Пятра Сяўрука і яго час

"Небыцьця не існуе", — напісаў у сваім нататніку скідзельскі паэт і грамадскі дзеяч Пётр Сяўрук. За вокнамі стаяў гарачы жнівень 1929 года. Месяц таму Пятру споўнілася ўсяго дваццаць чатыры і мала хто ў яго ўзросце стаў бы разважаць падобнымі філасофскімі катэгорыямі. Але Пётр ведаў, што жыць яму засталося зусім няшмат. Сухоты дзень за днём рабілі яго ўсё слабейшым і слабейшым. Выглядала на тое, што яму давядзецца хадзіць па гэтай зямлі нават менш, чым так любімаму ім Максіму Багдановічу, рэфераты аб жыцці якога чытаў ён сябрам гурткоў Таварыства беларускай школы ў ваколіцах Горадні[1].

Але ўбачанае і перажытае не памераеш гадамі. А Пётра бачыў слупы дыму над родным Скідзелем, калі разам са сваімі роднымі і іншымі скідзельцамі ехаў на ўсход, туды, куды летам 1915-га адступала ўся царская Расея, каб больш ніколі не вярнуцца назад. Бачыў ахопленыя грамадзянскай вайной цэнтральныя губерні былой імперыі, калі людзі паміралі ад голаду і сцюжы на вуліцах вялікага горада і днямі ніхто нават не думаў прыбіраць іх трупы. Бачыў натоўпы непісьменных сялян з-пад Скідзеля, якія збіраліся на беларускія спектаклі, што ладзіў ён разам з сябрамі і за якія неаднойчы быў біты ў пастарунку паліцыяй. Як на адно жыццё, то нават зашмат. Ды і зрабіць паспеў нямала. Скідзельскі гурток ТБШ, нягледзячы на рэпрэсіі паліцыі, працуе, не адракаюцца ад справы і хлопцы з навакольных вёсак. Спяваюць нашыя песні, не кранаюцца гарэлкі, захапляюцца вучэннем Льва Мікалаевіча Талстога... Ды і любімая сястрычка Марыя абяцала пакуль перахаваць усё напісанае ім. Можа, калі-небудзь што і прыдасца людзям.

Менавіта таму са спакойным сэрцам загарнуў ён старонкі свайго нататніка. Больш ніякіх запісаў П.Сяўрук не вёў. Менш чым праз два месяцы яго не стала. Але ўсё ж такі Пётр Сяўрук меў рацыю. Усё зробленае і напісанае ім не перайшло ў няпамяць. Сёння яно вяртаецца да нас.

Нарадзіўся Пётр Сяўрук 12 ліпеня 1905 года ў сям'і Якуба і Юлі (дзявочае Стальбоўская) Сяўрукоў, хата якіх і сёння стаіць непадалёку ад цэнтра Скідзеля. Якуб і Юля мелі многа дзяцей, самы малодшы, Міхась,

---

[1] У часы дзейнасці Пятра Сяўрука ў асяроддзі нацыянальна свядомых беларусаў было прынята ўжываць адну са старадаўніх формаў назвы горада Гродна — Горадня (адпаведна і ўжывалася назва Гарадзеншчына).

нарадзіўся ажно ў 1925 годзе[2]. Дзядзька Пятра Рыгор Стальбоўскі стаў праваслаўным святаром, быў настаяцелем царквы ў мястэчку Заблудава непадалёку ад Беластоку (цяпер Падляшскае ваяводства Рэспублікі Польшча). У канцы лета 1915 года сям'я Сяўрукоў, як і большасць скідзельцаў-беларусаў, падалася ў бежанства. У 1916 годзе Сяўрукі яшчэ знаходзіліся ў Магілёве, але хутка апынуліся ў глыбіні Расеі ў горадзе Ліпецку.

Горад Ліпецк Тамбоўскай губерні гасцінна прыняў не толькі сям'ю Сяўрукоў, але і многіх бежанцаў з усёй Заходняй Беларусі. Сярод іншых аказаўся тут разам з бацькамі і маленькі Леанід Галяк, адзін з будучых лідэраў беларускай паваеннай эміграцыі. Праз многа гадоў Л.Галяк успамінаў пра гэты горад наступнае: "Горад Ліпецк быў заложаны царом Пятром I, і гэтаму цару быў пастаўлены помнік — трохкутны абэліск абшыты зялезнымі лістамі. Была таксама ў горадзе Дубовая Рошча, пасаджаная на ягоны загад. Горад стаяў на правым беразе ракі Варонеж, але не на самым беразе, бо паміж апошнімі дамамі гораду і ракою былі нізкія лугі з паўтара кілямэтра. У паводку Варонеж разьліваўся так, што заліваў ня толькі тыя лугі, але ўсю ніжнюю частку гораду. Цэнтр гораду быў выбрукаваны, але дзе мы жылі, хоць гэта было блізка ад рынку, ужо ніякага бруку ня было. Дзе быў брук, дык летам быў ён пакрыты белым пылам, бо брук быў з вапеннага каменьня, а пасьля дажджу брук быў пакрыты клейкай мазяй. Клімат быў востра кантынэнтальны. Летам сухая гарачыня без дажджоў, — зімою моцныя маразы без адлігаў. Калі зімой пачыналася сьнежная завіруха, дык горад на пару дзён зусім замірaў. Большасьць горада стаяла на схіле да Варонежу ці на далейшай раўніне і ў гэтых вышэйшых частках гораду вада была вельмі глыбока і да таго пад тоўстым слоем вапнякоў. Дзеля гэтага кожных некалькі кварталаў, на скрыжаваньні, стаяў будыначак, куды была даведзеная вада і там выдавалі гэтую ваду ў абмен за закупленыя ў гарадзкой управе цэтлікі."[3]

Менавіта такім убачыў Ліпецк і Пётр Сяўрук, для якога гэты горад стаў другой Радзімай. Дарэчы сказаць, не выключана, што і Галяк з Сеўруком прынамсі бачылі адзін аднаго, бо Л.Галяк у сваіх успамінах згадвае бежанку з Гарадзеншчыны Юлю, магчыма, маці П.Сяўрука, якая навучыла яго маці плесці шчоткі і гэтым зарабляць на жыццё.

---

[2] Дзяцей Якуба і Юлі Сяўрукоў звалі: Пётра (1905 г.н.), Вольга (1906 г.н.), Марыя (1908 г.н.), Надзя (1910 г.н.), Соня (1912 г.н.), Галя (1913 г.н.), Іван (каля 1915 г.н.), Валодзя (1916 г.н.), Міша (1925 г.н.). Міша, як і Пётра, таксама меў талент, працаваў настаўнікам, захапляўся журналістыкай і краязнаўствам. Цікавіўся спадчынай свайго брата. Сёння ніхто з братоў і сясцёр Пятра Сяўрука ўжо не жыве. Апошнія, Надзя і Валодзя, памерлі ў 2005 годзе.

[3] Галяк Леанід. Успаміны. http://knihi.com/memuary/halak.html#1-03

У Ліпецку пачалося фарміраванне асобы Пятра. Ён наведваў школу, дзясяткамі чытаў кнігі, захапіўся вучэннем аб непраціўленні злу, заснавальнікам якога лічыцца Л.М.Талстой. Ужо ў Ліпецку настаўнікі заўважылі талент вучня з далёкай Гарадзеншчыны. Як успамінала сястра Пятра Марыя, яму, пятнаццацігадоваму хлопцу, давяралі нават навучанне дзяцей у малодшых класах. Менавіта тут руская мова стала Пятру другой роднай. Адначасова Пётр цяжка працаваў, дапамагаючы сваім бацькам неяк пракарміць сваіх маленькіх братоў і сясцёр. У пачатку 1920-х гадоў рабіць гэта стала надзвычай цяжка — рухаўся голад. Марыя Якаўлеўна ўспамінала: "Магчыма, назад і не паехалі б, бо дзеці пачалі вучыцца, але пачаўся страшны голад, збіралі проса ў полі, пяклі ляпёшкі і іх елі. Бацька служыў ахоўнікам на станцыі, на сям'ю прыносіў палову вядра нейкага страшнага чорнага супу з мёрзлай бульбы, яго і елі. На вуліцы ў Ліпецку падалі ад голаду і паміралі людзі. На ўсё жыццё запомніла вельмі па-інтэлігенцку апранутага чалавека, які стаяў і еў гэтую чорную пахлёбку."

Восенню 1921 года сям'я Сяўрукоў вярнулася з Расеі ў знішчаны ваенным ліхалеццем Скідзель. Шаснаццацігадовы Пётр ужо патроху пачынаў пісаць, неадольна імкнуўся да кнігі і ведаў, але да ўсеагульнай беднасці, нават галечы, дадаваліся і іншыя перашкоды. Паводле рашэнняў падпісанага вясной 1921 года Рыжскага міру Заходняя Беларусь стала часткай польскай дзяржавы. Польская адміністрацыя актыўна займалася апалячваннем мясцовага насельніцтва, змагалася з беларускай школай і друкаваным беларускім словам. У Скідзелі Пятра чакала толькі цяжкая сялянская праца, поўная адсутнасць надзеі рэалізаваць свае здольнасці і частыя візіты п'яных польскіх паліцэйскіх, якім прыйшоўся зусім не даспадобы гэты занадта таленавіты юнак. Жыць, вучыцца і працаваць у такіх умовах было вельмі няпроста, але П.Сяўрук настойліва збіраў кнігі, пісаў вершы (няхай сабе пакуль і ў "стол") і шукаў кантактаў з старэйшымі беларускімі пісьменнікамі і дзеячамі. Увесну 1924 года П.Сяўрук паслаў свае творы патрыярху беларускага руху, аднаму з выдаўцоў "Нашай Нівы" А.Луцкевічу і хутка атрымаў адказ. А. Луцкевіч пакрытыкаваў артыкулы Пятра, аднак параіў пісаць далей і выслаў яму літаратурна-філасофскі зборнік "Заходняя Беларусь". Заахвочаны падтрымкай, Пётр імкнуўся ўдасканаліць сваё пісьменніцкае майстэрства, і гэтая праца хутка дала свой плён — у снежні 1924 года віленскі часопіс "Студэнцкая Думка" надрукаваў яго апавяданне "Гісторыя аднае сьмерці".

Летам 1926 года, у час найвышэйшага ўздыму беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на заходнебеларускіх землях, П. Сяўрук узначаліў скідзельскі гурток Таварыства Беларускай Школы, дэмакра-

тычнай культурна-асветніцкай арганізацыі, што змагалася за правы беларускага народа ў межах польскай дзяржавы. Першай справай, якую зрабіў Пётр, было заснаванне ў Скідзелі беларускай бібліятэкі, пры дапамозе якой жыхары мястэчка ўпершыню змаглі пазнаёміцца з творамі беларускіх аўтараў, кнігамі па гісторыі і культуры Беларусі. "Загадчыкам бібліятэкі пры Таварыстве зьяўляецца Пётра Сяўрук, пасьледавальнік Талстога, нічога супольнага ня маючы з палітыкаю, у пераканаьнях якога ёсьць нялюбасьць да ўсялякай палітычнай барацьбы, але які ёсьць прыхільнікам беларускага культурнага адраджэньня", — пісала пра П.Сяўрука газета "Беларуская Ніва". Бібліятэка прыцягвала да сябе моладзь не толькі з самога Скідзеля, і хутка ў ваколіцах мястэчка было ўжо каля дзесяці гурткоў ТБШ. П.Сяўрук збіраў подпісы на заснаванне беларускай школы, аднак польская адміністрацыя арганізаваць яе так і не дазволіла. У верасні 1927 года намеснік старшыні ТБШ Іван Савіцкі пісаў з Вільні ў Скідзель: "Ня трэба толькі адчаівацца. У гэтым вытрывалым змаганьні за родную школу выкоўваецца загартаваная воля нашага народу. Працуйце грамадзянін, і другіх заахвочвайце. Ні адзін высілак не прападзе дарма!" І П. Сяўрук працаваў. Арыштоўваўся паліцыяй, месяц-два праводзіў у турме і, выйшаўшы на волю, ізноў вешаў на сцяну сваёй хаты шыльду Таварыства Беларускай Школы, збіраў сяброў і пачынаў беларускія вечарыны, спектаклі, чытаў лекцыі. Літаральна за некалькі месяцаў гэты хворы на сухоты юнак стаў цэнтрам беларускага жыццця Скідзеля і ваколіцаў. Паседжанні Гуртка традыцыйна заканчвалі спевам беларускага рэвалюцыйнага гімна "Ад веку мы спалі..." Родныя ўспамінаюць, што малады і прыгожы Пётр быў даспадобы многім дзяўчатам, але прынцыпова не звяртаў на іх увагі, нават падчас танцаў з гармонікам сядзеў за сталом і пісаў у свае сшыткі.

У красавіку 1927 года П.Сяўрук узначаліў Гарадзенскую акруговую ўправу ТБШ, што было безумоўным прызнаннем яго ўзрастаючага аўтарытэту. З гэтага часу П.Сяўрук часцей пачаў наведвацца ў Гародню. У маі 1927 года ён выступаў у Гародні з рэфератам, прысвечаным жыццю і дзейнасці Максіма Багдановіча, што было звязана з дзесятымі ўгодкамі смерці паэта. "Багданович замечательный поэт и человек с великой думой и ясною мыслью. В его творчестве уясняется много истин, которыя особенно понятны и дороги мне, поэтому я исполнил обычай и почтил имя того, кто этого заслуживает", — запісаў у сваім дзённіку П.Сяўрук.

Пазней, ужо зняўшы з сябе абавязкі старшыні ўправы, П.Сяўрук удзельнічаў у Гарадзенскім павятовым з'ездзе ТБШ 12 ліпеня 1928 года, дзе быў абраны ў склад рэвізійнай камісіі Гарадзенскага акруговага

праўлення ТБШ. Падчас Гарадзенскага акруговага з'езду ТБШ 14 кастрычніка 1928 года П.Сяўрук выконваў абавязкі яго сакратара.

Пётр Сяўрук, нягледзячы на свой вельмі малады ўзрост, карыстаўся бясспрэчнай пашанай сваіх старэйшых сяброў. "Як я змог пераканацца, Вы зьяўляецеся сапраўдным старшынёй, на якім усё апіраецца", — пісаў П. Сяўруку вядомы заходнебеларускі вучоны і палітычны дзеяч Ігнат Дварчанін. Тым не менш 1927 і 1928 гады сталі для П. Сяўрука часам вялікіх расчараванняў. Далёкі ад палітыкі, Пётр не хацеў уцягвання Таварыства Беларускай Школы ў палітычную барацьбу, ведаючы, што для польскай адміністрацыі гэта будзе выдатнай нагодай знішчыць гэтую культурніцкую арганізацыю. Больш таго, ён пакрысе пачынаў разумець, што кіруемая з усходу палітыка заходнебеларускіх леварадыкальных арганізацый вядзе не столькі да ўзняцця агульнага ўзроўню палітычнай і нацыянальнай свядомасці насельніцтва, колькі да імкнення ўзбунтаваць народ з мэтай узвесці нераадольны бар'ер паміж беларусамі і ўладамі Другой Рэчы Паспалітай. У канцы 1928 года ў лісце да аднаго свайго сябра П.Сяўрук пісаў: "Вы думаете, что причиной моих преследований является моё участие в белорусском движении. Это фактически так, но дело в том, что белорусское движение преследуемо постолько, поскольку оно фактически связано с коммунизмом. Я очень хорошо знаю, что все слова о том, что белорусское движение напрасно смешивают с коммунизмом — является попросту фальшью. Я не вижу того, чтобы власти в чём-либо ошибались. Чисто — национальное белорусское движение у нас настолько слабо, что власти могут его бояться не менее, чем пацифистского и всякого иного. И в сущности разрешение белорусского вопроса у нас трудно не благодаря угнетению со стороны правительства, но, я думаю, ещё главным образом благодаря коммунистической деятельности. Как правительство, так и коммунисты ведут по отношению к национальному белорусскому вопросу конспирационную политику и всякий старается использовать это движение для своих целей, постольку как те, так и другие препятствуют национальным стремлениям."

Нельга сказаць, што П.Сяўрук сваімі слабымі сіламі ніяк не спрабаваў паўплываць на сітуацыю. Так, летам 1927 года ён даслаў у рэдакцыю газеты "Беларускі Дзень" ліст, дзе раскрытыкаваў няспынныя спрэчкі беларускіх газет і прадстаўнікоў розных палітычных плыняў. П.Сяўрук са скрухай пісаў, што замест таго, каб разам змагацца за развіццё нацыянальнай і сацыяльнай свядомасці беларусаў, беларускія палітыкі загразлі ў перманентных сварках паміж сабою і высвятленні асабістых адносінаў. Прычым робяць яны гэта на людзях, аддаючы найбольш месца ў сваіх газетах на паліванне брудам адзін аднаго, а не на беларускую нацыянальную працу. "Дзеячы народныя, як і пэдагогі, павін-

ны ведаць свае межы. Яны могуць біцца, сварыцца і лаяцца, дзе іх ня бачаць, але ні ў якім разе не павінны рабіць гэтага перад масамі, перад тымі, каго яны ўзгадоўваюць і яшчэ больш не павінны з гэтага рабіць сістэмы ўзгадаваньня," — пісаў П.Сяўрук, падкрэсліваючы, што такое становішча дэмаралізуе беларускіх актывістаў на правінцыі, уносіць бязладдзе і апатыю, разбівае беларускі нацыянальна-вызваленчы рух.

Надрукаваўшы свой ліст, П.Сяўрук трапіў у вельмі няпростую сітуацыю. "Беларускі Дзень" карыстаўся ў Заходняй Беларусі дрэннай славай выдання, што знаходзіцца на паслугах у польскай адміністрацыі, і палемічны ліст П.Сяўрука быў расцэнены левай плынню беларускага руху фактычна як здрада.

Тлумачэнняў ад Пятра запатрабаваў Ігнат Дварчанін, які, пасля арышта паслоў Грамады, цягнуў на сябе большую частку працы ў ТБШ і беларускай выдавецкай справе. Праўда, надзвычай інтэлігентны, разумны і стрыманы ў ацэнках, І.Дварчанін хутка аднавіў перапіску з Пятром.

Як паказала гісторыя, рамантык-талстовец са Скідзеля прадбачыў разгортванне падзеяў лепш, чым тыя людзі, якіх у канцы дваццатых з поўным правам можна было назваць правадырамі беларускага руху.

Вясной 1929 года, пераканаўшыся, што беларускі рух канчаткова зышоў на дарогу дыктаваных з усходу лозунгаў, П. Сяўрук звярнуўся да лідэраў беларускага пасольскага клубу "Змаганне" (фактычным лідэрам "Змагання" быў добра знаёмы Пятру Ігнат Дварчанін, які да таго часу ўжо амаль без пярэчанняў праводзіў у жыццё лінію ЦК КПЗБ) з лістом, у якім выказаў сваё бачанне тагачаснай сітуацыі. Ліст Пятра Сяўрука не быў надрукаваны, аднак гэта не прыніжае гістарычнага значэння звароту да беларускіх правадыроў. Ліст, па-сутнасці, падвёў мяжу пад эпохай масавага беларускага нацыянальна-вызваленчага руху першай паловы XX ст., сімваламі якога сталі беларусізацыя ў Савецкай Беларусі і Беларуская Сялянска-Рабочая Грамада ў Беларусі Заходняй. У 1930-х беларускія арганізацыі ў Польшчы былі амаль раздушаныя, БССР захлынуў крывавы патоп сталіншчыны, у якім, дарэчы, загінулі і правадыры "Змагання". Так ці інакш, але Пётр Сяўрук аказаўся прарокам наступных некалькіх дзесяцігоддзяў беларускай гісторыі. Не зусім прыгожа, часта заблытана і незразумела гэты хворы на сухоты юнак падкрэсліў адну вельмі важную асаблівасць беларускага руху — яго правадыры вядуць за сабой не сфарміраваны еўрапейскі народ, а масу, якой толькі наканавана стаць або не стаць народам. Беларус найперш павінен зразумець самога сябе, вывучыць сваю гісторыю, мову, падняць сваю свядомасць да нармальнага ўзроўню і менавіта гэта павінна быць мэтай правадыроў руху. Адсутнасць выразна акрэсленых мэтаў, цвёрдых уласных палітычных ідэяў, выкарыстанне нацыянальнай тэма-

тыкі толькі з дэмагагічнымі мэтамі, бясконцыя запазычанні ўсходніх ды заходніх ідэалогіяў — прычыны паражэння беларускага адраджэння пачатку XX ст.

Частыя турэмныя заключэнні і цяжкая праца выклікалі сухоты. Пётра доўга змагаўся з хваробай, да апошняга моманту працягваў пісаць. Марыя Сяўрук купіла любімаму брату шкляны інгалятар, каб хоць крыху зменшыць яго пакуты, але той неўзабаве зламаўся. У кастрычніку 1929 года Пятра не стала. Гора сваякоў пераплялося з грамадскім горам. Па ўспамінах нешматлікіх цяпер сведкаў, пахаванне П. Сяўрука выліlася ў самую шматлюдную за ўсю гісторыю Скідзеля дэманстрацыю. Мясцовы бацюшка, які ў свой час быў удзельнікам вайсковых фармаванняў Станіслава Булак-Балаховіча і па-ранейшаму заставаўся прыхільнікам генерала (а апошні ніколі не хаваў свайго варожага стаўлення да камуністычнага руху), крычаў, каб паліцыя ахоўвала яго, бо на пахаванне у Скідзелі сабралася агромністая колькасць "камуністаў", а сястра паэта ў дзень яго смерці вырвала з насценнага беларускага календара лісток, які дасюль захаваўся сярод яго папер...

Ніжэй чытачу прапануюцца ўрыўкі з дзённіка Пятра Сяўрука, якія ніяк не прэтэндуюць на поўнае адлюстраванне асобы іх аўтара. Хутчэй наадварот. У найбольшай ступені нас цікавіць суб'ектыўная ацэнка П. Сяўруком сітуацыі, якая склалася пад канец 1920-х г. у заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым руху. Думаем, яна будзе цікавай многім даследчыкам беларускай гісторыі, паколькі сучаснік бурлівых падзеяў Пётр Сяўрук змог зразумець і асэнсаваць многае з таго, што пачынае разумецца і асэнсоўвацца толькі зараз, больш чым праз восемдзесят гадоў.

Андрэй Вашкевіч,
Сяргей Токць

Беларускі нацыянальны рух на Скідзельшчыне

Жыццёвы лёс і творчасць Пятра Сяўрука непарыўна звязаныя з яго родным Скідзелем, звычайным заходнебеларускім мястэчкам, да ліку карэнных жыхароў якога належалі бацькі Пятра. Паводле дадзеных, якія адшукаў гарадзенскі гісторык Янка Лялевіч, 9 сакавіка 1498 года гаспадарскі лоўчы Леўка Вейкневіч прасіў вялікага князя Аляксандра "дву пустовщин в Городенском повете подле Скидла на имя Покладовщины а Пашковщины". Гэта, бадай, першая вядомая нам сёння згадка аб мястэчку, што захавалася ў архіўных дакументах. У 1501 года гарадзенскі староста Аляксандр Юр'евіч атрымаў прывілей на службы ў Скідзельскай воласці на імя "Гануса Шафроновича, а Олекса, а брата его Карпа». З тых часоў і да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай Скідзель заставаўся вялікакняскім мястэчкам і належаў да Гарадзенскай каралеўскай эканоміі. Пасля таго, як у 1795 годзе перастала існаваць Рэч Паспалітая, а Беларусь стала часткай Расейскай Імперыі, расейская імператрыца Кацярына II падаравала Скідзель ва ўласнасць княскаму роду Чацвярцінскіх. Гэта стала прычынай шматгадовага змагання скідзельцаў са сваімі новымі ўладальнікамі, паколькі жыхары мястэчка лічылі сябе мяшчанамі, асабіста вольнымі людзьмі, і адмаўляліся хадзіць на паншчыну. Паводле рэвізскага перапісу 1816 года ў Скідзелі налічвалася 45 гаспадароў, сярод якіх — Андрэй, Іван і Міхал Сяўрукі[4]. У інвентары 1845 года ўзгадваюцца сем'і Давыда, Міхала і Івана Сяўрукоў, а таксама кутнік (не меў сваёй хаты) Ануфры Сяўрук. У 1861 годзе жыхары мястэчка ў адпаведнасці з палажэннямі сялянскай рэформы былі вызваленыя ад прыгоннай залежнасці і атрымалі асабістую свабоду. Але так званую "Ўстаўную грамату", якая рэгулявала іх адносіны з былымі ўладальнікамі, яны падпісваць адмовіліся і патрабавалі, каб Чацвярцінскія вярнулі ім раней адабраныя зямельныя надзелы. Сярод скідзельскіх гаспадароў таго часу бачым Давыда Іванава, Восіпа Міхайлава, Міхала Іванава і Давыда Міхайлава Сяўрукоў[5]. Напэўна, якраз у сям'і Восіпа Міхайлава Сяўрука нарадзіўся бацька Пятра Сяўрука Якуб. Яго маці звалі Ганнай. Яна памерла ў вельмі сталым узросце пад час сусветнай вайны ў бежанстве ў Ліпецку. Сям'ю Якуба Сяўрука клікалі ў Скідзелі Бабрамі ці Бабровымі (паводле местачковага падання хтосьці з Сяўрукоў злавіў неяк бабра).

---

[4] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (далей — НГАБ у Гродне), фонд 24, вопіс 7, справа 34.

[5] НГАБ у Гродне, ф. 10, воп. 17, спр. 599, аркуш 41-48.

У 1875 годзе ў Гарадзенскі міравы з'езд паступіла прашэнне жыхароў Скідзеля Андрэя Ігнатавіча Покаша, Сцяпана Іосіфавіча Труся і Давыда Іванавіча Сяўрука. У гэтым прашэнні яны патрабавалі вярнуць скідзельцам землі, якія адабралі ад іх князі Чацвярцінскія. Пры гэтым аўтары скаргі апелявалі да старажытных прывілеяў вялікіх князёў літоўскіх і каралёў Рэчы Паспалітай[6]. Але задаволіць іх прашэнне суд адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што такая справа не належыць да яго паўнамоцтваў.

У 1900 годзе ў Скідзелі налічвалася 3465 жыхароў, у большасці габрэяў — 2866 чалавек. Хрысціян, пераважна праваслаўных беларусаў, было тады ў Скідзелі 589. Забудову мястэчка складалі 71 каменны дом і 411 драўляных[7]. Асновай мясцовай прамысловасці з'яўляліся невялікія гарбарныя прадпрыемствы, заснаваныя энергічнымі габрэйскімі купцамі. Местачковыя беларусы належалі да сялянскага стану, хаця самыя лічылі сябе нашчадкамі старадаўніх мяшчанаў і вельмі гэтым ганарыліся. Яны займаліся сялянскай земляробчай працай на сваіх сціплых зямельных надзелах, а таксама самымі рознымі дапаможнымі заробкамі.

Першая сусветная вайна кардынальна змяніла звыклую хаду жыцця скідзельцаў. Летам 1915 года большасць беларускага насельніцтва мястэчка і ваколічных вёсак накіравалася ў бежанства на ўсход. Лёс раскідаў іх па розных губернях імперыі, ад паўднёвага Крыму да Сібіры. Толькі ў 1918 годзе бежанцы пачалі паступова вяртацца дадому. Тады ж на Скідзельшчыне ва ўмовах нямецкай акупацыі зараджаецца беларускі нацыянальны рух. У Скідзелі быў утвораны валасны камітэт, паўстала беларуская школка. Калі ў канцы 1918 годзе нямецкія войскі пакінулі беларускія землі, дык Гарадзеншчына была занятая вайсковымі аддзеламі нядаўна абвешчанай польскай дзяржавы. Новая ўлада варожа паставілася да беларускага руху. Напрыклад, паводле карэспандэнцыі газеты "Беларуская думка", быў арыштаваны і ў поўным складзе вывезены ў Кракаў Скідзельскі валасны камітэт[8]. На жаль, нам невядома, хто ўваходзіў у склад гэтага камітэта, і што хацелі і паспелі зрабіць гэтыя людзі, што сталася пазней з імі?

Пасля савецка-польскай вайны 1920—1921 гадах Гарадзеншчына ўвайшла ў склад польскай дзяржавы. Па дадзеных перапісу насельніцтва 1921 года ў Скідзелі налічвалася 388 будынкаў і 2907 жыхароў (1371 мужчына і 1536 жанчын)[9]. Паводле нацыянальнай прыналеж-

---

[6] НГАБ у Гродне, ф. 48, воп. 1, спр. 7, арк. 33–34 адв.

[7] НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 30, спр. 2278 а, арк. 131.

[8] Беларуская думка. № 17. 04.06.1919.

[9] Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników pierwszego powszechnego spisu ludności z dn. września 1921 r. i innych źródel urzędowych. T.V. Wojewodstwo Białostockie. Warszawa, 1924. s. 30.

насці ў мястэчку пераважалі габрэі (у Скідзелі, як і па ўсёй Беларусі, у той час іх называлі жыдамі, што не мела ніякага абразлівага адцення) — 1996 асобаў, палякаў налічвалася 504 чалавека, беларусаў — 359, расіян — 35, татараў — 11, літоўцаў — 1, русінаў (так у міжваеннай Польшчы афіцыйна называлі ўкраінцаў) — 1. Вынікі перапісу патрабуюць крытычнага разгляду. Беларусы і габрэі нярэдка запісваліся палякамі ці з практычных меркаванняў, ці блыталі нацыянальную прыналежнасць з дзяржаўнай. Такая з'ява ў Заходняй Беларусі была даволі пашыранай. А дзяржаўныя ўлады з палітычных мэтаў імкнуліся завысіць колькасць палякаў на "крэсах", і мясцовыя ўрадоўцы на практыцы дамагаліся рэалізацыі гэтага імкнення. Паводле веравызнання ў Скідзелі пераважалі іўдзеі — 2231, праваслаўных было 464, каталікоў — 122, мусульманаў (да іх належалі мясцовыя татары, якія спрадвеку жылі ў Скідзелі) — 89, евангелістаў — 1.

У Скідзельскай гміне (без уліку Скідзеля) колькасць жыхароў у 1921 годзе складала 5921. Паводле нацыянальнасці пераважалі беларусы — 4465, палякаў было 1395, габрэяў — 21, расіян — 39, русінаў (украінцаў) — 1. Паводле веравызнання структура вясковага насельніцтва гміны выглядала наступным чынам: праваслаўных — 5124, рымакаталікоў — 742, іўдзеяў — 51, евангелістаў — 4.

Матэрыяльныя ўмовы жыцця ў Заходняй Беларусі ў пасляваенныя гады былі вельмі цяжкія. Мясцовыя жыхары, якія вярталіся з Расеі, звычайна знаходзілі спаленыя і разрабаваныя сядзібы, зарослыя пустазеллем палеткі. Камендант скідзельскага пастарунка польскай паліцыі адзначаў у 1921 годзе, што бежанцы "з прычыны адсутнасці сродкаў да жыцця вымушаны жабраваць па ваколічных вёсках, апроч таго многія паміраюць ад знямогі і голаду"[10].

Інфарматар паліцыі з суседняй са Скідзелем вёскі Саволеўка паведамляў, што сярод мясцовых жыхароў "ходзяць чуткі, быццам неўзабаве мае быць вайна, быццам паўстане беларуская рэспубліка"[11]. У кастрычніку 1922 года ў Скідзель прыехаў беларускі нацыянальны дзеяч Сяргей Баранаў, які на тайных сустрэчах з мясцовай моладдзю агітаваў яе (зноў жа, паводле інфармацыі паліцэйскага канфідэнта) уступаць у беларускія партызанскія аддзелы[12]. Тады у Гарадзенскай і Белавежскай пушчах разгарнуўся партызанскі рух, які падтрымліваўся сродкамі і зброяй праз літоўскую мяжу. Нават Пётра Сяўрук, хаця і не прызнаваў гвалтоўных метадаў барацьбы, падабраў дзеля цікавасці

[10] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей –ДАГВ), ф. 17, воп. 1, спр. 3, арк. 8.

[11] Archiwum Państwowe w Białymstoku (далей – APB), Prokurator okręgowego sądu, 86, k. 137.

[12] APB, Prokurator okręgowego sądu, 86, k. 137.

нумар нелегальнага выдання "Беларускі партызан", якія, паводле яго запісаў, былі раскіданыя паўсюдна.

У часе парламенцкіх выбараў 1922 года ў Скідзелі быў створаны мясцовы аддзел Беларускага выбарчага камітэту. У самім мястэчку большасць галасоў выбаршчыкаў атрымаў спіс Польскай сялянскай партыі "Вызваленьне" (*PSL „Wyzwolenie"*) — 245 галасоў, на другім месцы быў Блок нацыянальных меншасцяў, за які агітаваў Беларускі выбарчы камітэт — 183 галасы, на трэцім — камуністы (102 галасы). На гэтым участку большасць выбаршчыкаў складалі местачковыя габрэі. Але, трэба меркаваць, за польскія сялянскія партыі аддалі свае галасы і многія мясцовыя беларусы. Напрыклад, актывістамі выбарчай кампаніі *PSL „Wyzwolenie"* на Скідзельшчыне былі беларусы — аграном Яўген Атаназевіч са Скідзеля і Рыгор Гуліда з Глінянаў[13]. На Скідзельскім вясковым участку, дзе большасць выбаршчыкаў складалі праваслаўныя сяляне-беларусы, за Блок нацыянальных меншасцяў аддалі галасы 615 чалавек, а за пракамуністычны спіс № 5 — 222. Іншыя партыі і блокі набралі ўсе разам на гэтым участку ўсяго 38 галасоў. Такім чынам, беларускія палітыкі атрымалі пераканаўчую перамогу ў вёсках Скідзельскай гміны.

У 1924 годзе ў Скідзелі налічвалася ўжо, паводле дадзеных мясцовай адміністрацыі, каля трох з паловай тысяч жыхароў. Большасць складалі габрэі — 2754 чалавека, беларусаў было 362, палякаў — 124, татараў — 103[14]. Ва ўсёй гміне (апроч насельнікаў самога мястэчка) налічвалася каля 8 тысяч жыхароў, з іх 90 % складалі беларусы. Палітычная сітуацыя, паводле звестак паліцыі, заставалася складанай. 24 чэрвеня 1924 года староста Гарадзенскага павета пісаў павятоваму каменданту паліцыі: "Сепаратысцкі беларускі рух, кіраваны непасрэдна з Вільні праз Гародню (...), узмацніўся і набірае цяпер ужо выразны характар антыдзяржаўнай акцыі (...). Галоўным заданнем кіраўнікоў беларускага руху з'яўляецца апанаванне вёскі і дзеля гэтай мэты ліхаманкава ствараюцца правінцыйныя камітэты спецыяльнымі пасланцамі з Вільні і Гародні. Камітэты такія, як вядома, існуюць ужо ў Гародні, Скідзелі і ў Скідзелькай гміне, Азёрах, Каменцы, Друскеніках"[15]. Гарадзенская паліцыя атрымала летам 1924 года інфармацыю пра тое, што Беларускі цэнтральны нацыянальны камітэт праводзіў 9—10 чэрвеня 1924 года з'езд сваіх правінцыйных дэлегатаў у Вільні, дзе прысутнымі былі нехта Іцак Костка з Сафіяй Крышаловіч са Скідзеля. Цікавасць уяўляе паведамленне тайнага інфарматара паліцыі: "Агульны вывяд,

[13] ДАГВ, ф. 59, воп. 1, спр. 4. арк. 34.
[14] ДАГВ, ф. 24, воп. 1, спр. 10.
[15] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр.41, арк. 239.

праведзены ў кірунку высвятлення сітуацыі, пануючай сярод беларусаў на тэрыторыі Гарадзенскага павета, выказаў, што настрой беларускага насельніцтва, асабліва ў ваколіцах Скідзеля і Азёр у стасунку да польскай дзяржаўнасці ёсць ненавісны. Антыпольская агітацыя праводзіцца да гэтага часу, як відаць, без сістэмы — хатнім спосабам, цяперашняе яе ўзмацненне мае выразны намер выклікаць неспакой і паніжэнне аўтарытэту Дзяржавы (...) З размоваў з людзьмі ўдаецца заўважыць пэўнае расчараванне з прычыны невыступлення Літвы, ад якой чакалі большай ваеннай авантуры. Калі пытаеш пры нагодзе, ці не ўлічваюць пры гэтым матэрыяльныя знішчэнні, якія прыносіць вайна, то адказваюць, што знішчэнні і так непазбежныя з прычыны надмерных падаткаў і ўвогуле з прычыны панавання палякаў"[16].

Галоўнай прычынай адмоўнага стаўлення беларускага насельніцтва да польскай дзяржавы з'яўлялася палітыка нацыянальнай асіміляцыі беларусаў, якую паслядоўна праводзілі ўлады. З бегам часу сітуацыя не змянялася ў лепшы бок, чаму не спрыялі паводзіны дзяржаўных ураднікаў, у большасці сваёй прысланых з этнічнай Польшчы, які не ведалі беларускай мовы і не былі знаёмыя з мясцовымі звычаямі. У газеце "Сялянская праўда" у кастрычніку 1924 года быў надрукаваны ліст невядомага карэспандэнта, які так апісваў узаемадачыненні паміж беларускай моладдзю і польскай паліцыяй ў Скідзелі: "У верасьні 1924 года маладзеж мястэчка Скідаль наладзіла хатнюю вечарынку. Сабралося шмат хлапцоў і дзяўчат, каб патанцаваць. Кожнаму вядома, што ніводная вечарынка не абыйдзецца без незваных гасьцёў. Дык вось з'явіўся паліцыянт — ды яшчэ п'яны.

Пачаў паліцыянт лаяцца і разганяць маладзеж. Зьвярнуліся да паліцыянта і папрасілі, каб ён выйшаў, але ж ён яшчэ болей пачаў крычаць і разганяць. Пасля вялікага шуму ўзялі і выгналі паліцыянта за дзьверы.

Але ж гэтым не скончылася. Праз паўтары гадзіны прыйшлі ўжо два паліцыянты, а затым яшчэ болей і разагналі вечарынку.

Пачалі паліцыянты радзіцца, як бы арыштаваць гэных хлопцаў і дзяўчат.

Аднаго дня хлопцы і дзяўчаты вярталіся з лесу дамоў. Акружылі іх паліцыянты на дарозе і давай шукаць антыпаньствовай літаратуры. Пасля наглага вобыску ўсіх арыштавалі. Арыштаваны: Чабатарэвіч, Сяўрук і інш. Даведаўшыся аб гэтым, бацькі пайшлі на пастарунак да каменданта паліцыі, каб даведацца, за што заарыштавалі. Дык паліцыя яшчэ ўзяла і пабіла нагайкамі бацькоў і прагнала"[17].

---

[16] Тамсама, арк. 289.

[17] Сялянская праўда. № 5. 10.10.1924.

У 1926 года на абшары Скідзельскай гміны пачалі імкліва арганізоўвацца гурткі Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Неўзабаве паўсталі 18 гурткоў — амаль у кожнай вёсцы гміны. У вёсцы Раўкі ў шэрагі Грамады ў поўным складзе перайшоў гурток агульнапольскай сялянскай партыі "Пяст". 23 верасня 1926 года ў Скідзелі быў утвораны таксама гурток Таварыства Беларускай Школы, старшынёй якога абралі Пятра Сяўрука. Сакратаром стаў Іван Дзелянкоўскі, скарбнікам — Іван Цывінскі. Усяго гурток налічваў 36 сябраў[18]. 9 лістапада 1926 года быў заснаваны гурток ТБШ у прынёманскай вёсцы Каўшова. Гэты гурток аб'ядноўваў 65 чалавек, альбо амаль кожнага чацвёртага жыхара вёскі[19]. У той жа самы дзень быў утвораны гурток у вёсцы Раўкі. Усяго ж у канцы 1926 і на пачатку 1927 года ў Скідзельскай гміне паўсталі яшчэ гурткі ТБШ у вёсках Галавачы, Пузавічы, Пяшчанка, Хвайняны і Хваты. Агульная колькасць сябраў таварыства на Скідзельшчыне дасягнула 195 чалавек[20]. Пераважна гэта былі маладыя людзі ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў, але сустракаліся і старэйшыя. Напрыклад, у Галавачах у гурток уступіў Захар Батура, які меў 49 гадоў. Праявай гендэрнай эмансіпацыі вясковага грамадства стала тое, што ў гурткі ўступала і шмат дзяўчат. Напрыклад, у Хвайнянскім гуртку з ліку 26 сябраў дзяўчат было дзевяць. А ў Пузавіцкім гуртку скарбнікам была Марыя Воранава.

Галоўнай мэтай дзейнасці гуртkоў з'яўлялася стварэнне беларускамоўных школаў. Пётр Сяўрук і яго аднадумцы сабралі дзясяткі пісьмовых дэкларацыяў ад жыхароў Скідзельшчыны з жаданнем школьнага навучання сваіх дзяцей на беларускай мове. Але дзяржаўныя ўлады ігнаравалі гэтыя патрабаванні, чым яшчэ болей абвастралі і так напружаную палітычную сітуацыю. Другім кірункам дзейнасці ТБШ стала культурна-асветніцкая праца. Амаль на кожнае свята сябры гурткоў ладзілі ў Скідзелі і ў вёсках гміны тэатральныя імпрэзы. Вось як газета "Праца" распавядала пра пастаноўку п'есы Францішка Аляхновіча "Дрыгва" ў вёсцы Раўкі ў лютым 1927 года: "Перад пачаткам спектакля выступіў хор. Як толькі паднялася заслона, глядзельнікі былі зачараваны выглядам нацыянальных вопратак. Прапяялі: "Не пагаснуць зоркі ў небе". Пяючы гэту песню, кожны з глядзельнікаў адчуваў у сэрцы нейкі жаль і спачуццё да свайго роднага"[21].

У красавіку 1927 года газета "Наша Праўда" надрукавала пастанову гуртка ТБШ у вёсцы Хвайняны Скідзельскай воласці: "Дзеля таго, што мы, беларусы, з-прадаўна засяляем наш Родны Край Беларусь —

[18] ДАГВ, ф. 24, воп. 1, спр. 18, арк. 229.
[19] Тамсама, спр.18.
[20] Тамсама.
[21] Праца. № 3. 12.11.1927.

мы, сучаснае пакаленьне, дасталі ад дзядоў і прадзедаў сваіх, як спадчыну, цэлы акіян гора і мук, якія яны пераносілі ад веку. Але галоўнай прычынай мук гэтых была цемра, што акружала іх з усіх бакоў. І мы, як дзеці іх, унаследавалі ад іх гэту цемру, а разам з ёй і ўсе няшчасці, што сягоньня вісяць над намі. Мы пэўны ў тым, што няшчасці гэтыя будуць вісець над намі да таго часу, пакуль будзе жыць між намі цемра-няпісьменнасць. Дзеля гэтага мы дамагаемся сваёй роднай беларускай школы, у якой бы мы вучыліся на сваёй — беларускай мове. Мы перакананыя ў тым, што толькі з адчыненнем сваіх школаў мы зможам паставіць сваю культуру на роўні з культурамі іншых свабодных народаў, апярэдзіўшых нас у сваім развіцці..."[22]. На сходзе, які прыняў гэтую пастанову, жыхары Хвайнян сабралі 28 злотых на адкрыццё беларускай бібліятэчкі ў сваёй вёсцы.

11 верасня 1927 года скідзельскі гурток ТБШ адсвяткаваў свае ўгодкі. У справаздачы яго старшыні Пятра Сяўрука было, напрыклад, адзначана, што гурток за гэты час адчыніў бібліятэку, якая налічвала 280 кніг. З гэтай лічбы больш 100 кніг гурток купіў, каля 60 было ахвяравана рознымі асобамі і каля 100 пазычана. Сядзіба ТБШ і бібліятэка месціліся якраз у хаце Пятра Сяўрука. Хаты-чытальні былі адчынены ў суседніх вёсках Пяшчанка і Пузавічы. Агульныя выдаткі скідзельскага гуртка за год склалі 260 злотых, а прыбытак — 400 злотых. Складкі сябраў далі ў бюджэт гуртка 145 злотых, а спектаклі — 112. На сходзе, які завяршыўся спевам песні "Не пагаснуць зоркі ў небе", было вырашана назваць скідзельскі гурток іменем Максіма Багдановіча[23]. У вёсцы Стральцы мясцовым гуртком ТБШ была заснавана бібліятэка-чытальня імя Антона Луцкевіча. Гэтая бібліятэка налічвала 70 беларускіх, расейскіх і польскіх кніг. Прычым тры кнігі для яе ахвяраваў сам А.Луцкевіч[24].

У красавіку 1927 года Пётра Сяўрук быў абраны старшынёй Акруговай Рады ТБШ у Гарадзенскім павеце і актыўна ўзяўся за працу. А праца гэтая з'яўлялася вельмі небяспечнай. На мясцовых актывістаў ТБШ паліцэйскія ўлады абрынулі рэпрэсіі, імкнучыся змусіць іх да спынення культурна-асветніцкай дзейнасці. Іх часта арыштоўвалі, збівалі, штрафавалі з розных надуманых прычын. І гэтыя рэпрэсіі паступова давалі свой вынік.

Летам таго ж 1927 года беларускія актывісты дасягнулі значных поспехаў на выбарах у мясцовае самакіраванне. У раду Скідзельскай гміны, як пісала беларуская газета "Наша праўда", 3 жніўня 1927 года былі абраныя 13 "сьвядомых беларусаў" і 1 мясцовы шляхціц, які лічыў

[22] Наша Праўда. № 8. 28.04.1927.
[23] Праца. № 4. 16.11.1927.
[24] Наша Праўда. №7. 22.04.1927.

сябе палякам[25]. Паводле ж інфармацыі каменданта паліцыі, у гмінную раду прайшлі 2 кандыдаты польска-беларускага блоку, 11 беларусаў і 1 кандыдат ад "Блоку гаспадарчай направы"[26]. На першым паседжанні гміннай рады, якое адбылося 9 кастрычніка 1927 года, былі прыняты наступныя пастановы: 1) выдаткаваць з гміннага бюджэту сродкі на ўтварэнне пры гміне беларускай бібліятэкі; 2) разглядаць усе справы наведвальнікаў гміны вусна і пісьмова на беларускай мове; 3) інфармацыйная дошка павінна быць на беларускай мове. Войтам Скідзельскай гміны стаў былы грамадовец Рыгор Сіцко, якога да таго ж абралі ў Гарадзенскі павятовы сеймік.

Паліцэйскі камендант паведаміў у Гародню, што падчас паседжання некаторыя радныя размаўлялі па-расейску і ўжывалі камуністычны зварот "таварыш"[27]. Несумненна, што сярод радных вялікі ўплыў мелі сябры КПЗБ. Пра гэта сведчыць дакумент, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі ў Мінску — справаздача аб дзейнасці Скідзельскага камітэта КПЗБ за 1930 год. Невядомы нам аўтар гэтай справаздачы — напэўна, жыхар Скідзельшчыны — крытыкуе дзейнасць радных гміны: "В начале своей деятельности Рада Гминная стояла целиком под руководством партии и старалась провести в жизнь те лозунги, которыми можно было оперировать в легальных условиях работы; это — о белоруссизации, о снятии податков с малоземельных, о более правильном распределении повинностей в натуре, о субсидировании культурно-просветительных организаций и т. п., в то же время не соглашаясь с теми требованиями, которое выставляло правительство. С течением времени, когда члены Рады Гминной освоились со своим положением и некоторые из них увидали, что могут иметь для себя при гмине, сеймику кой-какой заработок, то ужэнды стали давать им этот заработок, требуя со своей стороны полного для себя послушания их для проведения требований фашистского правительства. С тех пор деятельность рады гминной сошла на линию полной соглашательской работы с фашистским правительством". Прыкладам "соглашательства" аўтар справаздачы палічыў наступнае: "...ухвалено 100 зл. на пропой для себя и солтысов в день встречи президента. Ухвалены и выданы деньги на экскурсию в Познань и Белосток. Раздают народные деньги направо и налево: дают ужэндникам-фашистам в добавок к им большему жалованью крупные подарки в виде праздничных. Покупают польские календари рекламные для деревень, в то время, когда белоруссы и крестьяне не знают не

[25] Наша Праўда. № 38. 13.08.1927.
[26] APB, Urząd wojewódzki w Białymstoku (UWB), 37, k. 153.
[27] APB, UWB, 38, k. 91.

только по польски, но и по белорусски. С ухвалением бюджета обстоит еще хуже, он целиком принимается в редакции фашистского правительства на "Пржиспособіеніе войсковей" и т. п. параграфы бюджета. Если же вздумают под радикальную фразу внести в бюджет субсидию для учащихся в Бел. гимназиях или на дом белорусской культуры, то ухваливают додатковый бюджет". Усе намаганьні камуністычнага падполля паўплываць на радных-згоднікаў не мелі поспеху: "Несмотря на неоднократно даваемые РК Скидельской организации директивы о работе членам-партийцам Рады Гминной, те ни на одном своем собрании не провели, даже не заявили ни одного классового требования — голосовали все время за фашистские предложения. В оправдание своей деятельности выставляли на вид те факты, что ни выдзял повятовы, ни сеймик, ни староства их предложения не утвердит... В конце-концов РК предложил произвести членам-партийцам Рады Гминной критику своей деятельности перед массами, выступая на сходах. До этого времени они все завешены. Было дано для этой кампании два месяца. Срок же прошел, но ни один член Рады Гминной партиец не сделал отчета перед массами. Поэтому все они РК представлены к исключению". Сітуацыя са скідзельскімі раднымі яскрава высветліла супярэчнасці паміж камуністычным падполлем і актыўным элементам беларускага грамадства, які атрымаў хоць бы і мінімальную магчымасць самарэалізацыі ў мясцовым самакіраванні. Функцыянеры КПЗБ і іх кіраўнікі ў савецкай разведцы ў Мінску і Маскве вымагалі ад радных татальнай канфрантацыі з дзяржаўнай адміністрацыяй, вылучэння загадзя непрымальных патрабаванняў. Інакш кажучы, яны павінны былі найперш выконваць ролю палітычных агітатараў, падштурхоўваць масы да ўсебаковага і поўнага байкоту польскай улады. Але радныя ў рэчаіснасці маглі ўсё ж хоць неяк уплываць на вырашэнне пэўных патрэбаў мясцовага грамадства, і тым самым сапраўды адпавядаць чаканням і пажаданням значнай часткі беларускага насельніцтва. Натуральна, што яны мелі і ўласную матэрыяльную зацікаўленасць, паколькі праца ва ўстановах самакіравання някепска аплочвалася. Але ж і функцыянеры КПЗБ аплочваліся сродкамі савецкай разведкі, а іх дзейнасць цалкам будавалася на падаграванні самых радыкальных настрояў гэтага грамадства.

У якасці справаздачы аб сваёй працы скідзельскі раённы камітэт КПЗБ рыхтаваўся выпусціць пракламацыю да мясцовага сялянства з наступным зместам: "Обрисовка теперешнего положения крестьянства в Польше, отношение к нему правительства. Задачи борьбы в самой раде. Перекупка правительством верхушек радикального движения. Ганьба предателям рабоче-крестьянского дела. Все как один на новые выборы, несмотря на репрессии новых радных с незапятнанным преда-

тельством справа широких масс, прошлые выборы наиболее активных. Борьба за повседневные интересы. Уничтожение шарварок. Не давать трудовых денег на фашистские организации и предприятия. Создание фонда помощи безработным, безземельным крестьянам и т. д. Призыв селянства к усиленному контролю деятельности радных, протест против неправильного действия, отзыв из рады. Значение борьбы за самаурады, как один из элементов борьбы с капиталистическим правительством, за нужды широких масс населения и т. д.". Няцяжка заўважыць, што дадзеная пракламацыя не ўтрымлівала лозунгаў нацыянальнага і культурнага зместу. Яе аўтар ці аўтары абгрунтоўвалі неабходнасць выпуску такіх друкаваных пракламацый, пры чым "в большом количестве экземпляров", тым, што "во многих деревнях партия не может действовать открыто и агитацией, не имея там ни партийных, ни симпатиков"[28].

Разам з тым, скідзельскіх радных, якіх кэпэзэбоўцы лічылі ледзь не здраднікамі, мясцовыя дзяржаўныя чыноўнікі разглядалі як "антыдзяржаўнікаў", хоць і адзначалі ў сваіх справаздачах імкненне часткі з іх супрацоўнічаць з урадам. Скідзельскі камендант Чартарыскі ў канцы студзеня 1928 г. адзначыў у тыднёвай справаздачы: „Паказальным ёсць факт, што некалькі беларусаў — актыўных раней гурткоўцаў цяпер шырока прапагандуюць і падзяляюць ідэалогію Пана Маршалка... Лазовік Павел солтыс вёскі Хвайняны — раней вельмі варожа настроены да дзяржавы — цяпер грунтоўна змяніў свае перакананні, ідучы рука ў руку з войтам і пастарункам і парываючы адносіны з ідэалогіяй БСРГ."[29] Камендант таксама выказаў думку ў справаздачы ад 1 сакавіка 1928 года, што "варожае стаўленне" тутэйшых жыхароў да Польшчы, "паглыбленае палітыкай папярэдніх урадаў, якія звычайна ставіліся да гэтых людзей як да пасынкаў, захоўваецца надалей і паварот да лепшага можа адбыцца тады, калі насельніцтва адчуе змены ў такім стаўленні"[30]. Калі 21 лістапада 1929 года на войта Скідзельскай гміны быў выбраны Павел Лапыш, дык камендант паведаміў у Гародню, што той "падазраецца ў антыдзяржаўнай дзейнасці"[31]. Такім чынам, у адрозненне ад раённага камітэта КПЗБ мясцовая паліцыя якраз не бачыла асаблівай эвалюцыі складу гміннай рады ў бок "соглашательства".

У 1928 годзе ўзрастае ўзровень палітызацыі мясцовага насельніцтва на Скідзельшчыне, што было звязана з набліжэннем парла-

---

[28] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь у Мінску, ф. 242-п, воп. 1, спр. 271, арк. 381 (Выказваем падзяку за прадастаўленне гэтага дакумента мінскаму гісторыку Алесю Пашкевічу).

[29] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 171, арк. 2,16.

[30] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 172, арк. 125 адв.

[31] APB, UWB, 50, k. 113.

менцкіх выбараў. Адначасова ўзмацняюцца ўплывы КПЗБ. Аднак гэта, разам з паліцэйскімі рэпрэсіямі, адмоўна адбівалася на культурна-асветніцкай працы, якую праводзілі гурткі ТБШ. Камендант скідзельскага пастарунка паліцыі паведамляў у Горадню ў студзені 1928 года: "У мінулым месяцы дзейнасць таварыства беларускай школы значна аслабла і не пашыралася так інтэнсіўна, як у папярэднім месяцы, калі кожнае свята іх кіраўніцтва арганізоўвала тэатральныя паказы, на якія збіралася шмат гледачоў і ня выключана, што на тых зборках праводзілася антыдзяржаўная праца. Зараз у сувязі з узмоцненым наглядам за дзейнасцю таварыства з боку паліцыі і солтысаў дзейнасць іх заўважна зменшылася"[32]. Несупынны ціск і рэпрэсіі з боку ўладаў прыводзілі да заняпаду многіх гурткоў.

А ў часе правядзення парламенцкіх выбараў 4 сакавіка 1928 года ў Скідзелі адбыліся масавыя хваляванні насельніцтва. Абураныя тым, што ім не даюць магчымасць прагаласаваць (а ўлады штучна стварылі такую сітуацыю, ведаючы, што мясцовыя выбаршчыкі ў большасці аддадуць свой голас за камуністаў і іх прыхільнікаў), сяляне спрабавалі штурмаваць выбарчы ўчастак. Камендант паліцыі толькі занатаваў у справаздачы, што ў будынку "Стшэльца" адбылося хваляванне не паспеўшых прагаласаваць[33]. З Горадні быў прысланы спецыяльны аддзел паліцыі, які без разбору збіваў усіх, хто ім трапляў на вочы. Быў збіты паліцыяй і арыштаваны таксама Пётр Сяўрук.

На двух выбарчых участках у мястэчку Скідзель былі атрыманыя наступныя вынікі галасавання: спіс № 1 "Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам" (*Bezpartyjny Blok Współpracy z Rządem*) — 812, № 2 "Польская сацыялістычная партыя" (*Polska Partia Socjalistyczna*) — 1, № 13 "Работніцка-сялянскае адзінства" (*Jedność Robotniczo-Chłopska*) — 725, № 18 "Блок нацыянальных меншасцяў" (*Blok Mniejszości Narodowych*) — 585, № 20 "Рускае нацыянальнае аб'яднанне" — 1, № 25 "Польская партыя хрысціянскай дэмакратыі" (*Polskie Stronnictwo Chrzescjańskiej Demokracji*) — 123, № 33 "Агульнажыдоўскі нацыянальны выбарчы блок да Сейма і Сената" (*Ogólno-Zydowski Narodowy Blok Wyborczy do Sejmu i Senatu*) — 39[34]. Такім чынам, вынікі выбараў для беларускіх нацыянальных актывістаў выглядалі значна горшымі ў параўнанні з выбарамі 1922 года. Даліся ў знакі не толькі зніжэнне палітычнай актыўнасці беларускага насельніцтва, але і тое, што беларусы падыйшлі да выбараў раз'яднанымі і галасавалі за выбарчыя спісы (№ 13, які быў фактычна камуністычным спісам, і № 18 — "Блок нацыя-

[32] ДАГВ. ф.17, воп. 1, спр. 172, арк. 48.
[33] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 171, арк. 150.
[34] ДАГВ, ф. 63, воп. 1, спр. 5.

нальных меншасцяў"), якія супрацьстаялі адзін аднаму. Таму найбольш галасоў набраў у Скідзелі праўрадавы Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам.

У рапарце ад 30 сакавіка 1928 года камендант Чартарыскі зазначыў, што толькі "ўмелае абыходжанне з людзьмі, а таксама атачэнне іх сваёй апекай і трактаванне па-людзку пераканае іх, што стаўленне ўлады да іх не ёсць варожае"[35]. Там жа ён піша, што мясцовыя беларусы не з'яўляюцца „ў грунце рэчы антыдзяржаўнікамі". Але гэтакі падыход улады не думалі нават выкарыстоўваць адносна актывістаў беларускага руху.

Пасля парламенцкіх выбараў 1928 года актыўнасць гурткоў ТБШ яшчэ больш імкліва пайшла на спад, што паспяшаліся адзначыць шмат якія каменданты паліцыі. Напрыклад, у красавіку 1928 года камендант скідзельскага пастарунка адзначаў: "...гурткі знаходзяцца ў стадыі распаду, бо не выклікаюць такой вялікай цікавасці ў мясцовага насельніцтва, як раней. Галоўныя актывісты гурткоў у выніку рэпрэсій з боку пастарунка пакідаюць свае пасады і гурткі без апекі"[36]. Да канца 1929 года на тэрыторыі Скідзельскай гміны працягвалі актыўна дзейнічаць толькі гурткі ў Скідзелі і Каўшова. Гэта выклікала незадавальненне павятовага каменданта паліцыі, які пісаў у скідзельскі пастарунак: "Ужо ва ўсім павеце, апроч пастарунка Скідзель, дзякуючы зацікаўленасці камендантаў пастарункаў, зліквідаваныя гурткі ТБШ, а ў даверaным Пану раёне яны яшчэ існуюць: у вёсцы Каўшова і ў самым мястэчку Скідзель. Рэкамендую Пану распачаць адпаведныя крокі ў духу шматразовых павучэнняў Пана Старасты, скіраваныя да іх ліквідацыі. Зразумелая рэч, сродкаў яўных, адкрытых і легальных ужываць Пан не можа. Аднак у распараджэнні Пана, як каменданта пастарунка, ёсць тысячы спосабаў, з дапамогай якіх можа Пан, пры адпаведным спрыце і такце, ускосна ўплываць на сяброў актыву ТБШ, зняхочваючы іх да далейшай працы ў Т-ве і схіліць да развязання гурткоў"[37]. Мясцовая паліцыя асаблівай тактоўнасцю не вызначалася, а дзейнічала традыцыйнымі жорсткімі метадамі. У лістападзе 1927 года была праведзена рэвізія Скідзельскага гуртка ТБШ, падчас якой паліцыянты канфіскавалі пячатку гуртка, усе канцылярскія паперы, некаторыя кнігі, у тым ліку "Гісторыю беларускай літаратуры" Максіма Гарэцкага[38].

Некаторыя актывісты ТБШ у такіх умовах адмаўляліся ад беларускай дзейнасці і пачалі дэманстраваць сваю лаяльнасць да ўлады, спадзяючыся такім чынам атрымаць выгодныя пасады ў мясцовым

---

[35] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 173, арк. 77 адв.
[36] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 173, арк. 77 адв.
[37] ДАГВ, ф. 24, воп.1, спр. 24.
[38] Наша Праўда. №1. 30.03.27.

кіраванні. Пераход некалькіх лідэраў у праўрадавы палітычны лагер прывёў да распаду гурткоў ТБШ, якія яны да гэтага ўзначальвалі. Скідзельскі камендант пісаў у верасні 1928 года: "Галоўныя дзеячы ТБШ, як-то Касцевіч Міхал з вёскі Баброўня, Сяўрук Пётр са Скідзеля, а таксама радны Кізевіч Міхал з вёскі Стральцы ўсімі сіламі стараюцца ўжываць сваіх уплываў, каб захаваць гурткі, аднак напатыкаюцца ў сваёй працы на абыякавасць шырокіх масаў"[39]. У чэрвені 1929 года камендант паліцыі занатаваў у сваёй справаздачы: "Сцверджана, што асобныя дзеячы Таварыства беларускай Школы ўсімі сіламі робяць намаганні сярод мясцовай людасці, каб Т-ва той школы стаялі на адпаведным узроўні і паспяхова развіваліся, аднак шырэйшыя масы людасці ніякага ўдзелу ў гэтым руху не бяруць, зусім не цікавяцца той акцыяй"[40].

У верасні 1929 года гурток ТБШ у Скідзелі налічваў усяго 12 сяброў[41]. 26 верасня Пётр Сяўрук уласнаручна склаў на запатрабаванне мясцовых уладаў спіс яго сяброў: "Пётра Сяўрук, сын Якуба 24 гады (старшыня), Міхал Войтас, 22 г. (сакратар) (на той момант быў ужо ў польскім войску — укл.), Сцяпан Цывінскі, 26 г. (скарбнік), Вера Сяўрук, дачка Андрэя, 23 г., Вера Карповіч, д. Міхала 23 г., Вольга Сяўрук, д. Якуба, 22 г., Захар Босы, с. Мікіты, 26 г., Язэп Мазалеўскі, с. Канстанціна, 27 г., Рыгор Мазалеўскі, с. Канстанціна, 27 г., Міхал Гуліда, 25 г., Васіль Фурман, 26 г., Даніла Скварнюк 26 г."[42]

Пётр Сяўрук вельмі адмоўна ставіўся да палітызацыі ТБШ, на якую штурхалі культурніцкую арганізацыю актывісты КПЗБ. Удзел гурткоўцаў у палітычных акцыях станавіўся для ўладаў зручнай падставай для развязання гурткоў. У чэрвені 1929 года Сяўрук даслаў у Галоўнае праўленне ТБШ у Вільні і акружное праўленне ў Гародні пратэст на рэзалюцыю, прынятую на з'ездзе дэлегатаў Таварыства беларускай школы у Вільні. Ён лічыў, што гэты дакумент, прасякнуты нянавісцю да ўсіх нязгодных з камуністычнай ідэалогіяй, толькі кампраміта ваў ТБШ і культурніцка-прасветную дзейнасць беларусаў. Цікава, што канспект гэтага ліста Пётры Сяўрука ўвайшоў у тэкст справаздачы беластоцкага ваяводы за чэрвень 1929 года[43].

Смерць Пятра Сяўрука ў кастрычніку 1929 года сталася непапраўнай стратай для беларускай культурна-асветніцкай справы на Скідзельшчыне. Камендант паліцыі адзначыў у сваёй справаздачы: "У мястэчку Скідзель дзейнасць Т-ва зменшылася пасля смерці Пятра Сяўрука, выбіт-

[39] ДАГВ, ф. 17, воп.1, спр.176.
[40] ДАГВ, ф. 17, воп.1, спр.176, арк.79.
[41] ДАГВ, ф. 24, воп. 1, спр. 24, арк.75.
[42] Тамсама.
[43] APB, UWB, 49, k. 37.

нага дзеяча"[44]. Кіраўніком Скідзельскага гуртка стала родная сястра Пятра Вольга Сяўрук. У студзені 1930 года гурток налічваў усяго 11 сяброў[45]. У той час у Скідзелі дзейнічалі некалькі культурна-асветніцкіх арганізацыяў: польская арганізацыя "Мацеж Школьна" налічвала 15 сяброў, габрэйскія арганізацыі "Тарбут" і "Культура" — адпаведна 150 і 70. Але рэпрэсіі ўладаў абрушваліся толькі на беларусаў. Пры гэтым камендант паліцыі сцвярджаў, нібыта ТБШ "у камуністычным духу ўплывае на беларускае насельніцтва"[46], што зусім не адпавядала рэчаіснасці, паколькі ў складзе гуртка на той час засталіся пераважна адныя "талстоўцы" — прыхільнікі тэорыі непраціўлення злу сілай і прынцыповыя праціўнікі палітычнай дзейнасці. Неўзабаве скідзельскі гурток спыніў фармальнае існаванне. За 1931 год у матэрыялах мясцовай паліцыі ўжо не сустракаецца ніякіх звестак пра яго дзейнасць. Усё ж беларускія настроі сярод мясцовай моладзі не згаслі. 28 лютага 1931 года скідзельскія хлопцы Міхал Стальбоўскі, Міхал Трусь, Уладзімір Шань і Аляксандр Фурман прыйшлі на паседжанне мясцовага аддзела Стралецкага Звяза і заспявалі там "Ад веку мы спалі"[47]. Інфармацыя пра гэты ўчынак дайшла нават да беластоцкага ваяводы. Нам невядома, чым скончылася справа, але за спяванне гэтай патрыятычнай беларускай песні тады часта саджалі ў турму, а тут яшчэ хлопцы праспявалі яе на сходзе такой шавіністычнай ваенізаванай польскай арганізацыі, якой быў Стралецкі Звяз.

Тыя сябры скідзельскага гуртка ТБШ, што захапляліся "талстоўствам", успрымаліся мясцовым насельніцтвам як своеасаблівая рэлігійная секта. Але чуткі пра іх ідэі і іх дзейнасць распаўсюджваліся па Заходняй Беларусі. У 1937 годзе ў Скідзель прыехаў аж з-пад Карэлічаў на ровары малады Янка Брыль — будучы класік беларускай літаратуры. Ён перапісваўся са сваімі скідзельскімі аднадумцамі, а былы сябар ТБШ Даніла Скварнюк з Пузавічаў рэдагаваў яго вершы. Даніла Скварнюк, які гераічна загінуў падчас Другой Сусветнай вайны разам з іншымі жыхарамі вёскі Пузавічы, паслужыў прататыпам галоўнага героя ў вядомым апавяданні Янкі Брыля "Memento mori". Ён, як і амаль усе паплечнікі Пятра Сяўрука па скідзельскім гуртку Таварыства беларускай школы, на ўсё жыццё захаваў вернасць ідэалам сваёй маладосці.

Андрэй Вашквіч,
Сяргей Токць

---

[44] Т ДАГВ. ф. 17, воп.1, спр. 203.
[45] ДАГВ, ф. 24, воп. 1, спр. 29.
[46] ДАГВ, ф. 24, воп. 1, спр. 29, арк. 201.
[47] APB, UWB, 58, k.56.



ПУБЛІЦЫСТЫКА

Мова і нацыя *

Асаблівасьць мовы стварае нацыянальнасьці — ў гэтым німа сумніву.

Ўсякі ўдумчывы чалавек перакананы ў тым, што дзеля чалавецтва шмат лепей было-б, каб была адна мова, г[эта] з[начыць] адна нацыянальнасьць — чалавецтва. Гэткім чынам грэх часу ёсьць тое, што чалавецтва разбілася на тысячы нацыянальнасьцяў, г[эта] з[начыць] на тысячу розных моваў. Але ў гэтым грэсі чалавек нікаліва не вінаваты. Вінаваты толькі час і варункі. Гэты час і гэтыя варункі стварылі мову кожнаму народу. Дык па выразу паэты, "мова ёсьць споведзь народу і ў ёй чуецца ягоная прырода ягонай душы і родны быт". Без сумніву кожная мова ёсьць споведзь чалавека і ў ёй адбіваецца ягоная чалавечая душа, створаная часам і варункамі, якія паклалі асаблівасьць паміж тымі і іншымі часткамі чалавецтва; — дык гэта асаблівасьць споведзі, асаблівасьць чалавечай душы ёсьць прычына нацыі, вынікаючая з прычыны мовы.

Дык той, хто борацца за вызваленьне і права задушанай і выгнанае мовы — робіць вельмі добрую рэч. Калі чалавек адракаецца ад свае нацыі, ад свае мовы, дык ён утраціць чыстату свае споведзі і загубіць сваю душу. Ягоная гутарка ня будзе адбіваць ягонае душы, гэтакім чынам ўсё чалавечае, — г[эта] з[начыць] чыстата душы магчымая пры споведзі, — ў ім загіне. Ў наш час пры сучасных варунках, каб чалавек быў чалавекам, ён павінян зберагчы асаблівасьці сваёй нацыі, г[эта] з[начыць] асаблівасьці свае мовы.

Дык ў нас паўстаюць два заключэньні: што шмат ляпей, каб чалавецтва мела адну мову; а потым: шмат ляпей, калі зьбярагаць асаблівасьць ўласнае нацыі — розные мовы. Як быццам тутака ёсьць працівенства, але яго няма. Ўжо гаворано, што чалавек будзе чалавекам тады, як будзе спавядаць сябе ў чыстоце свае мовы. Гэткім чынам кожная нацыянальнасьць, кожная мова зьберагае чалавека. Гэты грэх — рознасць моваў, нісколькі не вадзіць чалавека. Але... шмат ёсьць гэткіх, якія завяртаюць гэты не вадлівы грэх за вадлівасьці. Нам вядомы патрыятызм, г[эта] з[начыць] зада-

* Тут і далей каментары да спасылак гл. ад стар. 218.

ваньне вышэйшасьцю свае нацыянальнасьцю, пахвальба асаблівасьцю свае мовы, моцай дзяржавы і г[этак] д[алей] мова робіцца вінаватаю... Ці вінаватаю? Патрыёт пакладае нацыянальнасьць ў гордасьці, у граху, які зьдзейсніла гісторыя. Дык ці гэткі гардзец мае якую мову? Ці ягоная гутарка адбівае ягоную чалавечую патрыятычную нацыянальную душу, у якой німа нічога чалавечага? Гэтакім чынам патрыёт, які ў наш час лічыцца бадай што лепшым чалавекам у нацыі, німае ніц нацыянальнага. Бо нацыянальнае ёсьць спаведаньне свае душы ўласнаю чалавечаю моваю, а патрыёт спаведуе сваю нацыю сваім шавінізмам, сваею не чалавечаю моваю. Гэткія патрыёты імкнуцца дапамагчы чалавецтву, г[эта] з[начыць] зьнішчыць грэх часу — даць чалавецтву адну мову, а іменна тую, па якому яны гутараць. Яны тагды патрапляюць гэта зьдзейсніць. Але гэтае патрыятычная не-нацыянальная гутарка ці можа аб'яднаць чалавецтва? Нігды! Затым, што чалавек губіць сваю душу, а бяздушная еднасьць горш духоўнага раз'яднаньня, тым больш, што ў гэтым раз'яднаньні ня вінаваты чалавек.

Дык: зьберагаючы сваю нацыянальнасьць — сваю мову, — чалавек зьберагае адзінства чалавецтва — спаведаньне свае душы. І гэткія чыстыя, жывыя спаведаемыя душы здольныя будуць заняць аднаго выразу, г[эта] з[начыць] аднае мовы. Толькі гэта аб'яднаньне выканае не гісторыя, — вінаватая ў раз'яднаньні, а сам чалавек, зьбярогшы сваю чалавечую душу пад абразом нацыянальнасьці.

Дык калі чалавек ня забье штучна тое, чаго не забіла гісторыя, дык ён хутка сваім чалавечым вымагам дапне аб'яднаньня свае гутаркі.

Нам, беларусам, гэта трэба ведаць, каб не было ў нашым маладом народзі патрыётаў.

Аб беларускай літэратуры

Гаворачы аб беларускай літэратуры, нельга не кануцца беларускага адражджэньня, і гаворачы аб беларускім адражджэньні, нельга прайсьці моўчкі беларускае літэратуры. З гэтага відаць, што беларуская літэратура і беларускае адражджэньне маюць між сабою нешта супольнае.

Калі ж мы адкажам на пытаньне, што такое літэратура, і што такое адражджэньне, дык не толькі зразумеем, чаму гэта так, але убачым, што не можа быць іначай, бо адражджэньне народу ёсьць нішто іншае, як імкненьне яго быць самым сабой; а літэратура ёсьць выяўленьне душы і думкі народу.

Не трэба забывацца аб гэтым, калі мы захочам разгледзець скарбы свае роднае літэратуры, бо калі імі мы не можам пахваліцца, як сваім нацыянальным багацьцём, дык прынамсі мы не можам іх абмінуць моўчкі, дзеля таго, што яны складаюцца з уласьціваськяў нашае нацыянальнае душы. І той, хто хоча даказаць, што беларускае адражджэньне ёсьць нейкая выдумка, нешта нерэальнае, ды пры гэтым паказвая на беднасьць беларускага друкаванага слова — няхай помніць, што калі нават і запраўды беларуская літэратура зусім бедная, дык усе ж такі гэта не доказ таго, што наш народ мусіць быць якімсь іншым народам, і што нашыя літэратурныя сілы мусіць тварыць тое, што выяўляе іхнюю душу у якойсь іншай мове, а не у беларускай. Беларуская літэратура можа быць ёсьць бедная лікам у параўнаньні не толькі з расейскаю, ці польскаю, а нават з украінскаю, але гэта не доказ таго, што яна бедная запраўднымі каштоўнасьцямі мастацтва. Калі мы мусім сьцвердзіць факт, што у беларускай мове мала што друкуецца, ды адначасна трэба сьцвердзіць, што па беларуску друкуецца прапарцыянальна меньш усялякага літэратурнага хламу, які затапляе літэратуру іншых нацыянальнасьцяў. Дык вось, прыймаючы гэта пад увагу, мы не павінны глядзець на шырыню друкаванага слова, але ягоныя вартасьці. Што у беларускай літэратуры ёсьць творы, вартыя увагі, якія маюць у сабе запраўднае мастацтва, дык гэта хіба бязпрэчны факт, і калі б нават іх ня было, дык усе ж такі гэта не даказала б, што іх ня можа быць.

Сказаць, што у беларускай мове не можа быць выяўлена нічога мастацкага — гэта ўсе роўна, што сказаць, быццам нема нічога цікавага у тых творах, якія апісваюць штодзённае жыццьцё, і што цікавае толькі апісаньне розных прыгодаў, як падарожжа на месяц, альбо туды, куды і Макар цялят не ганяе. Хто ведае вартасьць запраўднага мастацтва, той разумее вельмі добра, што, наадварот, найбольш вартае увагі ёсьць мастацкае ізабражэньне штодзеннага жыцьця і найменьш мастацкім бывае гісторыя падарожжа на месяц. Гэта зразумела, бо запраўдны мастак-пісьменнік прыгледаецца да жыцьцёвае праўды і адбівае яе у сваіх творах, ды толькі тыя нібы мастакі, якія не умеюць адрозьніць чорнага ад белага, але пішуць за грошы, выдумваюць небывалыя рэчы, якімі толькі зьневажаюць пачуцьці тых, хто ведае мастацкую красу літэратуры.

Хто разумее мастацкія вартасьці, той разумее, што запраўдны мастак не можа пісаць інакш, ад таго, як ён піша, возьмем для прыкладу з расейскае літэратуры сусьветна вядомых пісьменнікаў, як Талстой[1] і Дастаеўскі.[2] Каб Талстой пісаў "Брацяў Карамазавых", а Дастаеўскі "Анну Карэніну", дык напэўна ні той ні другі не справіліся б з сваей задачай. Мастак толькі дзеля таго ёсьць мастаком, што ён не можа думаць ці глядзець на рэчы ды й ізабражаць іх інакш ад таго, як ён разумее ды ізабражае іх. Дзеля гэтага прадметам мастацкага ізабражэньня не бываюць адны кветкі ды прыгоды, але ўсе што ёсьць у жыцьці — і балота, і агіда, і самыя непрыкметныя жыцьцёвыя зьявішчы. Хто чытаў рад невялічкіх мастацкіх абразкоў Тараса Гушчы[3], найлепшага беларускага пісьменніка прозай, як напр[ыклад], "Сьцепановы падрызьнікі", "Дзяліцьба", "Тоўстае палена", ды ягоны вялікшы твор "У палескай глушы", той гэта пэўна заўважыў, што асаблівае у тым, што нейкі Сьцяпан купіў падрызьнікі, ды неведаў, дзе іх надзець, як сяляне дзеляцца між сабой, як нехта задумаў помсту аб'ездніку за тое, што ён учыніў над ім несправядлівасьць за тоўстае палена, і што можа быць цікавага ў перажываньнях настаўніка, які папаў у такую палескую глуш, дзе сяляне не ведалі, калі якое сьвята бывае. Але сіла мастацтва у тым, каб паказаць усе гэтыя зьявішчы у такім асьвятленьні, у такой крыштальнай правільнасьці, што яна дапамагае глыбей і ляпей разумець гэтую нецікавую путаніцу звычайнага жыцьця. І як не можа быць ніякіх вынят-

каў з прадметаў дзеля мастацкае апрацоўкі, гэтак не можа быць ніякіх выняткаў з тых уласьцівасьцяў, якія зьяўляюцца сродкамі мастацкае творчасьці. І бадай што найгалаўнейшым гэткім сродкам ёсьць мова. Кожны пісьменнік мае свой асаблівы спосаб выражэньня, які называецца стылям. Стыль кожнага з пісьменнікаў настолькі розьніцца адзін ад другога, што нярэдка можна пазнаць аўтара твору па аднаму ягонаму стылю. Калі нават стыль, г[эта] з[начыць] манэра выражаць свае думкі, мае гэткае вялікае значэньне, дык ціж трэба казаць аб тым, якое вялікае значэньне мае мова, уласьцівая даннаму пісьменніку. Хто чытае арыгінал якога-нібудзь твору, г[эта] з[начыць] чытае твор у тэй мові, у якой ён напісаны, а таксама і хто чытае пераклад гэтага твору на іншую мову, той можа легка заўважыць, што найлепей зроблены пераклад не можа дакладна перадаць таго, што ёсьць у арыгіналі. Гэта залежыць ад асаблівасьцяў мовы, якімі мова кожнага народу розьніцца ад мовы другога народу. Мы можам перакладаць з аднае мовы на другую толькі словы, але ніколі ні у стане пералажыць самы дух таго, што сказана, бо дух зьместу зьвязаны з асаблівасьцямі мовы. І гэтыя асаблівасьці мовы найлепей абрысоўваюць асаблівасьці народнае душы даннага народу. Калі мы возьмем, напрыклад, вядомы твор Якуба Коласа "У палескай глушы" і пераложым на расейскую мову, дык напэўна абрысоўка жыцьця нашага Палесься атрымае адзнакі хіба якое Валагодзкай ці Кастрамской глушы. Адным словам, выйдзе нейкая мешаніна Палесься і Паволж'я. З гэтага відаць, што ў чужой для нас мове можна хіба толька павярхоўна абрысоўваць нашае жыцьце, але ніколі немагчыма выявіць ягонага зьместу.

Дзеля гэтага калі нехта кажа, што беларуская мова не мае ніякіх данных для таго, каб быць шырока ўжыванай у літэратуры, той павінен перш даказаць, што беларускае жыцьце не мае права ці не мае данных для таго, каб захапіць увагу мастакоў-пісьменьнікаў.

Выяўленьне зьместу нашага жыцьця цесна зьвязана з ужываньнем нашае мовы у літэратуры, бо нашая беларуская мова зьяўляецца найлепшым сродкам, найлепшым матэр'ялам для выяўленьня і абрысоўкі нашага жыцьця.

Вось дзеля чаго адраджэньне беларускага народу нельга аддзяліць ад развою беларускае літэратуры. У сваёй мове народ пазнае сам сябе і сваёй мовай народ адзначае сам

сябе. Калі можа яшчэ хто дагэтуль дзівіцца з таго, нашто гэта беларусы ўздумалі пісаць па свояму, калі ім зусім зразумела расейская ці польская мова, дык няхай той зразумее, што ў чужой мове мы можам знайсьці шмат чаго карыснага, але толькі не можам знайсьці ў ёй самых сябе — а гэта для чалавека галоўнае. Калі ён не ведае самога сябе, дык нічога неварта усё тое, што ён ведае.

Ад самага пачатку людзкога поступу вядома мудрае правіла, якое дала чалавецтву старагрэчаская думка: "Пазнай самога сябе". Правіла гэтае мае асабліваю вагу затым, што каб пазнаць самога сябе, перш трэба быць самым сабою. Можа, хто думае, што кожны бывае сам сабою, і што іначай не можа быць, але калі прыгледзішся добра да парадкаў жыцьця, дык убачыш, што у працягу усяе вядомае гісторыі людзкасьці, а таксама у цяперашнія часы, найтруднейшай задачай зьяўляецца імкненьне быць самым сабой. Беларусам гэтага, здаецца, не трэба тлумачыць, бо яны добра ведаюць, як трудна ім захоўваць свае нацыянальныя асаблівасьці і як трудна ім вясьці сваю нацыянальню работу. Розныя дабрадзеі з асаблівай ахвотай падносяць нам усё гатовае і стараюцца пераканаць нас у тым, што мы дарэмна робім тое, што ужо зроблена іншымі. Але яны ніяк не хочуць сказаць нам таго, што калі мы будзем карыстацца чужымі скарбамі культуры, дык дзеля гэтага мы не будзем мець магчымасьці быць самымі сабой, г[эта] з[начыць] і пазнаваць самых сябе. А хто не бывае самым сабой і хто не ведае самога сябе, над тым лёгка панаваць і яго лёгка зрабіць рабом чужой [волі] і гноем чужого поля.

Пакуль жа у чалавеку ёсьць хоць іскра самаадчуваньня і зразуменьня самаго сябе, да таго часу ён не можа згадзіцца быць рабом і гноем, але ён будзе імкнуцца быць самым сабою і праз гэтае пазнаваць самаго сябе. І калі мы глянем на гісторыю адраджэньня ці вызваленьня людзкасьці, дык убачым, што яно пачынаецца якраз ад таго, што народ, зьненавідзіўшы путы няволі, імкнецца быць самым сабой і пазнаць самога сябе. Тое самае было з адраджэннем народаў пры пераходзе ад сярэдніх вякоў, трымаўшых людзкасць у путах духовае няволі, так было з адраджэньнем чэхаў, і расейцаў і гэтае самае паўтараецца з адраджэньнем беларускага народу. Пакуль наш народ быў рабом, пакуль ён не быў самым сабой і не ведаў самога сябе, да таго часу аб бела-

рускай літэратуры не было нават і успаміну, калі не лічыць таго, што пісалася ў беларускай мове за часоў В[ялікага]-князьства літоўскага. Тагды быў другі час і тое, што тагды пісалася пабеларуску, нельга лічыць літэратурай, а толькі пісьменнасьцю. Калі ж толькі народ пачаў прабуджацца, калі пачалі адчувацца павевы скасаваньня паншчыны, як у той жа час пачала зьяўляцца беларуская літэратура. Праўда, спачатку пачалі пісаць па беларуску людзі, якія мелі мала супольнага з беларускім народам, як Чачот[4], Баршчэўскі[5], Чапінскі[6], але іх, як людзей больш ліберальных, жыцьцё прымусіла лічыцца с фактам існаваньня беларусаў. І што тагды беларусы ужо пачыналі адчуваць самых сябе, аб гэтым сьведчыць факт, што ў той час зьявіўся першы беларускі паэт-селянін Паўлюк Багрым[7], які быў замучаны за свае свабодалюбівыя і нацыянальныя пачуцьці. Гэта было ў пачатку XIX стагодзьдзя, і літэратура таго часу мала мае значэньня. Ужо большы сьлед у беларускай літэратуры пакінуў Вінцук Дунін-Марцінкевіч[8], пісьменнік сялянска-шляхоцкае ідыліі. Аднак творчасьць Марцінкевіча нельга залічыць да беларускай адражджэнскай літэратуры. У творчасьці Марцінкевіча, як і ў творчасьці ягоных папярэднікаў, толькі прадчуваецца адражджэньне беларусаў, бо нічым іншым як толькі прадчуцьцем чагосьці адбіваецца ў наіўных абразках "Гапона" ці "Вечарніцаў", якія бароняць "добрую" паншчыну ды пераконваюць паноў, каб лепей адносіліся да сваіх прыганятых. Апроч беларускай мовы Марцінкевіч не выявіў нічога, што магло-б быць адбіцьцем беларускага адражджэньня. Мова без зьместу тое самае, што зьмест, уложаны не адпаведнай мовай.

Першым беларускім паэтам, пачынальнікам беларускага адражджэньня быў Францішак Багушэвіч[9], які у сваей творчасьці выявіў запраўднае палажэньне беларускага сяляніна, яго балячкі і крыўды, ды сказаў беларусам "не пакідайце мовы свае, каб не ўмерці". Гэтыя словы Багушэвіча маюць асаблівае значэньне, бо для нас агульна ведамы факт, што калі хто лічыць беларускую мову нікчэмнай, дык і беларусаў лічыць нейкім нягодным народам і пад гэткім паглядам беларусу трудна казаць аб сваёй крыўдзе, аб сваім палажэньні. Ён павінен забіць у сабе адчуваньне свайго палажэньня, каб не паказаць сьвету сваёй нікчэмнасьці. Але забіўшы у сабе адчуцьце свайго жыцьця, свайго палажэньня, дзеля сораму за сваю мову, беларус робіцца горш як нягодным — ён становіц-

ца мертвым. Дзеля гэтага і сказаў Багушэвіч "не пакідайце мовы сваёй, каб не памерлі" і з гэтымі словамі адкрыў дарогу беларускаму адраджэньні у змаганьні за права свае роднае мовы, якое для нас сталася змаганьнем за права свае чалавечае годнасьці.

Багушэвіч кінуў кліч беларускага адраджэньня і адраджэньне гэтае пачалося з 1905 г., пасьля расейскай рэвалюцыі, калі ў беларускай мові пачалі друкавацца газэты і кніжкі. Адначасна з гэтым, хоць і незалежна ад гэтага факту, пачынае сваю літэрацкую дзейнасьць Янка Купала[10], які лічыцца найвялікшым беларускім паэтам хіба за тое, што ён піша выключна аб долі беларускага сяляніна і наагул беларускага народу. Зараз за гэтым пачынае сваю дзейнасьць Якуб Колас, якога можна лічыць найвялікшым беларускім пісьменнікам, бо ён тварэц беларускага эпосу і ён даў найлепшыя творы ў беларускай мове прозай ды закрануў у сваіх творах агульна людзкія пытаньні. Купала і Колас паказалі, чаго варта беларуская мова, і яны імянна выканалі тэстамэнт Багушэвіча: не пакінулі мовы беларускай ды паказалі, што беларусы запраўды не хочуць памярці, ды што яны могуць жыць і тварыць раўназначна таму, што твораць іншыя. Аб гэтым сьведчыць багатая формамі і думкамі філязофская паэзія М[аксіма] Багдановіча[11], які гаворыць пабеларуску ужо не аб долі беларусаў, але падае думкі агульна людзкага значэньня. Блізка да Багдановіча па зьместу свае творчасьці стаіць Зьмітрок Бядуля[12]. Таксама агульна-людзкія пытаньні закрануў вельмі глыбока у сваей драматычнай творчасьці Францішак Аляхновіч[13].

Беларуская літэратура ў нашыя часы адчыняе сабе шырэйшае кола пытаньняў. Ужо па беларуску не пішацца выключна аб долі-нядолі бедака-сяляніна, бо палажэньня беларускага народу ўжо высьветлена. Цяпер нашае літэратура уступае ў сям'ю агульна-людзкіх літэратур, але пакуль што яна яшчэ да гэтага не дайшла. Гэта адбіваецца і на крытычных аглядах беларускай літэратуры. Беларускія крытыкі, разглядаючы літэратуру, дзеляць яе на тры кірункі (не лічачы аджыўшы шляхоцка-сялянскі): сялянскі, работніцкі і інтэлегенцкі. Гэткая клясафікацыя у іншай літэратуры паказалася б зусім недарэчнай, а ў нас жа гэта у парадку рэчаў, бо у нас яшчэ пакуль што літэратура адбівае ў сабе палажэньне народу, заваёўвае яму права на жыцьце, акрэсьлівае ягоныя

асаблівасьці і уласьцівасьці, адным словам, паказвае дарогу адражджэньня. Пакуль ня прайшло гэтае адражджэньне, пакуль беларускі народ і беларуская літэратура не увайшлі роўнымі сябрамі у сям'ю іншых народаў і іншых літэратур — да таго часу і зьмест нашае літэратуры і яе заданьні і яе значэньне мае свае асаблівыя адзнакі, асаблівыя вартасьці, дзеля чаго і пагляд на яе не такі, як на літэратуру, што мае сусьветнае значэньне.

Калі з часам можа беларуская літэратура будзе мець сусьветная значэньне, тады іначай будзем разглядаць яе.

Аб мове, народзе і друку ў роднай мове (з поваду 20-х угодкаў беларускае прэсы)

Беларуская кніжка ці газета цяпер ужо не дзіва, але да вайны дык напэўна, што ня толькі ніхто не бачыў беларускага друку, але нават ня чуў аб ім. Ад гэтуль паўстала ад'ёмнае адношаньне да беларускага друкаванага слова і да беларускае мовы наагул. Уся навука вялася паміж нас па руску або па польску з няма ведама якіх часоў, з прычыны чаго мы прывыклі былі лічыць уменьне ўжываць рускую ці польскую мову за адзнаку культурнасьці, інтэлегентнасьці, і наадварот, ужываньне беларускае, простае і мужыцкае мовы ўважалі за адзнаку цемнаты, хамства і г[этак] д[алей]. Дык не дзіва, што гэткія думкі укараніліся ў нас моцна і шмат хто, пабачыўшы ці пачуўшы аб беларускім друку, пачаў адносіцца да яго варожа, бо думка аб друку ў беларускай мужыцкай мове здалася не мала каму як адзнакай барбарызацыі, сеўбы цемры і г[этак] д[алей].

Гэта было не вельмі даўно, але цяпер ужо мы бачым не тое; цяпер ужо не гэтак варожа ўзіраюцца на беларускую кніжку і газэту, а нават шмат хто раптам загарэўся гарачаю прыхільнасьцю да яе. Вітаючы гэтую зьяву, нам астаецца толькі высьветліць даўнейшую памылку, якая і цяпер яшчэ мо каго смучае.

Культурнасьць, інтэлегентнасьць і г[этак] д[алей] залежыць не ад таго, якую мову ўжывае чалавек, бо моваў ёсьць не адна і не дзьве, але тысячы. Спаміж розных народаў, ужываючых розныя мовы, ёсьць культурнейшыя і некультурныя, нават зусім дзікары, дзеля гэтага мова адных вельмі значная ў культурным жыцьці, а мова другіх нічога не значыць.

Ад гэтуль і паўстае шмат ў каго памылковая думка аб тым, што ўжываньне тае ці іншае мовы ёсьць адзнака культурнасьці ці не культурнасьці. Калі ж гэта прыняць за агульную праўду, дык прыйдзецца ўсім народам, колькі іх ёсьць на сьвеці, адказацца ад сваіх моваў і ужываць мову нямецкую, бо немцы ў нашы часы аперадзілі ўсіх у культуры. Толькі ж гэта з аднаго боку — немагчыма, а з другога боку недарэчна. Дзеля гэтага, тая дзікая "праўда", быццам ужываньне мовы ёсьць адзнака культурнасьці, зводзіцца з шырокага маштабу да мелачных прыватных "павер'яў", прык-

ладам, у данным выпадку ўважаць за лепшую мову рускую ці польскую перад беларускаю, бо ў рускай і польскай мове развівалася культура больш, як ў беларускай.

Гэта праўда, але калі мы да гэтае праўды аднясемся крытычна без прыватных павер'яў адносна мовы і інтэлегентнасьці, то нам высьветліцца шмат што, аб чым мы нават не думалі.

Каб зразумець тое, чаму, напрыклад, руская мова больш культурная, як беларуская, дык нам прыдзецца зрабіць некалькі гістарычных і сацыяльных увагаў, якія пакажуць нам праўду. Мы ўбачым, што заняпад беларускае мовы залежыць не ад мовы, г[эта] з[начыць] не ад таго, што яна мужыцкая, хамская і г[этак] д[алей], але ад інакшых прычынаў. Каб жа беларуская мова апынулася ў інакшых варунках, як тыя, ў якіх яна была, дык тады ў мове 12-ці мільённага народу мы напэўна атрымалі б вялікія здабыткі культуры.

Ў XV—XVI стагодзьдзі, у часе існаваньня Літоўска-беларускага князьства ў беларускай мові гаварылі князі і паны, пісалі законы. У той час быў у беларусаў доктар Францішак Скарына[1] з Полацку, які пачаў друкаваць беларускія кніжкі раней, як пачаліся друкавацца рускія кніжкі больш як на 50 гадоў, бо першая друкаваная беларуская кніжка выйшла ў сьвет у 1517-м годзе у Празе чэскай, а першая беларуская друкарня 1525 году была заложана ў Вільні, у той час, калі расейскія кніжкі пачаліся друкавацца ў Львове, Заблудаве, ў Маскве неяк 1570—80-х гадох.

Беларуская біблія (найбольш цэннае выданьне тых часоў), надрукаваная Францішкам Скарынай, зьявілася трэцяй у сьвеці, пасьля нямецкай і чэскай. Каб пайшло так і далей, дык цяпер беларуская мова была б прынамсі на роўні з польскаю, калі не вышэй за яе.

Але вінаваты ў заняпадзе беларускае мовы Люблінская вунія[2], калі літоўскі князь Ягелло[3] ажаніўся з польскай каралеўнай Ядвігай[4] і злучыў Літоўска-беларускае князьства з Польскім каралеўствам. Пасьля гэтага паступова пачалі пераходзіць ў каталіцтва літоўска-беларускія паны, прымаючы разам з ім польшчыны і пакідаючы гэткім чынам беларускую мову, якая ўрэшці засталася ў адных мужыкоў, дзеля чаго і празвалі яе мужыцкаю.

Дык як бачым, мужыцкаю яна стала не ад таго, што была нягоднаю для культурнага разьвіцьця, а дзеля таго, што

паны-шляхта здрадзілі яе і пакінулі яе мужыком, а мужыкі ў той час, ведама, не тварылі ніякае культуры, толькі працавалі на паноў, дык з гэтае прычыны і аказалася наша мова не культурнаю, простаю, мужыцкаю.

Цяпер жа мінулі тыя часы, калі адны паны–шляхта тварылі культуру, цяпер ужо пачынаюць тварыць культуру і працоўныя людзі: мужыкі, рабочыя і г[этак] д[алей], якія напэўна ў хуткім часе аперадзяць усех паноў, бо іх большая сіла.

У гэты час, калі народ сам пачынае тварыць культуру, калі нават найбольш цёмны і пасыўны беларускі народ пачынае варушыцца і самастойна думаць, у гэты час адкрываецца новы шлях для разьвіцьця культуры ў беларускае мові.

Нам даводзіцца чуць, што мова беларуская брыдкая, бедная, мужыцкая і г[этак] д[алей]. Адным словам — зусім непрыгодная для таго, каб мець культурная разьвіцьце. Кажучыя гэта, ці думаючыя гэтак, пэўня, лічаць, што культуру трэба разьвіваць ў "культурных" мовах, што "інтэлегенту" трэба гаварыць "інтэлегентнай" мовай і г[этак] д[алей]. Але няхай будзе ведама ўсім, хто так думае і гаворыць, што культурнасьць і інтэлегентнасьць даецца не тым, якую мы мову ўжываем, а тым, сколькі ёсьць ў нас ў галаве крытычных паняцьцяў і праўдзівых пачуцьцяў. Няхай хто гаворыць хоць расейскаю мовай, але калі ў яго ў галаве абсурд, ці клоча замест мазгоў, дык напэўна такі чалавек ужо не можа быць культурным.

Толькі ясная і разумнае паняцьце аб усіх рэчах і праявах жыцьця дае чалавеку не назву культурнасьці, а запраўдную культурнасьць.

У бел[арускім] адрыўным календары на гэты год ёсьць вельмі цікавая стацейка "Культура" і культура", дзе пішацца вось што:

"Беларускі народ лічаць некультурным, бо ён, як ведама, ніколі не заваёўваў другіх, не забіраў чужой зямлі, ані панаваў над іншымі народамі. Апроч таго яшчэ народ гэты рамансаў не піша і французкіх хваробаў не ведае — а ўсё ж гэта маюць культурныя народы.

Праўдзівая культура ёсьць у тым, што народ жыве сумленнай працай, ідзе за жыцьцём, не гвалцячы прыроды.

Маральнасьць і духовая чыстата ў сямейным жыцьці, Бог ў сэрцы і штодзённым жыцьці, а не ў паходах на наказ.

Любоў да ўсяго роднага: мовы, звычаяў, песьні — усяго гэта ёсьць падставай праўдзівай культуры".

Да гэтых пекных слоў аб культуры няма чаго дадаць, астаецца толькі крытычна высьветліць: чаму гэта праўда? Чаму праўда ў гэтым, а не ў тым, быццам культура гэта ёсьць больш-меньш пашыраная вядомасьць мовы?

Каб адказаць на гэтыя пытаньні, нам трэба зразумець: што такое мова? Нам часта даводзіцца чуць, што беларуская мова, напрыклад, непекная і г[этак] д[алей]. Можа, гэта й так, калі прымеш пад увагу тое, што беларуская мова ў працягу даўжэйшага часу не мела культурнага разьвіцьця і г[этак] д[алей], але чым жа вінаваты беларускі народ, у тым, што у яго гэткая, а не інакшая мова?

Гэта яго прыродны скарб, які ён атрымаў ад свае прыроды, ад сваіх продкаў, дык ў гэтым такжа мала яго віны, як мала можа быць яго годнасьці.

Так сама і іншыя культурныя народы зусім не могуць гардзіцца прыгожасьцю сваіх моваў, бо вартасьць чалавека ў тым, што ён творыць, але не ў тым, што ён не атрымлівая. Мы можам шанаваць эсперанцістаў за іхнюю мову, бо яны твараць гэтую мову ўзамен ўсіх моваў, існуючых на сьвеці і раз'яднаючых людзей. Яны хочуць правядзеньнем адзінае мовы аб'яднаць усе народы, дык яны твараць новую агульную мову. Але тое, што чалавек атрымлівае, нельга лічыць ягонаю вартасьцю. Гэта, калі хочаце, можна лічыць шчасьцем, як тое, што чалавек знойдзе грошы, або згубіць іх — толькі ўжо ніяк нельга лічыць вартасьцю ці заганаю чалавека.

Дык кожны, хто лічыць вартасьцю, ці заганаю чалавека ягоную мову, зьяўляецца сяўцом цемры, ілжывых думак і паняцьцяў паміж людам. Кожны хто адракаецца свае мовы, каб прыняць іншую, больш "культурную" мову, гэтым самым робіць сябе "здраднікам" культуры, бо культурны чалавек не той, хто атрымлівае яе з чужых рук, а той, хто яе сам сваімі рукамі тварыць і здабывае. Дык кожны, хто ухіляецца свае простае мужыцкае мовы, гэтым паказвае, што ён не хоча працаваць на тым полі, якое найбольш вымагае працы і ідзе туды, дзе працаваць ня трэба.

Дык вось, культурнасьць мовы залежыць не ад таго, якая вялікая культурная спадчына дасталася нам ў гэтай мове, але ад таго, сколькі ёсьць людзей, ахвочых вясьці культурную працу ў гэтай мове. І каб нават адзін чалавек пажадаў вясьці культуру ў тэй мове, якая усімі паганьбавана,

дык тым шырэйшы грунт для сваей працы ён знайшоў-бы, тым вялікшыя плады яго працы маглі-бы быць.

Такую вялікую працу распачаў сп[адар] Іван Луцкевіч[5], які 20 гадоў назад залажыў першую легальную беларускую газэту і пасьля вяковага заняпаду беларускае мовы разпачаў яе разьвіцьце. За 20 гадоў працы ў кірунку, распачатым ім, мы бачым вялікія пасьпехі, бо беларуская культура пачала нанова тварыцца, дык кожны сьвядомы і дзейны беларус можа прылажыць сваю працу і прынясьці вялікую карысьць. І гэткіх дзейных сьвядомых людзей паміж нашага народу знаходзіцца ўсё больш і больш, і нават тут, дзе яшчэ які тры гады назад, мала хто цікавіўся беларускаю культураю, мы цяпер маем магчымасьць адсьвяткаваць 20-е ўгодкі беларускага друку, як пачатак адрaджэньня беларускае культуры і беларускага народу.

Дык калі паміж народу беларускага знойдуцца гэніі сусьветнае вялічыні, як Гогаль[6], Достаеўскі, Чэхаў[7] і г[этак] д[алей]. Тады з беларускаю моваю будуць лічыцца ўсе культурныя народы, як цяпер лічацца з рускаю. А сто гадоў назад руская мова была тое самае, што цяпер беларуская. Толькі гэніі літэратуры зваявалі ёй мейсца ўвагі ў сусьветнай культуры.

Кожны Сын Беларускага народу павінен захапіцца думкамі тых пачынаньняў сваяго Адрaджэньня, каторыя паказалі яму гэтую праўду, якая кажа, што ў творчай працы сьвядомай энэргіі ёсьць залог культуры.

Творчая праца — гэта праца над разьвіцьцем беларускага народу; сьвядомаю энергію дае паняцьце таго, што мы ня можам ганьбаваць ніякаю моваю і ніякім народам, як бы ён ня быў малы ці не культурны.

Тварыць і разумець, што ў творчастві культуры гэта ёсьць запраўды найвялікшы культурны здабытак, і той, хто гэтага не разумее, хоць бы ён стаяў на найвышэйшай ступені культуры, — ідзе да зьдзічэньня.

Гэтым шляхом ідуць тыя, што працівяцца беларускаму культурнаму разьвіцьцю, але беларуская культура пачынае ламаць гэтыя дзікарскія бар'еры і зьдзейсьняе думку тых, хто 20 гадоў назад далі яму сьведамасьць сваяго прыроднага права і абавязку.

Родная мова і навука. Да "Заранкі"[1]

Што справа з вучэньнем беларускіх дзяцей у польскіх школах стаіць вельмі дрэнна, гэта ўсе беларусы ведаюць аж надта добра, хоць шмат хто мо не дае сабе яснае справаздачы з гэтае справы, бо часамі чуваць, што "няхай дзеці вучацца: усё роўна навука ці польская, ці беларуская". Мо й добра было б, каб гэта было ўсё роўна, але дрэнна тое, што гэта не ўсё роўна, затым, што навука перадае дзецям пасрэдствам уласьцівых ім здольнасьцяў прадметы веды, праўды і дабраты. Некалі навуку перадавалі толькі праз мову, а цяпер педагогі вышукалі яшчэ іншыя шляхі перадачы навукі, як прыклад, рысаваньне, сьпеваньне, гульні, экскурсіі і іншае. Усе гэта ёсьць тыя уласьцівыя дзецям спосабы, праз якія да іх даходзіць веда, але, аднак, найвялікшае значэньне безумоўна мае мова. Дык што ж мы можам сказаць аб навуцы, калі мова, у якой будзем перадаваць навукі, акажацца неўласьцівай дзецям? Гэта ж усё роўна, што пачынаць чытаць дзецям лекцыю аб тым, што дала чалавецтву культура у той час, як яны з гэтай культурай зусім не знаёмыя, г[эта] з[начыць] знаёміць з дапамогай незразумелага. Каб азнаёміць чалавека з тым, чаго ён не ведае, дык разумная лёгіка карыстаецца тым, што чалавеку зразумела, і гэткі спосаб навукі мае посьпех. Калі ж паступаць інакш, дык з нашых высілкаў выйдзе абсурд, бо чалавечы розум не прызвычаены вучыцца з таго, чаго ён не разумее. Дзеля гэтага польская навука не мае ў нас посьпеху, і нягледзячы на цэлую сець польскіх школаў і цэлую армію польскіх вучыцеляў, напалову пісьменны беларускі селянін, пры невялікай ахвоце зразумеўшы справу, можа хутчэй навучыць сваё дзіця, як польскія "культуртрэгеры". Дзеля гэтага трэба толькі кніжкаю заахвоціць дзяцей і ўмелым вядзеннем справы падтрымліваць гэтую ахвоту, каб яна не адпала і не ахаладзела, а дзіця ўжо само будзе старацца вучыцца і зразумець справу.

Гэта заўсягды трэба мець на ўвазе, каб не адкідаць найменьшай магчымасьці вучыць дзяцей у роднай мове, бо гэта невялікая магчымасьць дае вельмі многа.

Праметэй

Агляд жыцьця Заходняе Беларусі

Уступ

Ад пэўнага часу, калі Заходняя Беларусь пачала праяўляць адзнакі сьвядомага жыцьця, калі масы ўзварушыліся і пачалі шукаць нейкага выхаду з утварыўшагася палажэньня, стан жыцьця вымагае крытычнага агляду, каб з такога досьледу зрабіць ацэнку справы, ды на рацыянальных вывадах будаваць далейшы цяг жыцьця. Аднак на дзеле справа ў нас пайшла не туды, куды трэба. Пакуль Заходня-Беларускае грамадзянства пасьля павароту з Расеі не азнаёмілася з палажэньнем, нашае жыцьцё прадстаўляла карціну супакою. Мо хто думаў, што гэта адвечна спакойны беларускі народ сьпіць па даўнейшаму, ды будаваў на гэтай думцы жываедзкія пляны, аднак аказалася, што Беларусы не спалі і пэўна не думалі спаць, але толькі да часу не маглі ўвайсьці ў калею жыцьця. Цяпер жа, калі жыцьцё ўвайшло ў калею і азнаёміўшыся з палажэньнем народ пачаў праяўляць адзнакі інтэнсыўнасьці — жыццё нашае прадстаўляе з сябе арэну змаганьня. З прычыны ўзбудзіўшаеся народнае сьвядомасці мусілі кінуць свае летуценьні Скульскія[1] і Студніцкія[2], якія думалі за 50 гадоў не пакінуць ад беларусаў і сьледу, за тое-ж зьявіліся іншыя, якія пачалі спекуляваць ужо не на пасыўнасці, але на інтэнсыўнасьці Беларускага народу. Зьявіліся розныя кірункі грамадзкае мыслі, і кожны кірунак пачаў круціць на сваю руку агульна-нацыянальнае жыцьцё. Мы не будзем уваходзіць у разбор кожнага паасобнага кірунку, хоць мо ў далейшым закранем той ці іншы з гэтых кірункаў, бо нам ходзіць не аб тое, за што змагаецца кожны з іх і куды ён думае весьці беларускі народ, у нас справа ідзе перш на перш аб тое, што ніводзін з гэтых кірункаў не асноўваецца на дакладным зразуменьні беларускае справы, хоць кожны з іх бярэ з анульнанацыянальнага жыцьця тое, што яму карыстна. Розныя кірункі грамадзкае мыслі, пачынаючы ад быўшае Грамады і ўключаючы сюды нават Паўлюкевіча[3], не ёсьць нечым такім, што мае манаполь у беларускім жыцьці, але гэта ўсе ёсьць не больш не меньш як зьявішча агульнага жыцьця, якія павінны усялякае іншае зьявішча, бо ў дасьле-

дах гэтых зьявішчаў захована тлумачэньне асноў беларускага жыцьця з усемі яго хібамі і годнасьцямі.

Нажаль, у нас ніхто не думае разгледзець агульнае жыцьце з погляду бесстароннага крытыка, і кожны разглядае з погляду кірунку тае мысьлі, да якой ён сябе далучае, дзеля чаго ацэнка беларускага жыцьця заўсягды бывае аднабокая, так што шмат якіх дадатных з'явішчаў, якія маглі б паслужыць фундаментам далейшае дзейнасьці, ўнікае ад нашага погляду і шмат якіх ад'емных зьявішчаў мы таксама не можам прыкмеціць, і яны надалей застаюцца псаваць нашую справу. Вынікі такога стану рэчаў ужо сказваюцца і што раз дык ўсе больш і больш кідаюцца ў вочы. Аб гэтым будзем гаварыць у сваім месцы, цяпер трэба зьвярнуць увагу на тое, што ніколі не трэба судзіць аб рэчах прад'узятымі думкамі, што з'яўляецца прычынай аднабокасьці нашых заключэньняў. Трэба ведаць, што маючы патрэбную дозу лёгікі і дыялектыкі, можна даказаць усё, што хочаш, і можна адкінуць усё, што хочаш, як гэта рабілі старадаўнія грэцкія філёзафы, забаўляючыся філязофіяй, у нас жа ходзіць не аб тое, каб забаўляцца патрэбнымі вывадамі, але аб тое, каб на гэтых вывадах грунтаваць сваю дзейнасьць, будаваць свае жыцьця, дзеля чаго мы сваёй аднабокасьцю грашым перш на-перш над сабою. Укрываючы аднабокі спосаб мысьленьня, мы лёгка можам ісьці ў намечаным кірунку, але за тое яшчэ лягчэй можам заблудзіцца. Нас ніхто не можа зьбіць з нашага шляху, але той шлях, па якім мы ідзем, вядзе нас не туды, куды мы хочам, і не нашыя праціўнікі, на якіх мы гатовы выліваць бруд, а мы самы сабе папсуем усю справу. Дзеля гэтага не заядлая барацьба за свой кірунак, якая мусіць быць аднабокай, але дакладнае зразуменьне ўсіх фактаў жыцьця, як дадатных, так і ад'ёмных, ёсьць падстава, на якой мы можам грунтавацца.

Што рабіць?

Ізноў настаў школьны год, а школаў для нас, беларусаў, няма. Дзесяткі тысяч дэклярацыяў, зложаныя ў мінулыя гады, прапалі без вынікаў, бо куратары і інспектары ў большасьці не рачылі даць ніякага адказу дэклярантам. Цяпер мы стаімо перад неабходнасьцю вымагаць адказаў ад куратараў і інструктараў, ды ў восені ізноў распачаць "школьны

плебысцыт" падачай дэкларацыяў. Толькі цяпер ўжо адчуваецца роспач у масах, няма энэргіі да гэтай справы, як быццам у мінулыя гады можна было верыць, што школьныя ўлады дадуць нам школы. Хто ведаў адносіны ўладаў да патрэбаў беларусаў, той ніколі сур'ёзна не верыў, што польская улада можа даць нам школы, аднак дэкларацыі падавалі, падавалі не дзеля таго, каб здабыць школы, а дзеля таго, каб выявіць сваю волю, каб паказаць, што ня ўсё ў дзяржаве нармальна, каб паставіць рабром балючае пытаньне. І вось цяпер, пасьля таго, калі ўсё гэта было выяўлена і калі ўлады не рачылі нават аднесьціся да справы як сьлед, мы ясьней як калінебудзь бачым, што мы не грамадзяне Польскай Рэспублікі, але пленьнікі яе, бо грамадзяне дзяржавы маюць правы, якія ўлады павінны абараняць, калі ж нашых праў улады не толькі не абараняюць, але нават парушаюць, дык мы можам быць альбо пленьнікамі, калі ад нас не будуць вымагаць абавязкаў, альбо рабамі, калі не маючы праў, мы будзем нясьці абавязкі.

Трэба прызнацца, што несьвядомыя беларусы па даўнейшай памяці ад паншчыны ўсё яшчэ лічаць, што трэба пакарацца начальству ў-ва імя таго, што яно начальства, не разумеючы таго, што дзяржава апраўдвае сябе тым, што яна абараняя правы грамадзян, г.з. бароніць іхнюю волю, якую яны не павінны ахвяроўваць нават дзяржаве, не павінны паніжацца перад начальствам, бо ў гэткім разе дзяржава не будзе мець чаго бараніць і будзе толькі мець што гвалтаваць. І калі розныя "нацыі" на нашых "крэсах" любяць быць прыганятымі, дык гэта дзеля таго, што нашы цёмныя сяляне яшчэ не выжылі сваіх прыгонных паняцьцяў аб начальстве. Але пара гэта выжыць, пара трэбаваць ад уладаў, каб яны захоўвалі нашыя правы, а калі яны не будуць захоўваць нашых праў, мы мусім пратэставаць, пратэставаць і пратэставаць дзе толькі можна, каб бачылі нашыя "гаспадары", што мы ім не прыганятыя, але запраўды "вольныя і роўныя", хоць і пагвалтаваныя ў правох. Трэба нам зразумець, што запраўды прыгоннымі могуць быць толькі тыя, хто не разумее сваіх правоў ды дабравольна падпарадкуецца сваім валадаром, але хто свае правы разумее, хто пратэстуе проці гвалту, таго немагчыма зрабіць прыгонным, бо пратэсты робяць непрымальнымі адносіны і палажэньне ў дзяржаве, дык у інтарэсах дзяржаўнасьці будзе патрэба так ці інакш унармаваць гэткае

палажэньне. З гэтага ясна, што мы мусім усьцяж выяўляць сваю волю задаваленьня сваіх правоў, нягледзячы на тое, што нам іх ніколі не задаволяць, бо нам дзяржава не хоча даць праў, дык мы сваімі пратэстамі, сваімі вымаганьнямі будзем тварыць ненармальнае палажэньне ў дзяржаве, якое напэўна аслабляе ейную сілу і ейны аўтарытэт. Дык калі дзяржава хоча захаваць сваю сілу і аўтарытэт, мусіць задаволіць сваіх грамадзян, а калі яна не хоча іх задаволіць, дык змушана будзе йсьці да развалу. Дык значыць, "школьны плебісцыт"[4] мы павінны ўсьцяж тварыць, бо ён мае сэнс як тагды, калі нашу волю паслухаюць, так і тагды, калі яе не паслухаюць.

Але што рабіць цяпер, каб задаволіць нястачу школы? Вось пытаньне, перад якім мы стаімо. Нашыя "гаспадары" не хочуць даць нам школы і цярпліва выносіць нашую волю, пярэчачую іхнім інтэрэсам, чакаючы, пакуль не зломяцца нашыя сілы і мы змоўкнем ды дабравольна згодзімся быць прыгоннымі. Але мы павінны недапусьціць да гэтага і знайсьці выхад з палажэньня. Выхад будзе такі: калі няма дзяржаўнай школы, адчыняць прыватныя, калі не даюць прыватных, дык трэба вучыць ў дому, калі немагчыма вучыць дзяцей, дык трэба вучыць дарослых; тым, ці другім, ці трэйцім шляхам выхад усё-ж такі ёсьць, ды мы мусім з гэтага скарыстаць, мусім накіраваць усе высілкі да гэтага выхаду, мусім заняцца гэтым станоўча і плянава і напэўна можам перамагчы сваё палажэньне. Т[аварыства]ва Бел[арускай] Школы альбо Бел[арускае] Нав[уковае] Т[аварыст]ва[5] павінны апрацаваць праграмы хатняга вучэньня і праграму курсаў для дарослых, павінны выдаць інструкцыі і рукаводства, павінны выпусьціць падручнікі як для жадаючых вучыцца, так і для тых, хто можа вучыць. Грамадзянства па магчымасьці павінна вучыць сваіх дзяцей у хаце пабеларуску, побач з польскім вучэньнем у школе, а калі магчыма, дык узяць абавязак выключна хатняга вучэньня. Усе адукаваныя сілы на вёсцы павінны спрабаваць даваць хатнія лекцыі, калі гэта магчыма. Гурткі Т[аварыст]ва Бел[арускай] Шк[олы] павінны арганізоўваць курсы для дарослых. Усе спосабы павінны быць скарыстаныя, каб нанесьці ўдар нашым валадарам з другога боку. Яны чакаюць і спадзяюцца, што без іхняй ласкі мы загінем ў цемры і зробімся працоўнай жывёлай, але мы павінны выявіць сваю жывучасьць і сьвядомасьць і здабыць сабе асьвету без панскае ласкі.

Даклад аб стане гурткоў Таварыства Беларускай школы ў Горадзенскім павеце

У Горадзенскім павеце існуе 53 гурткі. Агульны лік сяброў 1167 асоб. Адчынена 17 бібліятэк-чытальняў і 1 народны дом. Рознымі гуркамі пастаўлена да гэтага часу 44 сьпектаклі[1]. Школьных дэкляpацыяў у мінулым годзе зложана звыш 1600 больш як на 2200 дзяцей. У гэтым нельга спадзявацца гэтакай лічбы дэкляpацыяў, бо грамадзянства вёскі зьнеахвочана тым, што на пададзеныя у мінулым годзе не адчынена, здаецца, ні воднае школы, нават утраквістычнае.

З гэтае прычыны наша асьветная праца сцэнтравана выключна каля Гурткоў Т[аварыст]ва. Аднак праца іх вельмі не інтэнсіўная, бо з агульнага ліку 53-х гурткоў толькі 26 залегалізаваны (г[эта] з[начыць] выбралі сабе управы). З 17 бібліятэкаў добра было б, каб знайшлося 5 інтэнсіўных, а сьпектаклі у большасьці праходзяць не вельмі цікава. Прычына гэтаму тое, што у нас на вёсцы брак культурных сілаў. Тыя-ж, якія ёсьць, у большасьці гадунцы расейскіх школаў, не разумеюць нашай справы і не адчуваюць яе.

З гэтае прычыны палажэньне нашае Акружное Управы вельмі не завіднае. Немагчыма даць належны ход справе, не маючы адпаведнае сілы, дзеля чаго наша дзейнасьць абмяжоўвалася выключна фармалістыкай у справе легалізацыі гурткоў, бібліятэкаў, ды у атрыманьні дазволу на сьпектаклі. Іншых спраў бадай што не было, бо гурткі рэдка калі зварочваліся з якімі нібудзь запытаньнямі.

Знаходзячыся у такім нецікавым палажэньні, трэба было дасьледаваць прычыны усіх зьявішчаў, каб зразумець ці тыя прынамсі Т[аварыст]ва гурткі пад нагамі, і якім парадкам магчыма хоць крыху палепшыць справу.

Трэба сканстатаваць, што некажучы на такі сумны стан нашых вясковых гурткоў, усё ж такі яны маюць рацыю. Імкненьне да асьветнае працы не зьяўляецца нечым выпадковым — гэта ёсьць жыцьцёвая неабходнасьць. Усе народы так ці інакш дайшлі да некае культурнае вышыні, і беларускі народ, пасколькі у ім жыве імкненьне быць самым сабой, мусіць гэта зрабіць, калі не ахвотай, дык пад прымусам. Гэткім прымусам жыцьця да асьветы паўстаюць гурткі нашага Т[аварыст]ва. Дык дзеля гэтага найменьш інтэнсыўны гурток, які бадай не існуе, мае падставу для існаваньня.

Аднак ёсьць зьявішча, якое можа шмат каго сумневаць. Мы бачым, што калі арганізоўваюцца гурткі, дык існуе нейкі запал, які пасьля паступова халадзея. З павярхоўнага пагляду здаецца, што гэта паказвае нетрываласьць нашых арганізацый, але думка гэта будзе памылковай. Калі наступае нейкі упадак пасьля закату, але гэта не значыць, што справа ліквідуецца — яна толькі пераходзіць на іншы грунт. Пасьля ахаладжэньня запалу гурткі пачынаюць справу спачатку і крок за крокам паступова, непрыкметна вядуць сваю справу тыя, якія могуць нешта рабіць, і калі гэта справа узрасьце да адпаведнай вышыні, напэўна дасьць ахвоту тым, якія цяпер нічога не могуць зрабіць.

Прыгледаючыся да гэтай непрыкметнай працы, трэба зрабіць увагу адносна тых нестачаў, якія часам псуюць справу. Прадусім арганізаваньне гурткоў вядзецца крыху нетактычна. Каб не маглі паўставаць нежыцьцёвыя гурткі, трэба разьбірацца у залажэньні іх, уважаючы, дзе трэба разьбірацца і дзе не трэба закладаць іх.

Таксама арганізаваньне бібліятэк-чытальняў ідзе без усялякага пляну. Гурткі адчыняюць бібліятэкі і выпісваюць кніжкі, зусім не разбіраючыся у вартасьці іх. У выніку гэтага у вёску трапляюць кніжкі нічога не вартыя, якія не толькі не даюць карысьці, але яшчэ шкодзяць. І гэта дае зразумець, што культурная справа нічога не варта.

Сьпектаклі таксама ставяцца без ніякага пляну. Найчасьцей для пастаноўкі бярэцца некалькі пьесаў, бо п'есы нашы звычайна кароткія. Ставяць у адзін вечар і драмы, і камэдыі, і нават нічога не вартыя жарты, абы запоўніць вечар, не зважаючы на тое, што гэта разьбівае увагу на пастаноўку, гуляюць абы як, а ставяць сьпектаклі для заробку. Аднак хоць сьпектаклі даюць даход, мы мусім адкінуць гэтую спакусу, бо не варта дзеля грошай сеяць смеце, дзеля чаго трэба разьбірацца у спосабе пастаноўкі і у тым, што бярэцца для пастаноўкі, бо лепш нічога не ставіць, чымся ставіць такія глупствы, як "Боты" альбо " Пакой у наймы"[2] і т. п.

Каб папраўляць памылкі у працы нашых Гурткоў, трэба каб Гурткоўная Управа і Акружныя Управы раз'яснілі гуркам сэнс справы праз інструктарства, альбо лістоўна. Але дзеля гэтага трэба апрацаваць нейкі плян, аб чым варта было б нам падумаць на Агульным сходзе.

Аб беларускай прэсе

Газэтная пісаніна пачала ўрэшце шырыцца на нашай шматпакутнай Беларусі. Гэтае з'явішча мо каго вельмі цешыць, але трэба аглянуцца крытычна навокал і зразумець тое, што значыць гэта абсолютна недарэчная газэтная пісаніна.

Калі ўважліва прыгледзімся, чым займаюцця цяпер беларускія газэты, пачынаючы ад крайніх "левых" ды канчаючы крайнімі "правымі", дык убачым, што ўсе яны займаюцца пераважна палітыкай і лаянкай, пры чым палітыка ўвасабляецца ў постаць лаянкі, а лаянка набірае значэньня палітыкі. З гэтага вар'яцкага злучэньня лаянкі і палітыкі родзіцца беларуская палітычная прэса. Хто ёю кіруе, хто, гэтак кажучы, уграз душою ў прэсавыя справы, той мо мімаволі не бачыць таго, што значыць газэтная пісаніна, але, стоячы з боку і гледзячы на газэтную дзейнасьць бяз ніякіх хваравітых паняцьцяў, пакуль зразумеем у чым справа, дзівімся на тое, што можа значыць увесь гэты бруд, гэтая палітычна-лаянская хвароба; але калі зразумеем ейнае значэньне, дык нейкі боль агартае душу за няшчасны беларускі народ, які знаходзіцца ў цемры, ды якога да таго-ж вядуць сляпыя правадыры крок за крокам у нямінучую прорву. Бо да чаго-ж, калі не да прорвы можа дайсьці наш няшчасны народ, якому, замест асьветы і зразуменьня праўды, нясуць газэтную атруту палітыкі і лаянкі.

Успамінаецца наш даўнейшы лёзунг: "адзінае на ўсю Заходнюю Беларусь беларускае газэты", якая клічучы падпісчыкаў абяцала знаёміць з тым, што дзеецца ў сьвеце. Цяпер нешта ніводная газэта аб гэтым не ўспамінае, бо мусі яны забыліся знаёміць народ з тым, што дзеецца ў сьвеце і больш зварочваюць увагу на свае асабістыя і партыйныя разрахункі. Два-тры гады назад газэты пісалі так-сяк аб нацыянальных справах, дык цяпер аб гэтым зусім забыліся і, галоўным чынам, вядуць полеміку, якая, падобная да лаянкі вясковых бабаў, якія ад злосьці і ненавісьці бэсьцяць адна адну гэтак, што соромна паўтараць і ілюструюць сваю лаянку жэстамі, ад якіх соромна робіцца, гледзячы з боку.

Гэтая баталія мо й цікавіць каго, як некалі рымскіх цэзараў цікавілі баі гладыятараў, але ў нашыя часы культуры і інтэлектуальнага разьвіцьця грамадзянства, няма, здаецца, патрэбы ў гэткіх турнірах лаянскага гладыятарства.

З болем у сэрцы трэба лічыцца з фактамі газэтных недарэчнасьцяў, але што беларускія масы на гэта?

Яны несьвядома маўчаць, альбо, ня маючы магчымасьці зразумець праўды, лучацца да якога-колечы кірунку ды спачуваюць тым альбо іншым нападкам. Гэта цешыць палітыкаў, але гэта найбольш сумны факт, бо іменна гэта адбітак тэй шкадлівасьці, якую прычыняе беларусам недарэчная полеміка.

Зацікавіць народ, гэтак сама як зацікавіць дзяцей, вельмі лёгка, але толькі пытаньне ў тым, ці гэтае пытаньне адпавядае разумнаму мэтоду разумнага ўзгадаваньня і адукаваньня. П'яная бойка на вуліцы таксама цікавіць дзяцей, але ніводзін пэдагог пэўне ня лічыць гэтага лекцыяй ўзгадаваньня.

Дзейнасьць на ніве народнай асьветы і народнага ўзгадаваньня павінна заўсёды адпавядаць пэдагогічным мэтодам, бо інакш наша дзеяльнасьць будзе мець уласьцівасьці тых узгадавальнікаў, якія не ўзгадоўваюць, але дэморалізуюць народ.

Дзеячы народныя, як і пэдагогі, павінны ведаць свае межы. Яны могуць біцца, сварыцца і лаяцца, дзе іх ня бачаць, але ні ў якім разе не павінны рабіць гэтага перад масамі, перад тымі, каго яны ўзгадоўваюць і яшчэ больш не павінны з гэтага рабіць сістэмы ўзгадаваньня.

Праўда, гэта робіцца несьвядома, але ад гэтага не зьмяншаецца, а павялічваецца згубнасьць гэтага зьявішча. Палітычныя кіраўнікі маюць на мэце апраўдаць і замацаваць свае палітычныя лініі, дзеля чаго, не шкадуючы слоў, як мага імкнуцца зьбіць з цьвёрдага пункту свайго праціўніка, ці конкурэнта. Кожны хоча быць правадыром народу, кожны хоча адзін прадстаўляць народную опінію, а між тым больш альбо менш знаходзяцца прыхільнікі розных напрамкаў. За гэта-ж і йдзе полеміка, каб перавярнуць усіх на свой бок, але хіба ж полеміка гэтага ня можа зрабіць. Каб аб'яднаць усе кірункі думкі, усе перакананьні ў адну агульную народную думку палітычнымі падзеламі, але трэба аб'яднаць розныя

кірункі, калі яны ёсьць. А дзеля гэтага ня трэба шукаць лаянкі на праціўніка, ня трэба рабіць падкопаў і нападаў, але трэба шукаць паразуменьня і згоды, у кожным разе трэба мець прыстойнасьць да праўдзівых пераканаьняў. Прыстойнасьць памагае разумець нават тых, хто рашуча разыходзіцца з намі ў паглядах, але калі мы згубім прыстойнасьць, дык для нас не будуць зразумелымі пераканаьні тых, хто згаджаецца з намі агулам, але мае прыватныя разыходжаньні.

Гэтую прыстойнасьць перш-на-перш і трэба было-б унясьці ў беларускую масу, тады кожны кірунак палітычнай або грамадзкай думкі адпавядаў-бы пэдагогічным мэтодам.

Сістэма ўзгадаваньня народу павінна мець у сабе чыстую думку і разумны кірунак. Не павінна быць у ёй нічога, што ня прыносіць карысьці і гэтым робіць шкоду. Мы ведаем, што апроч лаянкі, газэты нашыя займаюцца пераважна палітыкай. У кожным нумары аж нудна чытаць пра тое, што робяць, чаго хочуць і аб чым гутараць Брыяны[1], Штрэзэрманы[2], Чэмбэрлены[3], Чычэрыны[4] і іншыя да падзеяў у Кітаі уключна. Пішацца аб гэтым з такім відам, як быццам усё жыцьцё цэлага чалавецтва толькі тым і трымаецца, што на сьвеце ёсьць Чэмбэрлены і Чычэрыны, ды што ў Кітаі ваюе Чай-Кай-Шэк[5]. Хто не адносіцца да ўсяго гэтага крытычна, той запраўды думае, што няма на сьвеце нічога важнейшага, апроч тых гутарак і інтрыгаў, якія вядуць адны проці адных розныя Чэмбэрлены і Чычэрыны — аўтоматы дзяржаўных машын.

Каб хоць адным словам была высьветлена агіднасьць гэтае аўтоматычнае акцыі дыплёматычных машынаў.

Народ вучыцца верыць у чарадзействы сучасных жрацоў палітыкі, як некалі верыў у чарадзействы жрацоў Мамоны[6] і Молоха[7]. А між тым не адны жрацы палітыкі кіруюць жыцьцём: у сьвеце ёсьць людзі сьветлае думкі і разумнага пачуцьця, якія безупынна твораць новыя і новыя каштоўнасьці культуры, якая ўзгадоўвае людзей і дае магчымасьць ісьці да лепшае будучыны самастойна бяз ніякае чароўнае дапамогі палітычных жрацоў. Аб тым, якія ёсьць, лепшыя людзі на сьвеце, аб тым, што яны думаюць і гавораць, газэты нават не ўспамінаюць, як быццам гэта зусім непатрэбна.

Але-ж хто разумее пэдагогічныя мэтоды ўзгадаваньня народу, той ведае, якую цану для ўзгадаваньня мае гэтае знаёмства, чым і павінны былі-б заняцца газэты.

Усе гэтыя нястачы беларускае прэсы даўно адчуваліся, але цяпер калі нашыя дзеячы самі палезьлі ў палітычныя аўтоматы і, замест таго, каб узбуджаць сьвядомасьць народу, пачалі вясьці на ім палітыку, — нястачы гэтыя адчуваюцца асабліва балюча.

Нацыя і нацыяналізм

Злучэньне ўсіх народаў ў вадну агульную людзкую сям'ю — ёсьць той ідэал, які стаіць аднолькава перад усімі народамі і людзьмі, ды той народ, які не мае перад сабою гэтага ідэала, трэба лічыць адсталым, нават можна сказаць, што народ, які не мае перад сабою гэтага ідэалу — не мае ў сабе нацыянальнае вартасьці; бо чым жа ж вызначаецца вартасьць кожнага народу, як не тымі ідэямі, у зьвязу з якімі народ творыць самога сябе.

Кожная нацыя мае свае пэўныя адзнакі, як і кожны асобны чалавек; і як немагчыма ад чалавечае асобы адабраць ягоных асабліваснцяў, не пазбавіўшы гэтай асобы яе натуральных правоў, гэтак сама немагчыма адабраць ад народу ягоных асабліваснцяў, не пазбавіўшы яго такіх самых правоў. Калі мы адбярэм ад асобнае асобы ейныя правы, дык гэта значыць, што кінем гэтую асобу ў рабства, гэтак сама паніволіваецца кожны народ, ад якога адбіраюць ягоныя натуральныя правы. Сэнс гэтага рабства заключаецца ў тым, што як у асобы з адабранымі, правамі гэтак і ў народу з адабранымі правамі няма магчымасьці служыць пастаўленым мэтам і ідэалам сваімі ўласнымі сіламі, паводле свайго ўласнага разуменьня. Паняволены народ, як паняволеныя асобы, калі нават імкнецца да якіх мэтаў і ідэалаў, дык ён імкнецца чужою воляю, чужою сілаю, і здабывае ў сваім імкненьні цэннасьці жыцьця не сваімі ўласнымі, але чужымі асабліваснцямі.

Хіба ж не можа быць ніякага сумніву ў тым, што гэта ёсьць найвялікшая несправядлівасьць паводле людзкіх, боскіх, навуковых, натуральных і усялякіх іншых разуменьняў. Адабраць ад чалавека ці народа ягоную волю і ягоныя асабліваснці, ды прымусіць яго імкнуцца да здабыткаў і ідэалаў чужою воляю ў развою чужых асабліваснцяў — гэта значыць тое самае, аб чым сказаў Ісус: закопваць скарбы, каб яны не прыносілі карысьці.

Пераконваць некага ў тым, што беларускі народ ёсьць народ — не разнавіднасьць якога інакшага народа — дзеля гэтага хіба што зусім бязсэнсоўна. Гэтак гаварыць таксама сьмешна, як сьмешна было б гаварыць, што пэўная асоба ёсьць інакшая ад іншых людзей дзеля таго, што мае свае

вочы, свае вушы, свой нос, свае ўражэньні і г.д. Гэткія і падобныя гутаркі ў канцы канцоў зводзяцца проста да гэткага перакананьня, што: асоба ёсьць асоба дзеля таго, што яна асоба, а народ ёсьць народ дзеля таго, што ён народ. І ведама ж, што гэткімі гутаркамі немагчыма пераканаць не толькі нікога, але і самога сябе. Калі мы прыходзім да сьвядомасьці, што беларускі народ ёсьць народ, дык не трэба гэтага даказваць тым, што ён мае вось гэткія і гэткія асаблівасьці, але трэба з дапамогай гэтых асаблівасьцяў здабываць той ідэал, што стаіць перад усімі народамі.

Кожная асоба мае разуменьне, каб імкнуцца да таго, што яна лічыць разумным, кожная мае сілу — каб рабіць тое, што яна лічыць справядлівым, і кожная мае свае асаблівасьці духоўных і разумных задаткаў у развіцьці якіх вынікаюць здабыткі, творачыя сусьветныя цэннасьці, якія дапамагаюць разьвіцьцю ўсіх народаў, ды пранікаючы ў душу іншых народаў, робяць іх больш блізкімі і роднымі адны адным. І гэткім чынам ён прыблізіцца да таго ідэалу, які стаіць перад усім чалавецтвам. Калі ж беларускі народ ні пакажа ні свае волі, ні сваіх асаблівасьцяў, ды не выкажа ніякіх здабыткаў перад іншымі народамі, тады ён не будзе мець тэй цэмантнай сілы, якая скрапляе ўсе народы ў вадну агульную сям'ю, у гэтакім выпадку ён альбо зусім не будзе мець магчымасьці ўвайсьці ў супольную людзкую сям'ю, альбо ўвойдзе ў яе як разнавіднасьць якога іншага народу, і запраўды не будзе мець у сабе ніякіх нацыянальных асаблівасьцяў.

Цяпер нам ясна, ў чым хаваецца тая жыцьцёвая праўда, якой абварункавана існаваньне кожнага народу, якая робіць гэтае існаваньне проста неабходным дзеля таго, што яна з'яўляецца падставай злучэньня ўсіх народаў: народ ёсьць народ затым, што мае волю, сілу і асаблівасьці, якімі творыць сусьветныя цэннасьці, што дапамагаюць злучэньню ўсіх народаў у агульную людзкую сям'ю, дзеля гэтага свабоднае разьвіцьцё кожнага народу ў мэтах аб'яднаньня народу гэтак сама неабходнае, як неабходна было скасаваньне рабства для збліжэньня людзкіх асобаў. Пакуль было рабства, быў пан і раб, і гэтая граніца раз'ядноўвала грамадзян няроўнасьцю, што рабіла немагчымым збліжэньне чалавека з чалавекам, г[эта] з[начыць], рабіла немагчымым братэрства людзей. Гэтак сама паняволеньне адным народам другога народу будзе непраходнаю перашкодаю ў справе аб'яднаньня

ў адну людзкую сям'ю, бо пакуль будзе адзін народ выказваць свае цэннасьці, а другі не будзе мець магчымасьці выказаць іх, да таго часу будзе тая няроўнасьць, якая ляжа прорвай між народамі.

Гэтым тлумачыцца тое, чаму народы, ідучы па шляху аб'яднаньня ў вадну сям'ю, стараюцца быць культурна і нацыянальна самастойнымі. З першага погляду здаецца, што гэта яшчэ больш раз'яднае людзей, але такая думка будзе вялікаю памылкаю, бо безварунковая самастойнасьць кожнага народа з'яўляецца варункам усенароднага аб'яднаньня: народы могуць аб'яднацца на падставе роўнасьці, а пакуль не будзе між імі роўнасьці, да таго часу будзе між імі прорва, якая недапусьціць ніякага аб'яднаньня.

Гэтая прорва ёсьць нацыяналізм.

Дык трэба цяпер высьветліць гэтую атруту, што часта хаваецца за нацыянальнай сьвядомасьцю і робіць немагчымым збліжэньне народаў. Нацыянальную сьвядомасць, якая высьветлена вышэй, і якая без ніякага сумніву з'яўляецца патрэбнай, трэба рашуча адрозьніць ад нацыяналізму, які з'яўляецца як раз атрутай, што хаваецца ў думках тых элементаў, якія не усьведамляюць сабе істоты нацыянальнасьці. Гэтыя элементы, зразумеўшы павярхоўна тое, што народ мае свае асаблівыя адметнасці, чамусьці не з таго не з сяго ўваабражаюць, што гэтыя нацыянальныя асаблівасці ёсьць нешта вельмі добрае. Ствараецца такім чынам хваравіты нацыянальны гонар, і трэба толькі прыглядзецца да нацыяналізму ўсіх нацыянальнасцяў, каб убачыць дзіўныя прычыны такога гонару. Нават адмоўныя асаблівасці нацыянальнасці бываюць прычынай гонару; дзеля гэтага не дзіва, што калі чалавек мае чым ганарыцца, дык ён лічыць вялікім шчасцем прыналежнасць да даннай нацыянальнасьці: "Кажуць, сам бог узлюбіў мяне, калі радзіў мяне гэткім, а не інакшым." І яшчэ да немаведама якіх абсурдаў даходзіць нацыянальная пыха заўзятага нацыяналізму. Ясна само сабою, што гэтая нацыянальная пыха з пагардай узіраецца на іншыя народы альбо ненавідзіць іх, у кожным разе нацыяналізм замыкае чалавека ў цеснае кола уласнае нацыі, г[эта] з[начыць] ствараецца гэткі стан, што збліжэньне народу з народам робіцца немагчымым.

І вось, калі вышэй мы бачылі, што нармальнае нацыянальнае разьвіццё дапамагае збліжэньню народаў, дык на-

цыяналістычнае раз'яднанье народаў сьведчыць аб адваротным — іменна што нацыяналізм недапушчае разьвіцьця нацыянальных задаткаў сусьветнага значэньня. Нацыяналізм толькі ганарыцца тым, што ён не дапушчае разьвіцьця. Гэта зноў ёсьць нішто іншае, як закапваньне скарбаў у землю, бо нацыяналізм скарбы жыцьця, калі яны не ідуць на ўзбагачэньне сусьветнага жыцьця, — робіцца скарбам не выкарыстаным. Скарб, які не выкарыстоўваецца безумоўна, — бескарысны.

Дык якая ж сіла застаўляе народ, не паняволены другім народам, захоўваць бескарысна свой скарб? Ці іначай кажучы, якая сіла паняволівае вольны народ, бо толькі паняволеньне не дапушчае народу разьвіваць свае асаблівасьці?

Сіла гэтая ёсьць цемра, якая нават у адукаваных народаў часта выдзеляецца чорнай плямаю, засланяючаю ўсю іхнюю культуру; каб не дзікі нацыяналізм, дык сусветныя здабыткі нацыі перадаваліся б іншым народам, і народы між сабою збліжаліся б, але нацыяналізм з дапамогай свае культуры хоча праглынуць іншыя народы, дык гэтыя народы, захоўваючы сваю волю, часта бываюць прымушаны адхіляць і тое добрае, што ёсьць у ваяўнічай нацыі, у кожным разе зьбліжэньне народу робіцца нармальна немагчымым, а дзе немагчымае нармальнае, там немагчымае поўнае зразуменьне адным другога, там немагчыма нармальнае разьвіцьцё міжнароднага жыцьця.

Дык той ідэал, што стаіць у міжнародным жыцьці і да якога вядзе нармальнае нацыянальнае самаузгадаваньне, робіцца недасяжным з прычыны дзікага нацыяналізму народаў, які забівае ў корне зьбліжэньне і творыць культуры для самога сябе, бо для іншых ён яе тварыць не можа. Ён хоча даць сваю культуру іншым пад варункам паняволеньня, не разумеючы таго, што адзіным варункам перадачы ўсех думак-пачуцьцяў і здабыткаў ёсьць узаемнае зразуменьне.

Калі ўсе народы зразумеюць адзін аднаго, тагды ўсе яны будуць адною людзкаю сям'ёю, а для гэтага трэба, каб кожны народ выявіў тое, што ён мае ў сабе жывое, разумнае, і адкінуць дзікае жаданьне паняволеньнем другіх, заставіць іх зразумець сябе і зьліцца

Аб чым пішуць газэты

Нехта некалі сказаў, што гісторыя — гэта казка аб царох і заваявальніках; адпаведна гэтаму можна сказаць, што газэты — гэта плёткі аб дыплёматах і міністрах, ды аб іншых агідах, якія дзеюцца ў сьвеце, і якія дзеюцца дзеля таго, што сьвет не цікавіцца нічым больш глубокім і сэнсоўным, апрача безглуздых плётак.

Дзе пануюць бабскія плёткі, якія шопатам переходзяць ад аднэй да другой, там не можа быць зразумелай ніякая здаровая творчая думка, што падыймае чалавека ад жыцьцёвага балота ды паказвая шлях да лепшага жыцьця. Газэты розьняцца ад бабскіх плётак толькі тым, што яны не шэпчуць, але крычаць на ўвесь сьвет аб тых агідах, якія дзеюцца на сьвеце; крычаць зусім не дзеля таго, каб паказаць, што агіда ёсьць агіда, а выключна дзеля таго, каб зацікавіць гэтым публіку — як раз таксама як плёткі. І калі плёткі асабліва цікавыя тым, што яны перадаюцца шопатам, як нешта таемнае, як нейкае адкравеньне, дык газэтная пісаніна цікавая тым, што яна — крыклівая, пахабная, дзеля чаго можна падумаць, што яна — надзвычайна важная. Але трэба ведаць, што разумная творчая думка не можа быць ня таемнай, ня пахабнай, але спакойнай і цьвёрдай...

І на Беларусі цяпер газэтная пісаніна вельмі шырыцца... Але аб чым-жа пішуць беларускія газэты? Ды ўсе аб тыхжа дыпляматах і міністрах Англіі, Францыі, ССРР., Японіі, Амерыкі, Італіі і аб Кітаі, дзе для інтэрэсаў гэтых міністраў прыносіцца ў ахвяру па 8000 чалавек зараз. Але вось праз увесь час вельмі рэдка або зусім не успамінаецца ў газэтах аб Данії, Швэцыі, Галяндыі і іншых краёх, якія не вядуць сусьветнай, г[эта] з[начыць], імпэрыялістычнай палітыкі, але жывуць сваім уласным, унутраным жыцьцём, якое не надаецца для плётак. І вось для беларусаў якраз можа карысна было б пазнаёміцца з унутраным жыцьцём гэтых краёў, бо і Беларусь не можа вясьці імпэрыялістычнай палітыкі, і можа тагды — калі беларусы скарысталі б з добрых прыкладаў гэтых старонак — было б інакшым наша грамадзкае жыцьцё; бо, трэба сьцьвярдзіць, што плёткі аб імпэрыялістах вельмі дрэнны робяць уплыў на наша грамадзкае жыцьцё, як і

наогул усялякія іншыя плёткі. Хто цікавіцца плёткамі, той дэмаралізуецца імі; і нам ня трэба прыкладаў гэтай дэмаралізацыі, бо мы залішне многа бачылі іх, але варта зьвярнуць увагу на тое, што гэтыя плёткі ніскольксі не спрыяюць прабуджэньню вольнага духу ў беларускім народзе, калі не лічыць гэткім безсільнага абурэньня. Але і абуранымі нявольнікамі можна валодаць... Не можна валодаць толькі вольным чалавекам, нават і неабураным, калі яго не могуць закаваць ніякія ланцугі і вастрогі.

Зьвернемся да ўнутранага жыцьця беларусаў: ці-ж зроблена тут што, каб падняць стан масаў? Скажуць пэўна, што зроблена, бо была 100,000-ная "грамада", якой прысуджана жыць яшчэ 12 гадоў, бо ёсьць сельсаюзы[1] і хадэкі[2], і сельпартыі[3], і шмат іншых палітычных і непалітычных арганізацыяў... Але чым-жа-ж яны займаюцца?... Найбольш грызьнёю... І з гэтага відаць, што той рух, як яго называюць, зусім не сьведчыць аб нейкім уздыме вольнага духу ў беларускіх масах, але хіба толькі аб тым, што "плеткарская палітыка" прымусіла шмат каго арганізавацца, каб арганізованна праводзіць тую самую руйнуючую дэмаралізацыю, невольніцкую работу. Бо аб чым жа ж сварацца нашыя палітыкі? А найбольш аб тым, хто мае вызваліць беларусаў: ці Масква, ці Варшава, ці яны самы могуць вызваліцца? Прыглядаючыся да гэтых сваркаў, адразу відаць, што гэтае пытаньне ёсьць толькі прыклёп для сварак, бо аб вызваленьні ўласна не можа быць і рэчы, калі дух народу прыгнетаецца безглуздымі сваркамі аб вызваленьні. Хіба што дурню можа быць ясна, што да вызваленьня вядзе не сварка аб ім, тут і сварыцца няма аб чым, — але разумная работа дзеля яго, прабуджаючая ў народзе сьвядомасьць волі. Прыгледаючыся да стану унутранага жыцьця, становіцца зразумелым тое, у чым сіла неволі; і хто захоча перамагчы гэту страшную сілу, той убачыць, што вызваленьне не можа быць прычынай сваркаў і раз'яднаньня, але, наадварот, прычынай аб'яднаньня і згоды. Унутранае жыцьцё нашага народу церпіць ад спадкаў няволі: ад сваркаў, ад бойкаў, ад плёткаў, што ствараюць асабліва нявольніцкі стан, які відаць часткова ў тым, што наша моладзь не можа вылезьці с спрадвечнага балота сваркаў, і бойкаў, і плёткаў, бо ўсімі сіламі цягнецца за хвастом буржуазных звычаяў і модаў. Горка глядзець на тое, якія высілкі пакладае наша моладзь дзеля таго, каб капіраваццa з

буржуяў, каб мець гэткія самыя лякеркі і касьцюмы; альбо буржуі носяць іх мо затым, што мужыкі капіруюцца з іх. Калі правадыр Індусаў Ганді[4] абвясьціў барацьбу за незалежнасьць Індыі, дык адным з ягоных лёзунгаў было: нацыянальная вопратка, каб гэткім чынам зрабіць байкот ангельскім таварам. І вынікі гэтага былі красамоўныя, бо ангельцы адразу пацярпелі значныя страты. Нашыя "правадыры" нешта да гэтага не могуць дадумацца, бо каб яны і хацелі, дык не могуць зрабіць гэтага. Ды не столькі важна тое, каб зрабіць байкот гандлю, як тое, каб выгнаць той нявольніцкі дух, які прымушае пераймаць звычаі і моды з першага горшага, каго спаткаюць на дарозе. І гэткім вось парадкам да гэтага часу перадаюцца ад пакаленьня да пакаленьня нявольніцкія звычаі, якія забіваюць усялякую разумную думку, усялякі вольны ўзлёт духа. І на гэтым грунце вельмі хутка растуць плёны розных безглуздых "ідэй", характэрнай рысай каторых ёсьць сварка і плётка.

А дзе каапэрацыя, якая таксама магла-б падарваць эканамічную залежнасьць ад крамнікаў? Дзе пляновая арганізацыя грамадзкай самапомачы, якая дала-б магчымасьць селяніну не зьвяртацца за кожным разам да ліхвяроў, што цягнуць з яго грошы і кроў? Аб гэтым нават нема і думкі, ды пануе перакананьне, што ў гэтым напрамку нічога не можна зрабіць. І не дзіва... Было-б дзівам, каб пры гэткім стане рэчаў можна было нешта рабіць, калі і арганізуюцца ўсе для таго, каб адвечнае балота вынесьці на паверх жыцьця, калі газэты усе высілкі пакладаюць дзеля таго, каб з гразных спраў і плётак зрабіць велькую справу.

Хто сьвядомы чалавек

Папулярныя ў свой час “Справы” ды “Працы”[1] вельмі шмат пісалі аб сьвядомасьці беларускага сялянства, якое чытала гэтыя газэты. І можна было падумаць, што нашая сялянства вельмі сьвядомае, калі чытае газэты, але вось іншыя газэты, як “Крыніца” альбо “Сял[янская] Ніва”[2] таксама шмат пішуць аб сьвядомасьці сялянства, але толькі таго, каторае чытае іхнія газэты. Калі ж мы цяпер пойдзем разбірацца далей і глыбей, дык знойдзем вельмі многа сьвядомых людзей: тыя, якія не чытаюць нічога, апрача кантычак, лічаць, што яны вельмі сьвядомыя, бо ня чытаюць іншага, апрача кантычак: тыя, якія чытаюць біблію, лічаць сябе сьвядомымі затым, што яны не чытаюць нічога іншага, апрача бібліі; тыя, якія ходзяць да царквы, лічаць сябе вельмі сьвядомымі за тое, што яны ходзяць да царквы. Гэткіх прыкладаў можна налічыць столькі, сколькі ёсьць на сьвеце сэкт царкоўных, палітычных і ўсялякіх іншых, бо ўсе яны вельмі проста даказваюць сьвядомасьць сваіх стараннікаў: калі хто верыць даннай сэкце, дык той мае дыплём сьвядомасьці. Але вось: не будучы стараннікам няводнае з іх, я пытаю сябе: хтож запраўды сьвядомы чалавек? І як пазнаць сьвядомага чалавека?

Пытаньня вельмі труднае, але матар’ялу ў нас пад рукамі вельмі многа, дык з яго можна лёгка зрабіць агульны вывад. Перш-на-перш спытаем сябе, чаму, напр[ыклад], тыя, якія чыталі “Справы” ды “Працы”, лічылі сьвядомымі сябе, а не тых, якія чытаюць другія газэты? Адказ просты: за тое, што яны чыталі імянна гэтыя газэты, а не якія іншыя; але і іншыя адказваюць акурат так сама, дык у нас цяпер паўстае пытаньне: ці можа гэта быць доказам сьвядомасьці? Напэўна не, бо калі прызнаць праўдзівым гэты доказ, дык стараннікаў усех гэтых сэктаў, як царкоўных так і палітычных, трэба лічыць сьвядомымі, але калі сьвядомасьць, якую яны маюць, не можа давясьці іх да згоды, і кожны лічыць сьвядомым выключна толькі сябе, дык значa ўсе яны несьвядомыя; і несьвядомыя яны перш-на-перш дзеля таго, што лічаць сябе выключна сьвядомымі, не бачачы, што другія адносна сябе думаюць як раз гэтак сама. Як мы бачым, дык усе яны маюць аднолькавыя думкі адносна сваёй сьвядомасьці, і ўсе яны

аднолькава не разумеюць адзін аднаго, бо кожны лічыць сябе сьвядомейшым за другога. Але калі ў кожнага з іх не хапае розуму на тое, каб зразумець адзін аднаго, дык напэўна усе яны несьвядомыя, бо сьвядомы чалавек безумоўна зразумее другога чалавека, якіх бы пераконаньняў ён не быў.

Адкуль жа ж у людзей гэтакая несьвядомасць? Як сказана вышэй, толькі ад таго, што яны лічаць сябе сьвядомымі, бо яны лічаць сябе сьвядомымі настолькі, што не могуць бачыць за гэтым сваёй несьвядомасьці. Лічачы сябе сьвядомымі, яны ніколі не могуць падумаць, што яны ў чым небудзь несьвядомыя, яны ніколі не могуць падумаць, што яны ў чым небудзь могуць памыліцца. І вось з гэтага пачынаецца трагэдыя несьвядомасьці, бо чалавек, пераканаўшыся ў сваей сьвядомасьці, робіцца надзвычайна самапэўным, ён не дапушчае таго, што ён можа чаго не ведае, што можа ў чым памыліцца, а дзеля гэтага не аб чым не думаючы ён усё ведае і не аб чым не дбаючы чыніць "суд і расправу". І гэта ёсьць найпрасьцейшая дарога да усялякіх памылак, якіх ён, аднак, ніколі не лічыць памылкамі, бо ён загадзя ведае, што ён не памыліцца. Дык вось дзеля гэтага самага ўсе сэктанты, як царкоўныя, так і палітычныя лічаць сябе сьвядомымі, і дзеля гэтага ўсе яны несьвядомыя.

Дык хто-ж сьвядомы чалавек?

Ведаючы, ад чаго людзі несьвядомыя, мы можам зразумець, што дае ім сьвядомасьць.

Перш-на-перш сьвядомы чалавек ведае, што ён чалавек, значыцца, кожны чалавек, як чалавек, можа памыляцца, і дзеля таго, каб не памыліцца, ён павінен заўсягды імкнуцца да знаньня, г[эта] з[начыць], павінен мець рухлівы розум; і такі чалавек ніколі не скажа сабе, што я ведаю ўсё, бо я нічога не хачу ведаць апрача таго, што ведаю.

Аднак гэта яшчэ не ўсё: галоўнае, калі чалавек можа мыляцца, дык трэба, каб ён меў адвагу сам зразумець сваю памылку, і перш, чым хто яму пакажа яе, каб ён сам паказаў яе другім, г[эта] з[начыць], чалавек не павінен лічыць сябе сьвядомым настолькі, каб праз сваю "сьвядомасьць" не бачыць сваіх памылкаў; чалавек павінен быць сьвядомым так, каб яго сьвядомасьць паказвала яму яго памылкі.

Звычайна ж бывае так, што калі чалавек лічыць сябе [сьвядомым], дык нічога не хоча ведаць, а дзеля гэтага памыляецца на кожным кроку. Па большай часьці ён і сам не

бачыць сваіх памылкаў, але калі часам заўважыць сваю памылку, ці хто іншы пакажа яму яе, дык ён звычайна не хоча лічыцца з гэтым, бо як жа ж, каб сьвядомы чалавек дык памыліўся. Адгэтуль дык пачынаецца самая страшная трагэдыя несьвядомасьці. Не лічачыся с сваім памылкамі, гэткія людзі усялякім спосабам стараюцца апраўдаць іх, а дзеля таго, што памылка не можа быць не памылкаю, дык яны апраўдваюць сябе ілжой. Яны лгуць другім, але перш-наперш самыя сабе, бо ім ходзіць аб тое, каб запэўніць сябе ў сваёй неамыльнай сьвядомасьці. Вось гэтая ілжа і ёсьць тая цемра, пра якую сказана ў Эвангельлі, што "хто ходзіць у цемры, той не ведае, куды ідзе", гэтая ілжа ёсьць найвялікшая хіба чалавека — боязьнь праўды. Калі чалавек баіцца праўды, дык ці ж можа ён нешта рабіць? Калі можа, дык толькі тое, што ілжывае: тое, што ён ведае — ілжа, і тое, што ён робіць — ілжа, а дзеля гэтага ніколі нічога не выйдзе з таго, што ён робіць. У гэткім разе ён ізноў мае гатовае апраўданьне, ён вінаваціць не сябе, а усялякія іншыя перашкоды. Вось гэта дык сьвядомы чалавек баіцца як агня, бо праўдзівай справе нема перашкодаў, дык калі з таго, што ты робіш, нічога не выходзіць, значыць, ты робіш не тое, што трэба. А дзеля гэтага, як сьвядомы чалавек, ты павінен застанавіцца і паправіць сваю памылку, бо лепей пачаць усё спачатку, чым даканчваць тое, што нічога не варта. Дык вось, хто не лічыць сябе неамыльна сьвядомым, хто заўсёды сам пільнуе сваіх памылкаў, хто ніколі не вінаваціць нікога, апрача самога сябе ў сваіх незадачах, хто мае адвагу ніколі не лгаць, каб утрымаць тое, што трэба зьнішчыць — таго можна лічыць сьвядомым чалавекам.

Да “правадыроў” беларускага народу[1]

Я пішу гэтыя некалькі слоў горкай праўды аб беларускай запраўднасьці не затым, што я сумняваюся ў Вашай ідэйнасьці, не затым што лічу Вас самазванымі, а не запраўднымі правадырамі беларускага народу, а іменна затым, што народ верыць Вам, бо толькі з гэтага, а не з чаго іншага вынікае тое вялікае зло, якое Вы несьвядома сееце паміж нашага народу, бо найбольш шкодзяць народу тыя, якіх народ лічыць сваімі ідэаламі, якім ён сьлепа верыць, іменна дзеля таго, што ён лічыць іх ідэаламі і іменна дзеля таго, што ён сьлепа ім верыць, бо гэтым паніжаецца сьвядомасьць масаў да звычайнага фанатызму. Гэткі закон запраўднасьці, дзеля гэтага сьвядомыя правадыры народаў перш-на-перш стараюцца ўнікнуць гэтае акалічнасьці як агня.

І ні што іншае, як толькі гэтае, найбольш шкодзіць прабуджэньню сьвядомасьці беларускага народу. Ніякі уціск уладаў і ніякія “здраднікі” беларускага руху не шкодзяць гэтулькі, колькі шкодзяць тыя, якія дзякуючы сваёй шчырасьці, дзякуючы сваёй ідэйнасьці вядуць да канца сваго згубную справу, бо не тое зло, на якое можна паказаць пальцам, але толькі тое, — чаго ніхто не бачыць і не разумее; не той шкодзіць народу, які сам разумее, што ягоная справа ілжывая, але толькі той, хто гэта робіць з запалам ідэйнасьці і шчырасьці.

Як бачым, адное ідэйнасьці і шчырасьці вельмі мала дзеля таго, каб быць правадыром народу. Праўдзівым правадыром народу можа быць толькі той, хто ў сваім сэрцы адчувае біцьце сэрца цэлага народу, хто ўмее стрымліваць страсьці і гвалтоўнасьці несьвядомых масаў, хто нясе адказнасьць за ўсе, нават несьвядомыя чыны народу; але хто гэтага не ведае і “служыць” народнаму руху тымі ідэямі, якія ён запазычыў ў дактрынараў-палітыкаў, карыстаючыся страсьцямі масаў дзеля сваіх палітычных мэтаў, — дык ці ж можа той быць правадыром народу, ці ж можа ён быць ягоным прарокам ?

Адно, што зрабілі “правадыры” нашага народу, і што Вы цяпер робіце у далейшым цягу — гэта нейкія недарэчная фікцыя сялянска-работніцкай еднасьці, адчуваная па шабло-

ну розных сацыялізмаў і марксізмаў з рознымі бязсэнсоўнымі клічамі як "сялянска-работніцкі урад" — сялянска-работніцкая еднасьць і г.д. Мы чулі розныя ўсхваленьні гэтай ідэлёгіі, толькі ніхто не сказаў нам, дзе яна вырасла? З чаго яна створана? Яна вырасла з сацыялізму, створанага работніцкім рухам заходняе Эўропы, і створана з матэр'ялаў, сфабрыкованых машынамі партыйнае палітыкі; і гэты вось вытвар прынесены на грунт народу бадай выключна сялянскага, зусім не знаемага ні с сацыялізмамі, ня з палітыкамі і нават мала знаёмага з самым сабою і прадзначаны дзеля таго, каб вясьці яго да лепшае будучыні. Але ж, ціж не выглядае гэта на пародыю!

І якія з гэтага вынікі?

Вы пэўныя, што гэтая пародыя прабудзіла сьвядомасьць нашага народу, бо Вы бачылі рух, які яна ўзьняла, Вы бачылі, што масы паверылі правадырам і пайшлі за імі, але ці адчувалі пры гэтым правадыры, чым б'ецца сэрца народу, ці разумелі яны тое, што пхае народ, галоўным чынам несьвядомую моладзь на гэты шлях? Я пэўны, што "правадыры" гэтага не разумелі і не разумеюць, не бачылі і не бачаць, бо ім ходзіць зусім не аб тое; ім ходзіць аб тое, каб народ ім верыў і яны думаюць, што калі народ будзе верны, дык яны яго жыўцом завядуць у сацыялістычны рай!

Але я пакажу Вам другі бок мэдалі.

Вы крычыце несьвядомаму народу аб уціску капіталу, аб бязпраўі, якое чыніцца над працоўным народам і г.д. і г.д. І што-ж найбольш зразумеў народ з гэтае Вашае агітацыі, галоўным чынам, як сказана, несьвядомая моладзь? А вось што: несьвядомая масса гэтае моладзі зразумела, што буржуазны ўціск прымушае яе цягнуць сялянскае ярмо, тады калі яна, гэтая моладзь, магла б аддаць свае сілы болей пачэснай і вялікай народнай справе. Толькі буржуазны ўціск прымушае іх цягнуць сялянскае ярмо, але сялянска-работніцкіх урад дасьць ім нешта лепшае. І вось гэтыя "гэныі" лічаць, што гэты ўрад — гэта будзе іхні ўрад; гэта яны будуць правіць усім, будуць камісарамі, чакістамі, нават звычайнымі катамі, але не будуць толькі цягнуць ужо сялянскага ярма. На сьцене у Гродзенскім арэшце я прачытаў адбітак гэтае маніі. Нейкі гэній-палітык, які не патрапіў злажыць фразы з некалькіх слоў, нацарапаў нешта безглуздае, безграматнае, сэнс чаго такі: калі вы бьеце нас, дык мы вам у сто раз зробім тое самае.

Гэта ёсьць тое, што Вы прадстаўляеце сабе як рэвалюцыйны настрой беларускае вёскі, і што ў сутнасьці зьяўляецца маніяй улады: — нешта недарэчнае, нешта безглуздае, нешта дзікае, нешта хваравітае, нешта гумарыстычнае, каб не было яно гэта жудасна сумна.

Не разумеючы гэтага ўсялякія высілкі ў змаганьні зь сілаю, на якой мы грунтуемся, будуць мець вынікі падобныя здарэньню зь Сьвятагорам. Дзеля таго што ў змаганьні з п'янствам гэтыя здарэньні паўтараюцца, бадай, з усімі барацьбітамі цьвярозасьці, нам трэба ўрэшце ўцяміць тое, што п'янства ёсьць не той цяжкі і ганебны стан, у якім знаходзіцца чалавек ужываючы гарэлку, але п'янства ёсьць падстава **сьветапагляду** ці лепш кажучы **сьветабезпагляду**, якая вядзе чалавека безупынна, як загіпнатызаванага, па тым шляху, на якім ён добра бачыць і разумее яўную згубу і адчувае паніжэньне свае чалавечае годнасьці і нягледзячы на гэтае ня можа стрымацца.

П'янства адбірае ад чалавека волю, тое галоўнае, што кіруе жыцьцем чалавека, дзеля гэтага чалавек аддаючыся п'янству, астаецца жыць без кіраўніцтва ці, лепш кажучы, кіруецца **п'янствам**. Дык ці ж дзіва, што чалавек кіруючыся п'янствам, ня можа стрымацца каб не паддавацца ягонай сіле, і ці ж не дзіўна што барацьбіты цьвярозасьці хочуць **перамагчы** кіраўнічую сілу безпрынцыпнага, разьбітага п'янствам, жыцьця чалавека, нейкімі пекнымі разважаньнямі аб тым, што лепш не піць, што гэта карысьней і лепей для здароўя чалавека. Гэтыя пекныя разважаньні і пераканаьні разам з пекнаю радаю не піць не маюць ніякага ўплыву на чалавека, бо гэта ён сам без радаў і без тлумачэньняў разумее, але не можа зьдзейсьніць, бо каб здзейсьніць іх **трэба мець сілу волі**, аб якой не спамінаюць чысьленныя барацьбіты цьвярозасьці. Яны лічаць што ў гэтым выпадку можна чалавека пераканаць, і пераканаьне перамеціць ягонае жаданьне ды пакіруе чалавека на іншую дарогу, але не бачаць,

што п'янства адбіраючы ад чалавека сілу волі робіць немагчымымі ніякія ўплывы пераканаьня на волю чалавека, бо няма сілы волі ў чалавека, а ёсьць **адна** толькі сіла — сіла п'янага стану, а на гэтую сілу пераканаьне не патрапіць мець ніякага ўплыву. Гэтая сіла перамагаецца не ўплывамі жаданьняў, а станоўчаю **сілай волі**, якую чалавек можа ўзгадаваць у сабе і якую ён узгадаваць павінен, каб быць чалавекам, г. зн. разумнаю самастойнаю істотаю, а не папіхачом якогась згубнага нахілу, накшталт п'янства. Бо што падпарадкуе чалавека п'янству? Адсутнасьць сілы волі. Гэта адна толькі прычына п'янства, і да таго ж нікім сур'ёзна не заўважаная. У барацьбе з п'янствам стараюцца пераканаць чалавека ў шкоднасьці п'янства, але ніхто не паможа яму, ніхто не пакажа яму тэй сілы, якая змагла б перамагчы ягоны п'яны пахіл.

Калі ёсьць людзі, якія сур'ёзна бароняць ужываньне гарэлкі і даказваюць, што "ў меру" ўжываць яе не шкодна, дык ці ж магчыма даказаць ім нешта адваротнае. Калі чалавек гатак гаворыць і гэтак думае, дык немагчыма пераканаць яго думаць інакш, бо гэтая думка **не свабодна** з'яўляецца ў яго, але паўстае з жаданьня **апраўдаць** сваё ўжываньне гарэлкі. У гэтым выпадку гаворыць не розум чалавека, не шчырае пераканаьне, а адно нешчырае жаданьне абараніць сябе, абяліць сябе ў сваіх уласных і ў чужых вачох. Калі чалавек няшчыра думае і няшчыра гаворыць, дык яго не пераканаеш, бо шчыры п'яніца сам добра ведае згубнасьць п'янства, аднак п'е бо не можа стрымацца і **не хоча апраўдвацца**.

Дзеля гэтага пекныя словы барацьбы з п'янствам ёсьць бессэнсоўнай гутаркай дзеля таго, што яна нікога не пераконывае: ні тых, якія добра ведаюць шкоднасьць п'янства, але п'юць, бо не могуць стрымацца, ні тых, што ўжываюць гарэлку, не маючы згубнага нахілу да яе, але ўва імя таго, што яна карысная. Пераканаць іх у нечым адваротным няма магчымасьці, ніякімі прыкладамі, ніякай статыстыкай, бо яны кажуць што толькі п'янства шкоднае, а ўжываньне гарэлкі "ў меру" не толькі не шкоднае, але нават карыснае. І гэта зусім праўдападобна, бо чалавеку заўсягды бывае карысным тое, чаго ён жадае, дзеля чаго спрачацца з чалавекам у гэтым выпадку, даказваючы адваротнае, ніяк не магчыма, не пераносячы справы на такі грунт, на якім карыснае і некарыснае

не маюць ніякага сэнсу і над чалавечым розумам пануе думка аб тым, **што павінна быць**.

Разважаньні аб карысным і некарысным гэта ёсьць дзяцінныя разважаньні, у якіх ніяк немагчыма знайсьці лягічнай пасьледавальнасьці дзеля тых самых прычын, аб якіх было гаворана, што карысным і некарысным бывае толькі тое, чаго чалавек хоча альбо не хоча. Але ў чалавека **павінна быць** сіла, якая кіруе ўсімі жаданьнямі — гэта **сіла волі**, без якой чалавек не можа называцца чалавекам дзеля таго, што ён не будзе **самастойнаю істотаю**.

Калі ў чалавека ёсьць гэтая сіла волі, якая вядзе яго к таму, што павінна быць ад таго, што павінна быць, тагды ўсе думкі і жаданьні чалавека становяцца на простай лініі пасьледавальнасьці, прычым карыснае і бескарыснае ў гэтым выпадку губляюць сваё кіраўнічае значэньне, таксама як губляюць сваё кіраўнічае значэньне магчымае і немагчымае, думка аб чым мае такую страшную сілу над людзьмі слабымі воляй. Чалавеку ўласьціва імкнуцца і да немагчымага, калі ён лічыць, што яму павінна імкнуцца да яго, ды калі чалавек пачуе ў сабе сілу волі — сілу павіннасьці, тагды разважаньні аб магчымым і немагчымым адпадаюць дзеля таго, што чалавеку, які адчувае ў сабе гэтую сілу, — няма немагчымага. Немагчыма для чалавека толькі тое, чаго ён не хоча, а калі над жаданьнем чалавека стаіць сталёвая сіла волі ў сьвядомасьці доўгу, дык усе магчымасьці і немагчымасьці становяцца на адну простую лінію, па якой ідзе чалавек.

Якая ж ёсьць простая лінія па якой чалавек і ўсё чалавецтва ідзе і йдзе спакон вякоў?

Чалавек таксама як і чалавецтва безупынна ідзе і йдзе да нечага лепшага, а да чаго іменна гэтага нельга точна абазначыць, затым што адносна гэтага пытаньня ёсьць шмат розных заключэньняў. Аграмадная большасьць рашае, што чалавек імкнецца да шчасьця, і з гэтым можна было б згадзіцца, каб шчасьце людзкае мерылася адной меркай, але бяда ў тым, што мераю шчасьця з'яўляецца людзкае жаданьне, значыць, ёсьць на сьвеце столькі меркаў шчасьця, колькі ёсьць на сьвеце людзей, альбо розных груп чалавецтва, бо ўсе людзі падзелены на некалькі групаў, з якіх кожная мае аднолькавыя паняцьці і жаданьні.

Дык вось нельга згадзіцца з тым, што людзі імкнуцца да шчасьця, бо шчасьцем для чалавека бывае тое, чаго ён хоча, а

жаданьні ў людзей маюць вялікую розьніцу між сабой, значыць ёсьць вялікая розьніца між рознымі паняцьцямі аб шчасьці, напрыклад, адзін хоча піць гарэлку, а другі не. Значыць, і шчасьце бывае розным. А калі людзі рашаюць, што для іх адна мэта — лепшая доля, — дык яны самы яшчэ не ведаюць добра таго, да чаго яны йдуць, а дзеля гэтага не могуць напэўна сказаць, што вось іх мэта і ёсьць гэткая. І ніколі ніхто не можа сказаць, што мэта людзкая вось гэткая ці інакшая, бо з усяго відаць, што людзі безупынна імкнуцца да зразуменьня: да зразуменьня жыцьця, да зразуменьня праўды і да зразуменьня сваёй мэты.

Зразумець праўду аб усім чыста, што сустракаецца ў жыцьці — вось той ідэал, да якога тым ці інакшым шляхам ідзе чалавецтва, нават тады, калі людзі кажуць, што яны йдуць да нечага іншага. Бо калі чалавек запраўды йдзе да чаго іншага, дык рана альбо позна ён на досьледах сваіх памылкаў, на досьледах сваіх расчараваньняў дазнае аб фальшывасьці свае мэты і мусіць будзе зразумець, што разумная мэта шуканьня праўды самая лепшая з усіх мэтаў чалавецтва.

Мо' хто скажа, як гэта часта чуваць кажуць, што праўдаю, альбо ведаю жыць не будзеш. Гэта звычайна кажуць тыя людзі, якія, як грудныя дзеці, усё, што ім пападзецца ў рукі, хутчэй цягнуць да рота, будзе гэта хлеб, ці камень, ці нож, ці атрута — ўсё роўна, бо для іх ёсьць адна толькі мера утылітарнасьці — жыватовая. Толькі ж людзі дарослыя, людзі разумныя сьвядомыя ведаюць тое, што сказаў Ісус: не хлебам адным жыве чалавек, бо каб з чалавечага жыцьця зрабіць адно толькі марнаваньне хлеба, дык гэткае жыцьцё было б нічым іншым як тым катухом, у якім перад Коляды адкормліваюць сьвіней на забой. Хіба ўжо бяспрэчна тое, што гэткае жыцьцё вельмі незавіднае і пэўна чалавек, які хоць троху мае чалавечую, не сьвінскую натуру, не захоча адкормлівацца на сьмерць і лепей будзе жыць галадаючы, але вольным жыцьцем чалавека.

Дык вось утылітарныя доказы проці п'янства не могуць быць падставай барацьбы з ім, па першаму, затым, што п'яніца можа лічыць карысным сваё п'янства, дзеля таго, што ён лічыць выпіўку не кепскаю справаю. Бываюць жа такія здарэньні, іншы чалавек шкадуе марнаваць грошы на гарэлку, але калі хто дасьць, дык з ахвотаю вып'е, бо лічыць,

што выпіўка добрая рэч. Гэтак жа ёсьць скупыя асобы, якія галадаюць не затым, што не маюць, але шкадуючы марнаваць багацьце. Па-другому ж, утылітарныя доказы, каб яны нават мелі сілу, вядуць чалавека не на той шлях, на які трэба, бо калі чалавецтва [йдзе] не да шчасьця, але да зразуменьня праўды, дык п'янства, як гэткае, шкодзіць першнаперш не шчасьцю людзскому (наадварот, п'яніца шчасьлівы, калі дападзе да гарэлкі), але толькі зразуменьню праўды — тэй разумнай мэты, якая дае падставу існаваньню чалавека.

Як адбіваецца п'янства на гэтым імкненьні чалавецтва — вось што можа высьвятліць нам, што такое п'янства.

Не будзе спрэчкі калі, скажам тут, што каб зразумець праўду, трэба мець сьветлы і сільны розум, а каб адчуць жыцьцё, трэба мець разумнае і шчырае пачуцьце, а каб рабіць дабро, трэба мець сільную свабодную волю. Калі чалавек імкнецца да разумнага, дык гэта значыць ён хоча лепей зразумець жыцьце, каб лепей адчуць яго, адным словам каб лепей пражыць свой век. Добра пражыць, свой век, г. зн. пражыць яго так, каб наша жыцьцё дало нам нейкае задавальненьне, каб мы не вынесьлі ад свайго жыцьця расчараваньня, але нешта разумнае і рэальнае. Згодна з гэтай асновай жыцьця, якая знаходзіцца ў сэрцы, — у прыродзе чалавека, — жывуць усе людзі, не ўважаючы на тое, ці жывуць яны кепска, ці добра, ці разумна ці неразумна. У гэтым разе розьніца выходзіць не ад розных асноваў жыцьця, але ад таго, што адну тую самую аснову людзі розна разумеюць, бо ўсе яны аднолькава імкнуцца да нечага лепшага, аднак не ўсе разумеюць, што лепшае ёсьць тое, што разумнае, бо вар'яцкае, бясспрэчна, лепшым ніколі не можа быць, а калі каму яно лепшае, дык зразумела, што яно лепшае толькі вар'ятам. Дзеля гэтага кожны чалавек, які хоць крыху мае здаровага розуму, заўсёды шукае лепшага ў тым, што паказвае яго розум, і ніколі не думае лічыць лепшым тое, што пярэчыць розуму. А п'янства не толькі пярэчыць розуму, п'янства і з'яўляецца тэй атрутай, якая фізычна атручвае у чалавеку здаровы розум і гэтым самым не толькі не бывае разумна, але нават наагул перашкаджае чалавеку дасканальней зразумець разумнае і адрозніць разумнае ад неразумнага.

Гэты факт настолькі яскравы, што яго не трэба даказваць, бо нават безнадзейныя п'яніцы, для якіх п'янства ўжо

стала сьмяртэльнай хваробай, ад якой яны не могуць вылечыцца, іншы раз добра разумеюць гэта, ведама, калі бываюць у цьвярозым стане. Не разумеюць гэта хіба толькі тыя "цьвярозыя" п'яніцы, для якіх п'янства яшчэ не стала хваробай, дзеля чаго яны кажуць, што п'янства у "меру" не шкоднае, г. зн. не шкодна крыху пашкодзіць яснасьці свае мысьлі. Гэта можа сказаць хіба толькі той, хто не адчувае тэй важнасьці, якую мае розум для жыцьця чалавека, як можа сказаць нечулы да болі чалавек, што пароць голкамі цела зусім нешкодна.

Гэта мо' й праўда: парнуць крыху голкаю цела мо' й не шкодзіць, аднак ніводзін чалавек, які чуе боль ад гэткіх уколаў, не палічыць патрэбным пароць сябе голкамі. Гэтаксама, калі чалавек ведае важнасьць свайго розуму для свайго жыцьця і яскрава бачыць тое, што п'янства **пора гэты** розум, прымушае яго, калі не хварэць, дык балець, — такі чалавек ніколі не пазволіць сабе ўжываць гарэлкі ніводнага кілішка ні за свой, ні за чужы кошт, хоць у апошнім выпадку "за кампанію" выпіўка зусім не прыносіць ніякай матар'яльнай шкоды, што і любяць рабіць тыя ўжывацелі гарэлкі, якія зразумелі утылітарную шкадлівасьць п'янства, але не зразумелі шкадлівасьці **жыцьцёвай**.

Да гэтага трэба дадаць, што п'янствам бывае не адно ўжываньне гарэлкі, не, ужываньне гарэлкі гэта ўжо фізычнае п'янства, гэта, калі можна так сказаць, галава п'янства, але ўся істота яго створана не з аднаго алкагалізму. Разумеючы ў чым увесь сэнс згубнасьці п'янства, г. зн. тое, што п'янства шкодзіць розуму, мы з аднолькавым правам можам лічыць п'янствам і тое іншае, што шкодзіць чалавечаму розуму, што яго зацямняе і губіць. А гэткую функцыю выконывае не адзін алкаголь. Апроч алкаголю шкодзіць здароваму розуму курэньне тытуну, шмат якія гульні, напрыклад скокі, пасьля, шмат якія брыдкія звычаі чалавека, да чаго нават "цьвярозыя" людзі ў большасьці адносяцца, калі не прыхільна, дык нейтральна. А між тым нельга назваць цьвярозым чалавека да таго часу, пакуль ёсьць хоць адно што-небудзь, што можа яго вывесьці з спакойнага стану чалавека, ведаючага вартасьць сваіх здаровых паняцьцяў, г. зн. да таго часу, пакуль чалавек будзе знаходзіць нешта лепшае ці нешта добрае у тым, што адхіляе здаровую душу цьвярозага чалавека. Не дарма ж кажуць іншы раз: ап'янеў ад пацехі, ці ад шчасьця ці

яшчэ як інакш. У гэткіх выразах п'янства разумеецца не ў пераносным, але ў абсалютным сэнсе, таксама, як у абсалютным сэнсе разумеецца тое, калі пра чалавека кажуць, што ён мае на нешта **цьвярозы** пагляд. Цьвярозы пагляд г. зн. такі пагляд, калі чалавек падыходзіць да справы не з п'янай псыхалёгіяй, каб аддацца гэтай справе ці выкарыстаць гэтую справу ў п'яным сэнсе, г. зн. так, каб замуціць сабе жыццё і пачуцьце хвілінай пацехі ці нават дзейнасьці, але калі ён падыходзіць да справы так, **каб зразумець у ёй сэнс і праўду**.

Дык вось чым у самай справе розьніцца п'янства ад цьвярозасьці. Для п'янства ўсё што ёсьць на сьвеце, ці то пацеха, ці то шчасьце, ці то дзейнасьць, ці нават ідэя, бывае толькі прычынай таго, каб на хвіліну замуціць сабе розум, зварушыць свае пачуцьці гэтак, каб не адчуць і не разумець жыцьця, якое для гэтакага розуму і для гэтага пачуцьця не можа мець ніякай асновы і ніякага сэнсу. Цьвярозасьць усё наадварот, у кожнай справе і ў кожнай рэчы ўзбуджае розум чалавека гэтак, каб ён зразумеў сэнс і праўду, а дзеля гэтага разумная і абаснаваная дзея, гэтаксама як пацеха ці імкненьне заўсягды маюць **здаравейшы** ўплыў на жыццё. Нездарма кажа англіец Джон Рёскін[6], што ў меру выкананьня разумных дзеяў усё больш і больш жыцьця прыбывае ў чалавеку, гэтаксама можна сказаць, што ў меру выкананьня неразумных дзеяў усё больш і больш хваробы прыбывае ў чалавеку. П'янства і цьвярозасьць — гэта ёсьць той адбітак на чалавечым жыцьці, які характарызуе неразумную і разумную дзейнасьць чалавека. Калі мы бачым, што пэўныя людзі ці пэўная кляса людзей усё больш і больш губляе здароўе, дык дзеля гэтага можам сьмела лічыць, што гэтыя людзі ці гэтая кляса жыве ў п'яных варунках, у абмяжованым сэнсе, значыць, у алкагалізме, а [ў] шырокім, значыць, па-за цьвярозымі асновамі жыцьця. Сілаю рэчаў жыцьцё збудована так, што існаваньне можа мець толькі тое, што разумнае. Дзеля гэтага, зразумела, што ў імкненьні да жыцьця, у імкненьні да нечага лепшага людзі мусяць імкнуцца да таго што разумна, бо разумнае будуе жыцьцё, а неразумнае руйнуе яго. Дык калі чалавек шукае праўды, г. зн. разумнага, тады ён будуе жыцьцё, і калі чалавек шукае лепшага жыцьця, дык ён мусіць шукаць праўды. Каб зразумець гэта, трэба прыпомніць тут знанае прыслоўе: "у здаровым целе здаровы дух". А Тал-

стой кажа, што наадварот, здаровы дух робіць цела здаровым, бо маральнае разумнае жыццё ўключае ў сябе ўсе правілы гігіены. Калі ж мы злучым тое і іншае разам, дык у нас будзе такі выраз: разумнае жыццё ёсць варунак здароўя, г. зн. тое самае, аб чым было сказана раней.

Дык з якога б боку мы ні падыйшлі да справы — адусюль мы абавязкова даходзім да вываду, што разумнае жыццё, гэта ёсць варунак існаваньня чалавека, бо існаваньне чалавека заключаецца ў тым, што вядзе жыццё да павелічэньня да палепшэньня жыцьця. Тое ж, што паступова касуе жыццё, не можа быць жыццёвым варункам, і нават тагды, калі некаторыя асобы будуць распінацца за тое, каб даказаць што не розум, а нешта іншае, як, прыкладам, барацьба за існаваньне кіруе жыццем, бяручы гэта з фактаў таго, што ёсць, яны не магчымуць гэта даказаць. Калі людзі, напрыклад, і не жывуць паводле розуму, але па прыслоўю "хто каго можа, той таго грызе", дык трэба сьцьвердзіць, што гэтакае жыццё вядзе да скасунку жыцьця, і калі ж жыццё аканчальна не касуецца, калі яно як сэрца Праметэя[7] неперарыўна аджывае, дык яно аджывае якраз тым, што ў большай ці ў меньшай меры побач з вар'яцтвам людзей жыве разумнае імкненьне чалавецтва.

Якое ж ліха перашкаджае чалавецтву свабодна стаць на разумны шлях здаровага жыцьця? На першы пагляд здавалася б так, калі што добрае, калі што разумнае, дык усе мусілі б пераканацца ім і ўласьцівіць сабе тое, што разумнае і добрае, аднак гэтага няма і часта нават людзі бачачы шкоднасьць ды паніжэньне неразумнага жыцьця, не могуць зьмяніць яго і не могуць стаць у нармальныя варункі. Якая ж прычына перашкаджае гэтаму? А ізноў — усё тое самае п'янства, ці, лепш кажучы, тыя ўласьцівасьці, якія ўзгадоўвае п'янства ў чалавеку. Каб зразумець гэтага, даволі зрабіць аналіз той прынады, якую мае ў сабе п'янства.

Нам усім вядома, што п'яніцы кажуць быццам гарэлка цягне чалавека. Калі вып'еш кілішак, дык хочацца яшчэ і яшчэ. Пабожныя містыкі пэўне лічаць, што ў гарэлцы сядзіць нейкая нячыстая сіла, якая вабіць да сябе чалавека, аднак для крытычных досьледаў вядома нешта іншае, зусім натуральнае, без ніякай нячыстай сілы. Справа ў тым, што п'янства з'яўляецца як бы **адваротнай** асновай жыцьця, інакш кажучы, асновай уверх нагамі. Калі асновай разумнага жыць-

ця мы можам лічыць тое, што ўва ўсіх праявах жыцьця, ува ўсіх дзеях і жаданьнях чалавек імкнецца знайсьці нешта трывалае, рэальнае, разумнае, жыцьцёвае. Інакш кажучы, разумна жывучы чалавек шукае ў жыцьці таго, што пашырае, узьвешчвае і ўдасканальвае жыцьцё; дык наадварот, адваротнай асновай неразумнага жыцьця бывае тое, што чалавек ува ўсім шукае нечага ап'яняючага, г. зн. не такога, што ўзрашчае жыцьцё, а такога што знішчае яго, кажучы па руску — "прожигает жизнь". У гэтым выпадку [неразборліва ў рукапісе] лермантаўскія "тры пальмы"[8] з'яўляюцца добрым сымбалем. Яны не бачылі нічога добрага у тым, каб жыць для росту, дык мусілі задаволіцца спаленьнем на вогнішчы. Гэтаксама й людзі: якія не могуць жыць жыцьцём, тыя жывуць гарэньнем, г. зн. зьнішчэньнем жыцьця. А гарыць, як мы ведаем, тое, што сухое, г. зн. нежывое. З усяго гэтага нам зразумела, чаму чалавек, жывучы неразумна, шукае нечага такога, чым бы зьнішчыць жыцьцё, бо калі ён ужо, гэтак кажучы, засох, дык не можа ўжо расьці, не можа разьвівацца, але калі ён чуе ў сабе нешта такое, што імкнецца, што хоча жыць, дык мусіць аддацца гарэньню, па першаму, каб задаволіць сваю смагу шчасьця, а па другому, каб гэтым згарэньнем зьнішчыць жыцьцё і гэтую самую смагу, што імкне да жыцьця, калі жыць немагчыма.

Цяпер магчыма палажыць рысу між п'янствам безпрынцыпным, якое не ведае межаў і п'янствам прынцыповым, якое ведае "мяжу" ужываньня гарэлкі, бо ў меру, кажа, ужываць яе ня шкодна. Што ёсьць розьніца між гэтымі двума п'янствамі, дык з гэтым немагчыма спорыць, бо калі першае **шкоднае** тым, што паліць жыцьцё, дык другое **"нешкоднае"** тым, што пора з усіх бакоў чалавечае жыцьцё. Гэтыя ўколы мо' і не нішчаць жыцьця, але напэўна спрыяюць **засыханьню**, без якога немагчыма гарэньне. Дык, як бачым, прынцыповае ўжываньне гарэлкі "у меру" не з'яўляецца п'янствам, як выпальваньнем жыцьця, але затое з'яўляецца нешкоднаю шкодаю, якая паступова **сушыць** чалавечыя сілы і ўчуцьці і гэтым прыгатоўвае магчымасьць прапальваньня жыцьця. Дзеля гэтага, калі першае п'янства ўсе згодна лічаць хваробай, дык другое п'янства можна слушна абвясьціць негігіенічным захаваньнем. Гэткім негігіенічным захаваньнем з'яўляецца не адно ўжываньне гарэлкі, але ўся тая нездаровая імаральная атмасфэра, якая шкодзіць чалавеку перш-наперш

тым, што забівае яго волю. Дзеля гэтага гігіена духа ёсьць першы варунак для захаваньня свае волі свабоднаю і сільнаю, якая магла б змагаць усё неразумнае, а свой розум сьветлым і магутным, каб зразумець усялякую праўду.

Я ведаю, што на гэта шмат хто можа сказаць: "От, там яшчэ нейкая сіла волі ці самаўзгадаваньне — жыві як жывецца, дый годзе". Гэтыя выразы звычайная філёзофія мае, а другая філёзофія кажа: масам, кажа, немагчыма праз узгадаваньне волі, розуму і сьвядомасьці дайсьці да нечага лепшага, бо масы гэтага не могуць прыняць. З гэтага вынікае, што трэба шукаць інакшага шляху да лепшага і пакінуць масам іхнюю дурную філёзофію "жыві як жывецца". А між тым калі й можна чаго дапяць інакшым, паміма ўзгадаваньня мас, дык гэтая філёзофія "жыві, як жывецца" зруйнуе ўсе падобныя здабычы, бо "жыць, як жывецца" **немагчыма**. Гэта толькі дурны выраз, дурная думка, можа дапусьціць падобнае глупства, бо сказаць "жыві, як жывецца" — усё роўна што сесьці ды сказаць: "Нашто тыя высілкі пасоўваньня ног наперад — ідзі як ідзецца". Хіба ж дурню вядома, што само нішто ня йдзецца, а калі хто йдзе, дык мусіць пакладаць высілкі на тое, бо інакш ён не будзе йсьці. Гэтаксама, калі хто жыве, дык мусіць пакладаць **высілкі** на тое, бо інакш — ён будзе жыць, але выпальваць сваё жыцьцё ў **п'яным дурмане**. Істота п'янства сьведчыць аб гэтым, бо ўсе мы бачым, усе мы ведаем тое, што п'янству аддаюцца тыя людзі, якія не могуць змагацца з ім, якія не могуць сілаю волі накіраваць сябе на інакшы шлях, бо яны не маюць сілы, дзеля чаго, нават тагды, калі яны не хацелі б п'янстваваць, не могуць гэтага зрабіць. Вось гэта і ёсьць тое "жыві, як жывецца". Спачатку чалавек жыве, як жывецца, не рэгуліруючы сваіх жаданьняў, сваіх высілкаў, не шукаючы сабе адпаведнага шляху. І вядома, у стане бяздзейнасьці чалавек губляе апору, губляе здольнасьць кіраваць жыцьцём і жыцьцё пачынае нясьці яго, куды яно ўздумае. А чалавек, аддаўшыся бездзейнасьці, не лічыць патрэбным зрабіць высілак, каб астанавіцца, каб накіравацца на інакшы шлях.

Ён ўсё яшчэ лічыць што лепш не **"перашкаджаць"** жыцьцю сваімі высілкамі, ды пэўне і лягчэй "жыць так, як жывецца", чымся жыць паводле свайго ўласнага розуму і жаданьня. "Нашто працівіцца жыцьцю, лепш карыстацца тым, што дае жыцьцё", — вось філёзофія гэтага эпікурэйства[9],

якое не бачыць што ніхто не працівіцца жыццю, але толькі жыццьцё складаецца з высілкаў чалавека. Эпікурэйская рада карыстацца жыццьцём робіць толькі тое, што замест разумных высілкаў, якія твораць жыццьцё, дае п'яныя пацехі, якія выпальваюць жыццьцё, ці жыццьцёвыя сілы ў чалавеку. На прыкладзе п'янства мы гэта бачым як найлепей. Алкаголь гэта ёсьць адна з радасьцяў эпікурэйства, якой чалавек карыстаўся замест таго, каб тварыць жыццьцё. І вось пакуль чалавек карыстаецца гэтай атрутнаю пацехаю "у меру", ён не бачыць таго, што яно значыць, не бачыць таго, што гэта ёсьць згуба як матар'яльная, гэтак і духовая, дзеля чаго прынцыпіяльныя выпівакі лічаць гарэлку карыснаю, бо як жа-ж не карысна тое, чым чалавек карыстаецца ў жыцьці, але ж калі гэтае "жыві, як жывецца, для свае пацехі", завядзе чалавека аканчальна ў балота п'янства, калі яно аканчальна **высушыць** усе жыццьцёвыя сілы ў чалавеку, ды калі да таго ж яшчэ не аканчальна заб'е чалавека і пакіне, як сухотнаму, сьвядомасьць умираньня, тады гэты сьвядома гінучы чалавек яскрава зразумее шкоднасьць п'янства, яскрава ўбачыць, што "жыць, як жывецца" немагчыма, бо гэта нішчыць жыццьцё, але ён убачыць усё гэта тагды, калі ў яго ўжо і асталося ад жыццьця адна толькі здольнасьць бачыць сваю згубу і амаль што ніякай надзеі на паварот к разумнаму жыццьцю, бо калі цяжка чалавеку ўтрымацца на вышыні разумнага жыццьця і калі ў яго ёсьць яшчэ сілы, дык наколькі ж цяжэй яму падняцца з прорвы п'янага жыццьця, калі сілы загубленыя п'янствам. Праўда, да гэтага гібельнага стану даходзяць не ўсе, але хоць і частыя, адзінка, большасьць жа астаецца на той нешкоднай сярэдзіне п'янства, адкуль не відаць яго значэньня, і ўсе памяркоўныя алкаголікі нават абсуджаюць безнадзейных алкаголікаў за тое, што апошнія дайшлі да таго стану, да якога йдуць першыя, таксама, як тыя барацьбіты з п'янствам, што тлумачаць шкоднасьць яго стаючы на пункце ўтылітарызму, чым яны толькі падліваюць масла ў вагонь, бо не можа ж чалавек зрабіць высілак волі ў змаганьні з сваім нахілам да алкаголю толькі затое, каб замест чаркі гарэлкі з'есьці кавалак мяса, а калі хто пакладае высілкі, дык робіць гэта толькі ўва імя разумнага жыццьця — вартага разумнае істоты чалавека.

Краса і радасьць жыцьця

Жыцьцё не мае ў сабе тых казачных абрусоў-самабранкаў і каўроў-самалётаў, аб якіх летуцелі нашыя наіўныя продкі. Жыцьцё не мае нічога гатовага і толькі высілкамі працы і ўчуцьцяў магчыма здабыць у ім красу і радасьць свайго істнаваньня. Нельга сказаць, што гэты парадак горшы ад казачных летуценьняў, бо каб жыцьцё нам дала ўсё гатовае, дык мы рашуча нічога не мелі б затым, што ўсё, што дастаецца без высілкаў, не мае ніякае вартасьці. Дык мы пражылі б жыцьцё, як у казцы, але не адчулі б яго вартасьці. Каб ведаць вартасьць жыцьця ў красе і радасьці яго, трэба працаваць і любіць сваю працу, бо праца творыць вартасьць жыцьця, а любоў — красу яго.

Прамэтэй

Самаузгадаваньне

Агульна ведамы закон, што праца спрыяе разьвіцьцю сілы, дык калі мы прызнаем патрэбным разьвіцьцё сілы сваіх здольнасьцяў і ўчуцьцяў, каб разумна і радасна пражыць сваё жыцьцё, нам трэба працаваць над сабою. Праца над сабою — самая цяжкая праца, бо чалавек звычайна сам перад сабою не ведае межаў устрыманьня і сам сабе любіць усё выбачыць. Ён дзее паводле прыказкі "свая рука — ўладыка", што хачу, тое зраблю, але вось тут дык і трэба ведаць, што зрабіць, што не зрабіць. Дзе нішто не абмяжоўвае нашае дзейнасьці, там мы самы павінны вызначыць сабе межы, каб ведаць, што трэба, што не трэба, што разумна і што неразумна і навучыць сябе дзеяць паводле сваіх уласных правілаў.

Самая цяжкая перамога — перамагчы самога сябе, але яна найбольш радасная.

Прамэтэй

Тэстамэнт свабоды

Памылкова думка несьвядомых асобаў, якія лічаць, што свабода ёсьць магчымасьць рабіць усё, што ўлезе ў галаву. Свабода не ёсьць свабода ад усялякіх законаў і абавязкаў,

свабода ёсьць свабода ў сваіх законах і абавязках. Калі чалавек цьвёрда зразумее той шлях, па якім яму належыць прайсьці ў жыцьці, ды няўхільна будзе трымацца тых абавязкаў і правілаў, якія паказвае яму ўласны розум, дык тагды ён будзе свабодны, свабодны не ад закона, але свабодны ў законе, бо ягоны закон, ягоны шлях жыцьця будзе згодны з свабоднай думкай яго. Хто хоча іншай свабоды, той заўсягды будзе ў няволе, бо ў жыцьці трэба мець кірунак, і калі мы не вызначым яго свабодна, ды прымушаны будзем карыстацца незразумелым варункам.


Прамэтэй

Права на зямлю

У нас існуе такі парадак, што абшарнікі валодаюць аграмаднымі абшарамі зямлі, а частка сялян зусім не маюць зямлі, не кажучы ўжо аб вялікай колькасьці малазямельных, якія не маюць права зачапіць абшарніцкай зямлі. Складаныя і хітрыя законы аб зямельнай рэформе ў сутнасьці не вырашаюць справы, але зацягваюць яе. Яны яшчэ раз ставяць пытаньне аб нейкіх правах і патрэбах зямлі, як быццам не ведаюць, што на зямлю мае права кожны той, хто яе патрабуе і хто на ёй працуе, ды ён жа і адчувае гэтае права. Дык ніякая сіла на сьвеце не пазбавіць чалавека таго права, якое ён адчувае, дзеля чаго разумны закон не павінен абмяжоўваць яго, але толькі ўпарадкаваць агульнае права на зямлю.

Прамэтэй

ПАЭЗІЯ



***

Селяне цёмныя пакутнай Беларусі,
Дзе жыцьцё ёсьць нужа, а праўда ёсьць вастрог,
Жадаем выйсьці ў сьвет з няволі і пакусы,
Дык вось у нас бяда, каб хто нам дапамог.
Хапіла-б ў нас сваіх жывых здаровых сілаў,
Каб знялі з нас ярмо, разбілі ланцугі,
Але ніхто ня дасьць нам гэтай долі мілай...
Пануе ў нас няволя і лёс адзін благі.
Адвеку ў нас дзяцей страшаць агнём пякельным,
А тут нас сьцюжа жмець ў жалезныя кляшчы
Ад пекла мы ўцячэм пастом ды і маленьнем,
Дык дайце нам цяпер ад сьцюжы ўцячы.
Зьнімеце з нас сваю адвечную няволю,
Пусьцеце выйсьці ў сьвет з вастрогу і нужы,
Здабудзем мы сваю сьвятую волю,
Дзе жыцьце побач з праўдай вольна пабяжыць.

Пра сваю працу

Яшчэ толькі паны
Ляглі ў подушкі спаць,
А з саломачкі мне
Ўжо трэба ўставаць.

Трэба рана ўставаць
Сваю долю будзіць
І да цёмнай начы
Без устаньня рабіць.

Трэба дужа свае
Цяжкай працай улажыць,
Каб хоць мала паесьць
І з пакутай пражыць.

Трэба дужа цярпець,
У Божу моц веру мець,
Каб без мукі і слёз
Сваю песьню пеяць.

...З гэтай думай я ўстаў,
Пайшоў коні будзіць, —
Трэба ехаць у лес,
Жыду дроў валачыць,

Каб галоднай сямье
Хлебу крыху дабыць,
Каб на газу і соль
Які грош зарабіць.

... Трэба доўга пеяць
Гэту песьню маю,
Каб усё паказаць,
Што за сэрцам таю.

Ды аткуль мужыку
Столькі часу дабыць,
Каб пра гора сваё
Доўгу песьню злажыць.

... Эй, хоць ты, родны звон,
Празвяні за мяне.
Можа будзе ляпей
На душэ ў мяне.

Буду ведаць тады
З велькай радасьцю я,
Што таксама жыве
Абарона мая.

Не хачу

Не хачу быць я
Ні царом, ні героям, ні панам,
Ні ідыотам, пыхай напханым, —
А разумнай істотаю.
Не хачу меці я
Ні багацьця, ні гучнае славы,
Ні магчымасьці правіць дзяржавай, —
А душу свабодную.
Не хачу змагаць я
Ні гора, ні голад, ні зьдзекі,
А нізкую рысу у чалавеку —
Подласьць нягодную.
Не хачу шукаць я
Ні несьвядомага шчасьця і долі,
Ні несьвядомае дзікае волі, —
А праўду свабодную.
Не хачу любіць я
Светлыя вобразы з будучых дзён,
А лепшую рысу натуры людзкой —
Шчырасьць лагодную.

Вымаганьне

Вырві сэрца мне з грудзей,
Вазьмі маё жыццё, —
Не ганьбуй душэ мае
Тэстамэнты быцця.

Закуй мяне ў кайданы,
Забяры ў няволю, —
Ды пачуцця не крані,
Не паруш ніколі.

Калі хочаш душы, муч,
Зьдзекуйся ў прымусу, —
Ды сумленьня мне неруш
Ганебнай спакусай.

Маёй працаю гандлюй,
Нажывай мамону, —
Толькі шчырасьці маей
Не аддай нікому.

Не давай ты мне хадзіць
Без тваіх даглядаў, —
Не прымусь мяне зьменіць
На праўду паглядаў.

Магу я ўсё трываць,
Вынясьці ў жыцьці, —
Не магу жа я аддаць
Моцы майго быцця.

Можна ў мяне адабраць
Сілу і работу,
Нельга ж толькі разарваць
Мне маёй істоты.

Чым гартуецца душа,
Жыццё сэнс ў чым мае, —
Без таго пражыці я
Не магу і ў раі.

Як душа тварыць сябе
Вольнаю істотай,
Дык і пекла для мяне
Не мае страхоты.

Не хачу за гэта жыць
Я шчасьлівым векам,
А хачу я толькі быць
У сэрцы чалавекам.

Песьні сэрца

Не пяю я аб дзівах прыгожай прыроды,
Не пяю я аб долі й нядолі народа, —
Я пяю аб імкненьнях вялікіх пачэсных,
Я аб сэрцы пяю свае песьні.

Не пяю я ад імяні музаў і німфаў,
Бо яны не даюць мне ні словаў, ні рыфмаў,
Дзеля гэтага я абразоў не малюю, —
Пяю тое, што ў сэрцы пачую.

Мяне сьвет не зьдзіўляе нясметным веліччам
І прырода сваім чарадзейным абліччам, —
Захапляе мяне веліч людзкога сэрца,
І аб ім сама песьня пяецца.

Мяне сіла натхненьня не вельмі зьдзіўляе,
Бо яе я ў сабе ані кроплі не маю,
Калі жыцьця ў душэ ў сябе не пачую,
Калі ў сьвеці без мэты гарую.

Як адчую ў душэ я жыцьця развяртаньне,
Тады знаю я мэту свайго істнаваньня,
Тады цяжар і злосьць ад душы адлятае,
Тады песня сама выплывае.

***

Як пачуеш у сэрцы ты жыццё —
Не спыняй, бо ў ягоным разьвіцьці,
У сіле сьвядомасьці й волі —
Залог лепшае долі.

Як пачуеш ты розуму мову —
Уважай, бо у ісьціні новай,
Што паўстане ў яе асьвятленьні —
Ёсьць залог адражджэньня.

Як пачуеш ты голас сумленьня —
Не здраджай, бо ў ягоным здзейсьненьні,
У шчырай згодзі з яго дамаганьнем
Твайго жыцьця схаваньне.

Як пачуеш ў душэ сумневаньне —
Не прымушай сябе верыць без знаньня,
Бо як ня знаеш да праўды імкненьня —
Дык не ўбачыш збаўленьня.

***

Кахаць — гэта аддаць сябе,
нічога не жадаючы ўзамен

Бел. Адр. Кал. на 1926 г.

Хто шчасьця жадае,
Той шчасьця ня мае,
Бо клопат за шчасьце ў душэ ён трывае.
Хто жыцьце ў ахвяру
Любоўнаму жару
Дае, той на сэрцы ня мае цяжару.
Хто хоча мець долю,
Той гора ніколі
Не збудзе, бо ў сэрцы не мае спакою.
Хто не жадае
І ня шукае,
Той долю ў спакоі унутраным мае.
Хто хоча мець многа,
Той у сэрцы нічога —
Ніводнае кроплі не мае сваёго.
Хто ўсё ў сабе мае,
Той гора не знае,
Бо шчасьце і волю ў сабе адчувае.
Няшчасьце, нядоля
І нэндза й няволя
У тым, што ў душэ не дае нам спакою, —
У жаданьні, якое
Ірвецца ад болі
І даць нам ня можа нічога ніколі.
У ім — сымвал пустоты
Людское істоты,
Якую схаваць трэ ў спаўненьні ахвоты;
Яно — залог гора
Душэ нашай хворай,
Якая ў сабе не знаходзіць прастору.

Чые сэрца поўна
Да праўды любоўю,
Той быці ня можа ў сабе неспакойны,
У сабе ён усё мае,
Што з гора збаўляе,
Што моц і сьвядомасьць жыцьця разьвівае.
Знаць жыцьця ў ахвяры
Любві на алтары,
Імкненьня да праўды душэўнага жару; —
Вось у гэтым і доля,
У гэтым і воля,
У гэтым няшчасьце не будзе ніколі.
Любі, каб ня была
Ніводнае хвілі
Жаданьня пагарды цяпер ці ў магілі,
Тады будзеш мець ты
У сэрцы істоту,
Якая не знае ніякіх клапотаў.
Як з сэрца адпадуць
Усе мары і прынады,
Тады яно шчасьце пазнае без рады.
Як гэта не стане —
Дарэмна жаданьне: —
Яно растраўляе жыцьця адчуваньне.

***

Хто хоча мяне зразумець,
Хай ня просіць у мяне тлумачэньняў,
Бо ніяк немагчыма ўмець
Выкладаць свайго сэрца імкненьні.
Што схавана ў душэ ў глыбіне,
Тое будзе для ўсіх ўсягды тайнай, —
І ніякай не скажаш радне
Сваіх думак й пачуцьцяў ты яўна,
Бо душа ці істота твае —
Гэта ёсьць цэлы сьвет істнаваньня,
І ніхто не дапне да яе,
Каб убачыць яе кіраваньне,
Каб убачыці воблік яе,
Каб адчуць пачуцьцё яе жыцьця,
Як мы чуем пачуцьце свае,
Як мы бачым у самым сабе быцьцё.
Німа ў сьвеці ніякіх дарог
І ніякае рады на гэта.
Каб хто ў поўнасьці й цэласьці мог
Перадаці вам быт свайго сьвету.
Калі ж хочаце ж вельмі адчуць
Вы чужое душэ істнаваньне,
Паспрабуйце ў сэрцы разьвіць
Шырыню свайго пачуваньня.
І тады ў пачуваньні сваім
Вы адчуеце кожнае сэрца
І ўбачыце тое ў ім,
Як там праўда і жыцьце кладзецца.

Здавальненьне

Чым вы можаце сэрца маё задаволіць,
Чым вы можаце душу маю супакоіць,
Калі я не жадаю нічога —
Ні дабра, ні спачуцьця людзкога,
А ніякага шчасьця містычнага раю,
А ні багацьця, ні роскашы й славы,
Ні магчымасьці правячай улады.
Ні гардзіцца дабром сваіх родаў?
Я здабыць бы сабе мог прыхільнасьць людзкую,
Каб пяяў я за імі іх песьню любую
Аб іхнім бязмэтным жаданьні,
Аб іхнім глухім пачуваньні.
Але пець не магу я "адвечнае" песьні,
Бо не бачу прыгожасьці ў затхласьці й плесьні;
Толькі праўда прыгожая вабіць мяне
Дык люблю ўсей душою яе.
Што ёсьць шчасьце далёкага дзіўнага раю,
Дзе бязмэтны спакой, — я аб гэтым не знаю,
Толькі ведаю пэўна ў душэ:
Любасьць к праўдзе ей шчасьце нясе.
Дык нашто мяняць шчасьце душэ свае шчырай
На багацьце, здабытае дзікаю сілай?
Бо ад праўдзівае добрае працы
Не здабудзеш багатых палацаў.
Нашто мяняць шчасьце праўдзівага сэрца
На славу, здабытую крывёю і мечам,
На пыху ўладаючых клясаў,
На гордасьць — багатых прыкрасу?
Не хачу й не магу я нічым валадаць,
Толькі шчырасьць душы я хачу захаваць,
Каб астацца на век прад сабою
Разумнай істотай людзкою.
Я імкнуся к таму, чаго даць немагчыма,
Што, таксама, ніхто ад мяне не адыме,
Бо знаходзіцца ў сэрцы маім,

Дзе яго не закранеш нічым.
Як нічым не здаволіце сэрца ўласьцівасьць,
Дык і шчасьця яго адабраць немагчымуць,
І яно застанецца перад сабою
Сьвядомай істотай людзкою.

Памяці Казімера Сваяка[1]

Душа, пазбаўленая жыцьця
У сьвядомасьці ўласнай моцы,
Не можа знаць у сабе пачуцьця
Свае здаровае істоты.

Душа, якая мае шчырасьць,
Нашто збаўленьне гдзесь шукае,
Калі ўва ўнутранай істоці
Яна свае збаўленьне мая.

Імкненьне з унутранага схову
Кудысьці ў вобласьць містыцызму,
Вядзе душу да раскладаньня,
Да растраўленьня нашай сілы.

У выніку замест збаўленьня
Спаткае згуба Вашу душу,
Бо вы тады ў сваім імкненьні
Адчуеце адну пакуту.

***

На кожную справу кіруй цэлае свае сэрца

Бел. Адр. Каляндар на 1926 г.

Найвялікшая ў жыцьці людзкая задача;
Каб дазнаць аб самым сабе поўную праўду,
Бо без гэтага ніяк іначай
Ўвайсці ў жыцьці да ладу.
Аб самым сабе праўду дазнаці ня лёгка: —
Найцяжэйшага ў сьвеці небудзе нічога;
Хоць мы ад сябе не далёка,
Але ўвайсьці ў сябе як без дарогі.
Ўвайсьці ў глыбіню душы ёсьць немагчыма,
Дык пазнаць сябе трэ інакшай дарогай,
Трэба жыцьце пражыць сваё шчыра,
Не шкадуючы праўдзе нічога.
Трэба ў кожную справу ўкладаць усю душу,
Усю вартасьць любві, усё шчырае сэрца,
Тады ў жыцьці, як у люстры,
Істота душы адаб'ецца.
Разам з гэтым прымаецца наша істота,
Чым мы споўнім у жыцьці свае назначэньне,
І тады ніякая брыдота
Не парушыць жыцьця здаваленьня,
І тады ўжо ніякая сіла на сьвеці
Не парушыць нам шчасьця жыцьцёвага стану,
Бо воля ўнутры — у істоці,
Навокал усё асьвятляе.

Прыкметы

Хто праведны ў працы,
Не збудуе палацаў;
Хто найбольшы ў свеці —
У гору ня прэцца;
Хто павагу мае,
Нікім не пагарджае;
Хто сэрца сьвятога —
Не неволіць нікога;
Хто праўды жадае —
Нікім не карыстае;
А хто шчырасьць мае,
Нікога не абсуджае.
Хто цану сабе знае,
Пахвалы не жадае;
А хто розум мае,
Пяршынства не шукае;
Хто ў сэрцы сьвядомы,
Зла ніхоча нікому;
Хто зумленьне мае,
Зайздрасьці не знае;
А хто праўду любіць —
Аб сябе не трубіць,
Хто ў слове праўдзівы,
Не будзе баўтлівы;
Хто даброту любіць,
Хваліцца не будзе;
Хто жыць хоча праўдзіва,
Быць не хоча шчаслівы;
Хто ж найвышэйшы ў сьвеці,
Такога вы не знайдзеце,
А хто ў сэрцы сябе знае,
Той ўсех вышай бывае.

***

Пранясі мяне, лёт, па-над сьветам,
Дай заглянуці ў кожны куток,
Каб я кожную хібу прыкмеціў,
І дабро адзначаць усюдых мог.

Пранясі мяне, думка, між людам,
Што працуе й без працы жыве,
Каб я ў гэтым свабодным прысудам
Мог адзначыць дарогі свае.

Пранясі мяне, сіла, свабодна
Паміж тым, што захоча трымаць
Яе волю — уласьцівасць сьвятую,
Адлічаючы кожны абман.

Пранясі, каб ніякая сіла,
Не стрымала палётаў тваіх,
Не звярнула тваёга нахілу
Да пашаны адзнакаў чужых.

Пранясі мяне ў жыцьці ўраганам,
Каб ніякая сіла трымаць
Не магла мяне ў стане паганым,
Кладучы мне на душу печаць.

Пранясі, каб я мог у сваей сіле
Закружыць і падняць цэлы сьвет
І нясьціся свабодна, шчасліва
Да душой улюбляных мэт.

Песня ратая-беларуса

Як засею я лубінам поле,
Загару яго й жыта пасею, —
Дачакаю я лепшае долі,
Як уродзіць на лубіне жыта.
Узыдзе жыта, як шчотка густое,
Дасць бог дожджык і ніву прамочыць,
Дык пайдзе расьці жыта ў гору
І налета мне жыта уродзіць.
Загараў я свой лубін й засеяў
Жыта буйнае шчодрай рукою,
Ўзышло жыта на ніве, аж міла,
Вясной дождж паліваў яго шчыра.
Урадзіла мне жыта густое;
Колас важкі на землю валіўся, —
У прадбачаньні лепшае долі
Я зусім-такі ўжо памыліўся:
Прадаў жыта сваё за бязцэнак,
Аддаў грошы на розныя рэчы,
На падаткі, на соль і на газу,
Ды сам голы й галодны астаўся.

Як сум ў душэ маей таўпіцца

Як сум у душэ маей таўпіцца, —
Не магу тады маліцца,
А тады малюся Богу,
Як здыму з душы зьнямогу;
Бо зьнямогшы просіць ў Бога
Выбаўленьня ад зьнямогі,
І чакае боскай волі
Як варунак лепшай долі.
Але Бог не дасьць нічога
Тым, хто просіць ўсяго ў Бога,
Бо хто просіць і чакае,
Сілы той ў сабе не мае.
А бессільны мець ня можа
Над сабою ласкі Божай,
Бо пад боскай добрай воляй
Ён не знойдзе лепшай долі:
Доля лепшая залежыць
Не ад Бога, а належыць
Тым, хто мае сілу волі
Не чакаць дабра ніколі
І тварыць сама сабою
Жыцьце вольнае, сьвятое.

Маё...

Мой прастор — не бязмежжа палёў,
Дзе хвалюецца ніва прыгожа, —
Мой прастор — гэта думкі палёт.
Што не знае нідзе бездарожжа.

Дзе я з думкаю сьмелай пайду,
Хоць там будзе і цемра, і холад, —
Я-ж свой шлях, сваё шчасьце знайду:
Розум вольны ўсё ператворыць.

Мая хата — не сьцены муроў,
Не палацы на горах высокіх, —
Я жыву ў душэ ў раю,
Між учуцьцяў сваіх сьветлавокіх.

Мая сьцежка не йдзе да дарог,
Разначынным народам стаптаных, —
Я іду паміж зла і трывог
Да вялікіх сваіх ідэалаў.

Маё царства — унутраны сьвет,
Дзе сумленьне дыктуе ўказы;
У сваім Царстві я вольны, як след,
І не знаю ня зла, ня прынады.

***

Самае лепшае ў жыцьці тое,
Да чаго чалавек імкнецца,
Бо нічога вялікага сваімі слабымі сіламі
Ён ня можа зьдейсьніць.
Толькі мэта, да якой ён ідзе,
Робіць шляхотнымі і прыгожымі яго высілкі,
Дзеля чаго нават тагды, калі ён нічога не дапне,
Яго жыцьцё не страціць сэнсу.
Трэба толькі мерыць сваё жыцьцё
Шчырасьцю сваяго імкненьня

У касьбу

Пад размахам рук чутны звоны кос
У такт жалобных шэптаў скошанай травы,
І кладзецца ў роўны, правільны пакос
Лоўкім узмахам узяты мураг лугавы.
А навокал звоняць песьнямі сваімі
Птушкі адначасна з музыкай касьбы
Усход зіяе ярка агня-жоўтым пасам
У аправе хмарак дзіўнае разьбы.
Урачыста сонца ўстае з-за лесу,
Ласкавым аблікам вітаючы ўсіх,
Хто яму ад сэрца шчырага падносіў
Звоны цяжкай працы й здольнасцей сваіх.

Мне не страшна...

Мне не страшная тая часіна,
Калі сэрца ірвецца ў грудзёх,
Калі хочацца жыцьцё пакінуць,
Каб не бачыці зла ў людзёх.
У гэты момант я чую, што сэрца
Агнём жыцьця і праўды гарыць:
І ніякая сіла на сьвеці
Не здалее яго патушыць.
Я баюся маркотнай гадзіны,
Калі сэрца не можа любіць,
Калі жыцьце не можаш адкінуць
І не можаш, як следуе жыць.
Бо ў той момант у душэ замірае
Выбух жыцьця ў ахвярным агні
І на месца яго выплываюць
Без пачуцьцяў пражытыя дні.

Камбінацыя думак М.Багдановіча

("Пантамэтры" і "Калі ў сакавіку")
Ў той час, калі нас спаткае нешчасьце ў жыцьці,
Мы не можам адчуць глыбіні тэй справы,
І толькі тагды, як ад нас гэты час аддаліцца,
Мы ўбачым ў ім жыцьця законную зьяву,
Бо ў працягу даўжэйшага часу пасьпее
Ператварыцца гэты "кавалак" грубага жыцьця
Сілай пачуцьця ў жэмчуг, — хоць перш
Ён груба крануўся да нашага сэрца.

Міхасю Васільку

У вашых вершах шмат ёсць смеху,
Але шмат таксама жалю
Аб сваёй роднай старонцы,
Што гібее пад цяжарам
Злой нядолі.
З грудзей рвецца крык пратэсту
Разам заклікам к змаганню,
Бо душа баліць і рвецца
Ад балючага жадання
Лепшай долі.
Гэту боль я разумею,
Бо не раз быў ёй прабіты
І не раз гарэў надзеяй
Знайсьці шлях агульнай мэты
Вызваленьня.
Толькі я цяпер не маю
Гэтай лёгкае надзеі,
І ўсімі сіламі шукаю
Непарушнае ідзеі
Адраджэньня.
Я з даследу думак вольных,
Пасьля доўгае развагі

Зразумеў, што сіла волі
Нас збаўляе іншым шляхам
Ад нядолі.
Трэба стаць душою вышэй
Усех трывог жыцьця ліхога,
Знайсьці ў сэрцы сваім сілу,
Утрымаць сваю свабоду
Між няволі.
Як не зломяць сілы духа
Ніякія крыўды жыцьця,
Як ніякая разруха
Не парушыць у нас пачуцьця
Вольнай сілы.
Дык тады нішто на сьвеці
Не забье ў душэ свабоды,
Нашу волю патрывожыць
І ў душы нашай зламаці
Дух свабоды.

Вязьням

Мой родны край, дзе бор, балота
Ляжаць шырока паміж ніў,
У тваіх разлогах чую шэптаў
Спакойна сумны пераліў
Паміж чароўна сумных згукаў,
Што напаўняюць родны край.
Яшчэ я чую стогны мукі,
Што льюцца з турмаў цераз край,
Пранікшы ў даль з-за сьценаў моцных,
З-за кратаў сумных, з-за замкоў.
Яны дапялі ў краі родным
Да самых схованых куткоў.
І скрозь, дзе толькі стогны тыя
Пачуюць вушы бедака,
Уздымаецца ў душэ трывога
І сэрца сьціснецца ў грудзях.
І хаця гэта боль нямая,
Што сэрца нашае грызе,
Не можа быць аружжам нашым
І не паможа мо ў бядзе,
Але няхай баліць нам сэрца,
За тых, чый стогн да нас ляціць,
Каб іхнюю ліхую долю
Пачуцьцем нашым асвяціць.
Няхай яны пры згуках нудных,
Ад лязгу дзікага замкоў,
Пачуюць наша спачуваньне
З усіх, з усіх радных куткоў.

Памяці Максіма Багдановіча

Мкнецца да берага мора магутнае,
Дзіка і грозна равець...
Хіба мо думы сэрца пакутнага
Хоча яно зразумець.

Хвалі бягуць чарадою да берагу,
Вечна шумяць і шумяць,
Але пачуцьці сэрца балючага
Ці-ж могуць яны пераняць.

Тое сэрца ніколі да іх не зьвярталася,
Іх гоман яго не чапаў,
Калі прад вачыма яны разьбіваліся,
Хвалюючы ў грозным навале.

Ад гэтага гулу, ад гэтага гоману
Далёка лятункі няслі,
Туды, дзе абапал прыгожага Нёмана
Разлогамі пушчы ляглі.

Дзе вечна разважна, спакойна і ціха
Шумяць верхавіны сасон,
Дзе людзі не могуць пазбавіцца ліха,
Й не ведаюць шчасьця спакон.

Вось гэтыя шумы спакойна развагай
Маглі б тое сэрца згадаць,
Маглі б яго думы цяжкія разважыць
І боль маладую уняць.

Згаілі б у магілі жыцьцёвыя раны,
Спакоілі-б смагу яны...
Але далёка бядак пахаваны
Ад роднай сваёй стараны.

***

Чаго сэрца баліць,
Як убачыць васеньнія фарбы,
Калі сонца глядзіць
Неяк нудна й халодна з-за хмараў?..
Можа, чуе, яно,
Што жыццё навакол замірае,
Калі нудна ў вакно
Віхура мокрым холадам грае?
Мо вядома яму,
Як прырода сумуе па летку,
З якім сумам зіму
Спатыкаюць завяўшыя кветкі.
У сапраўднасці мо
Сэрца чуе падобныя тоны,
Але-ж хіба яно
Не прадбачыць вясеньняга звону?
Яно верыць: вясна
Прыдзе з ласкай сваёй чарадою,
Але-ж вера сама
Не развее жалобных настрояў.
Бо каб радасць пачуць,
Трэ дазнаці і горач ад суму,
І жыццё трэба ўсё скалахнуць
Новай смагаю, новаю думай.
Трэба даці яму
Для падняцьця пачуццяў прычыну,
Бо жыццё — ня к чаму
Без імкненьняў, учуццяў і чынаў.
І як стане гарэць
Уся істота ад думаў і мараў,
Дык не будзе балець
Наша сэрца ад выгляду хмараў.

***

Гляне сонца з-за хмараў
На родныя абшары
Й усьмяхнецца прыгожаю ласкай,
Нашым вольным разлогам,
Нашым пушчам-аздобам
І лугам, што ўтапіліся ў красках,
Бо раўніны-разлогі
Наказуюць дум многа —
Вабяць сэрца таемнай развагай;
А ў пушчах гушчары
Вабяць песьняю чараў
Й паляць сэрца разумнаю смагай.
Харaство сенажацяў
Гоіць дух ад пракляцьцяў
І нясе яго ў вышу да сонца...
Аднак сонечным ласкам
Душы, песні і краскі
Выяўляюць сум нашай старонкі.
Чаго-ж край наш сумуе,
Калі бачыць і чуе
Столькі думаў, і песняў, і чараў?..
Бо народ тут нешчасны:
Ён не бачыць дзён ясных
І слязьмі палівае абшары
Сваіх ніваў разлогаў,
Сваіх пушчаў аздобаў
І лугоў, захаваных у красках,
Дзеля гэтага сонцу
Сумам вее старонка —
У адказ на ягоныя ласкі.

Адказ па пытанне Максіма Багдановіча

Упалі з грудзей пана бога,
Парваўшыся, пацеркі зор.
Яны раскаціліся ў небе,
Усыпалі сіні прастор
і гэтак маркотна і пільна
На край наш нядольны глядзяць...
Што ж чуюць яны там, што бачаць?
Чаго ўсё дрыжаць і дрыжаць?...

М.Багдановіч

Там чуецца стрыманы гоман
Шырока разлёгшых лясоў,
Спакойна там коціцца Нёман
Між пушчаў, балотаў, палёў.
І пушчы схіляюцца ціха
Да вольных люстраных грудзей
Спакойнага Нёмна, каб ліха
Яму растлумачыць свае.
Ён стрымвае бег сваіх хваляў.
Каб чуць, што гамоняць лясы,
Каб угледзецца ўважна ў далі
Раскошнай, хоць сумнай красы.
Каб помніць убогія вёскі,
Якія навокал стаяць,
І ціхія тыя бярозкі,
Што іхні спакой старажаць,
Каб ведалі долю ліхую,
Якую народ тут цярпіць,
Ды каб у люстраных, магутных
Грудзях сваіх усё затаіць.
А посьле, як дойдзе да мора
Яго таямнічы разьліў, —
Паведаці нашае гора,
Каб сьвет ўвесь аб ім гаманіў.
Ды сонца купае праменьні

Ў блакітнай яго глыбіне,
І тайну грудзей яго ясных
Для зорных вачэй дастае.
А зоры маркотна і пільна
На край гэты сумны глядзяць...
Яны да сябе яго клічуць —
Аб долі яму гаманяць...

***

Розныя колеры вясёлкавай дугі
Гэта — адзін промень, раскладзены хмарамі...
Таксама пачуцьці і думы душы,
Як пройдуць між буднёвым цяжарам,
Зіхцяць перайманьнем жыцьцёвай красы,
Робяцца нейкаю дзіўнаю дугою,
У якой, як ў вясёлцы, агні-паясы
Увесь сьвет аздабляюць сабою

На магілу М.Багдановіча

Засыпалі зямлёй цяжкай
Памёрлыя грудзі,
Але твае песьні вечна
Жыць між намі будуць.
Захавалі ў цёмнай ямі
Крышталь сьветлых вочаў,
Але сьвецяць яго думы
Нам пасярод ночы.
Пахавалі цябе, родны
Наш прарок — паэта.
Але чуе дух народны
Тваю песьню ў сьвеці.
Ты далёка пахаваны
Ад старонкі роднай,
Але мы тваю магілу
Будзем вечна помніць

***

Нудную песьню вецер заводзіць: —
Нешта ліхое прарочыць;
У коміні вые, нібы ліхадзей, —
Хоча забіці надзею;
Вее ў сэрца ён думай цяжкою, —
Кажа чакаці благога;
Б'ецца ў вокны са злоснай кпінай; —
Кажа жаданьні адкінуць;
Сьвішча таемна навокала хаты,
Рвучы учуцьці заўзята:
Што за насланьне?.. Неўжо немагчыма
Моцна страхнуці плячыма,
Каб збавіцца гэтых маркотных прароцтваў,
Якія нам вецер б'е ў вочы?..
Не слухайце дзікіх прароцтваў паганых,
Якія лунаюць над вамі,
Ўзбудзіце ў сэрцы магутную сілу,
Да волі сьвятога нахілу,
І будзе не тое, што вецер прарочыць,
А тое, што воля захоча.

***

Агарнуліся родныя далі туманамі,
Захавалася сонца за хмарнаю слотаю,
Спахмурнелі пэйзажы, імглою убраныя,
І раскіслі дарогі пад ліпкай плюхотаю;
Узіраецца поле шчарнеўшымі пожнямі,
Іншы шнур захвалюе ральлёю узнятаю, —
Толькі жыта рунее істужкай прыгожаю
Ды ўцякае хавацца за вёскай, за хатамі.
Гэта рута зялёнае руні лагоднае
Нешта дзіўна-таемнае сэрцу вяшчуе...
Хто згадае? Той ў гэту пару непагодную
Тугі цяжкай і болю ў душы не пачуе.

***

Мы маліліся.
Нашы маленьні
Узьляталі да неба гарачаю хваляю,
І мы верылі,
Што над намі
Нехта зорку прад шляхам да долі запаліць.
Бо мы думалі,
Што наша доля
Недзе жыве ў салодкім забыцьці,
Ды праканаліся,
Што гэтай дарогай
Не можам ліха сваёга пазбыцца.
Мы плакалі.
Нашыя стогны
Рвалі ў кавалкі збалеўшыя грудзі.
І мы верылі,
Што крык пакуты
Нашу недбалую долю разбудзіць,
Бо мы думалі,
Што наша доля
Недзі ў далёкім сусьвеце начуе.
Ды праканаліся,
Што нашых стогнаў
Ніякая сіла нідзе не пачуе.
Дык парашылі мы
Дакладна абдумаць
Шляхі свайго жыцьця ў цемры сусьвету,
І мы дазналіся,
Што доля будзе
Тагды, як створым мы дарогу да мэты,
Бо мы ўбачылі,
Што долю стварае
Шчырая праца на ніве жыцьцёвай...
Хутчэй жа да працы,
Хто шчасьця жадае: —
Працуй і ачысьціш шлях жыцьця цярновы.

Песьня сьмерці
Наследаваньне з Некрасава

Чаго сэрца мае засмуцілася?
Мо чакаеш недолі ліхой?
Дык пакінь... Хіба ж мы не вучыліся
Здабываці спакой барацьбой.
Не сумуй: няхай ліха угледаецца
Нам у вочы. Хай кліча на бой,
Мы яму адказаць не спужаемся
Незламанаю воляй сваёй.
Не сумуй. Хай яно уздымаецца
Над бездольным гаротным жыцьцём.
Дабрабыт мы спрабуем стварыці
Не зламаным у бядзе пачуцьцём.

***

Працоўны Волат,
Бяры свой молат
І бі жалеза,
Колькі ўлезя.
Сталь пагнецца,
І адазьвецца
Сіла ўсюдых
У сэрца люду.
Волю скалыша
І ў сэрцы напіша
Думай балючай
Крыўды адчуцьце,
Што нізіць працу
Перад палацам.
Хай свет пачуе
Сілу сьвятую
І тую крыўду,
Што сэрца крышыць
Цяжкаю думай
Пачуцьця глуму

***

Я працую, як вол —
Пан без працы жыве
І сьмяецца з мяне небаракі,
Што працую дарма,
Бо не ўмею як след
Дабрабыт у жыцьці збудаваці.
А адзетак на мне,
Як на старцу якім: —
Пан сьмяецца і з гэтай галечы,
Кажа, што такі я
Урадзіўся дурны,
Бо не ўмею, як трэба, адзецца.
Голад душыць мяне: —
Пан сьмяецца ізноў
З маей цяжкай, галоднае долі,
Кажа, што дурны я
Ўсё працую адно,
Ды не ўмею патрэбаў здаволіць.
І паняцьця ў мяне
Аб навуцы няма: —
З цемнаты маёй пан насьмяецца,
І ён зрадзіць мяне
За маю цемнату,
Як калі да таго даведзецца.
Ой не думай, панок,
Што калі ты з навук
Здолеў рожных даведацца дзіваў,
Дык вучоней мяне, —
Не, вучоны і я,
Хоць вучыўся я, праўда, без кнігаў.
Мяне праца вучыла
Й дала зразумець,
Што без працы пражыць немагчыма,
Дык хаця я галодны,
Аднак сьвет я кармлю
І трымаю сваімі плячыма.

Усё праца тварыла
І творыць далей
І нарэшце ўвесь сьвет заваюе,
Бо яна дае сілу,
Яна вучыць жыць
І яна ўсе царствы будуе.

***

Ўсё шуміць і шуміць векавечны наш бор
І аб нечым гамоніць й гамоніць...
Пэўне, думу ўсё думае ён аб вякох,
Што ад веку ідуць й праходзяць.
Кажа казкі ён нам аб мінулых часох,
Калі зьверы тут вылі і вылі,
А на мейсцы.. на мейсцы ўзараных палёў
Пушчы важна гудзелі й гудзелі.

Якубу Коласу

Сыну зямлі Беларускай —
Паэту яе
Сьпевайце зялёныя пушчы
Песьні свае.
Адвеку Вы край наш узлюбілі
І ў грудзях яго
Такую-ж любоў запалілі
Да краю свайго.
За гэтую шчырую любасць
І песьняў яго
Вітайце, вітайце ўрачыста
Паэта свайго.

З зімовых настрояў

Халодныя тоны
Паклалі марозы
На родны абшар.

Мяцеліцаў звоны
І мёрзлыя сьлёзы
Уздымаюць адчай.
А сэрца гарыць
І ірвецца да сонца,
У краіну сьвятла.
Не могуць здушыць
Гэтых моцных жаданьняў
Мароз і зіма,
І толькі ўзбуджаюць
У сэрцы пачуцьце
Прыгожай тугі,
З якой мы убачым
Рэльефняй і шырэй
Сьвятла берагі.

***

Беларусь! Ты мой край дарагі,
Я тваім хараством зачараваны,
І хацеў бы я лёс твой благі
Спаліць думкай сваёй агнёваю!

***

Запалілася сэрца каханьнем
Да бяздольнай краіны мае;
Дык няхай гэта любасьць сьвітаньнем
Беларускі прастор абайме.

***

Я радзіўся ў краіне лясоў і балотаў,
У старонцы славян Крывічоў,
Дзе неба пад раньня ірдзіць пазалотай
Самотна гарачых агнёў.
Я вырас у хаці нядолі багатай
Без велькіх пачуцьцяў й пястот.

З дзяцінства любіў аб усім разважаці,
Ува ўсім дахадзіць да істот.
Мне доля не клала гатовага сьледу
У шуканьні праўдзівых дарог,
Хоць думаў ісьці я прадзедаўскім сьледам,
Ды гэтак не вырашыў Бог,
Бо даў ён мне розум і шчырае сэрца,
Што жыцьце бярэ і дае.
І ўрэшце я мусіў ім толькі паверыць
І ў іх назваць шчасьце свае.

***

Нашто сэрца мае растраўляеце,
Што пачуць ад мяне вы жадаеце?
Што магу я вам даць?
Што магу вам сказаць?
Каб я мог вам ад роду да сьмерці тлумачыць,
Дык даць вам магчымасьць у сэрцы ўбачыць
І тады б ня мог я
Свайго пачуцьця.
Немагчыма сказаць, што ў сэрца захована
І чым жыцьце ўсьцяж йдзе да новага й новага
У сваёй моцы і мэце
У недаступным сусьвеці...
Калі хочаце знаць тайну сэрца маёга,
Дык можаце знаць гэта з сэрца сваёга,
Як дазнаеце ў ім, —
Што знаю я ў сэрцы сваім.
А ні якага не жадаю шчасьця містычнага раю,
А ні багацьця, ні роскашы й славы,
Ні магчымасьці правіць другімі,
Ні гардзіцца дзеямі сваімі.
І тады ўжо ніякая сіла на свеці
Не парушыць нам шчасьця жыццёвага стану,
Бо воля ўнутры ў істоці
Навокал усё асьвятляе.

ПРОЗА



Тайна маны

Праўда ня гэта, што было, ёсьць і бывае, а гэта, што павінна быць па волі Божай

Л.Талстой

Прайшоў год пасьля сьмерці Сідара і зьвязаных з ею падзей. Яўхім жыў як даўней, хаця часта ўздыхаў. А інагды тупа туманіла вочы і дзьве сьлязы, быццам дзьве каплі срэбра, каціліся па барадзе і падалі на зямлю. Зямля, зямля! Палічы, сколькі гэткіх спакойных сьлёзаў паглынула ты, гэтак сама сколькі бурнае крові схавала ты? Гэты год быў збытэчны кроўю! Дзьве рэвалюцыі адна за другою праляцелі гураганам, а потым немцы захапілі шмат абшараў і дайшлі да Воршы.

Як не палохала вайна жыхароў Менскага краю, як ня жудасныя былі немцы з вядомымі зьдзекамі, але вайна прайшла, і ўся вёска разам з Яўхімам ўбачылі гэтых немцаў. На вялікае зьдзіўленьне, яны заўсім не ўчынілі ніякіх зьверскіх гвалтаў, якімі перапоўняныя былі чуткі і газэты. Яўхім, як і іншыя вядомыя там асобы, былі да крайнасьці зьдзіўлены гэтым. І цяпер толькі яны зразумелі ману і значэньне яе. Каб распаліць злосьць у народзе на немцаў дзяржаваю была пушчаная вялікая брахня. Але гэтае хітрасьць ня дапяла мэты. Гэтыя чуткі толькі абманвалі і палохалі, і бяз гэтага напалоханы народ. Калі Яўхім за сваю ўласную люльку не мог, як належыць, раззлавацца[1], дык канешне не мог ён бяз дай прычыны раззлавацца на жудаснага немца.

Ў год пасля Сідаравай смерці Яўхім парашыў схадзіць ў царкву, праслухаць абедню і адправіць паняхіду. Абедню ён, як даўней, праслухаў шчыра і ўважна, хаця, вядома, таінства асталася тайным. Пасьля абедні поп па звычаю пачаў павучаць "паству". Шмат чаго ізноў казаў поп: ня трэба красьць, ня трэба ілгаць, трэба падпарадкавацца ўладам, бо няма ўлады, якая былаб ня ад Бога. Гэтак намаўляў поп, каб забяспечыць сваё істнаваньня. Далей, каб апраўдаць сваё намаўляньне, поп прыпомніў, што Хрыстос вучыў: любі ворагаў сва-

іх, бласлаўляй пракленствуючых цябе, і маліся за крыўдзячых цябе.

Яўхіму гэтыя словы спадабаліся дзеля таго, што яны вымаўляліся прыгожа, быццам музыка, і зразумела, як дзень. Яўхім нават паўтарыў іх і ўспомніў, што казаў поп год назад у памятлівую нядзелю, калі Яўхім маліўся за здароўе Сідара. Тады поп намаўляў памірацъ "за веру, цара і ацечаства". Яўхім ня прыстаўся на гэтым, бо ня мог разважацъ.

Маральныя і этычныя пытаньні ня датычацъ мужыка. Разрашацъ іх яму ня цікава. Сткуўшыся прыпадкова, два намаўляньні, супраціўныя адно другому, ня прыпынілі ягонага сумленьня і ня прымусілі яго разважацъ і разрашацъ.

— Кажуць што хочуць... Хто ведае... Ніхто праўды ня ведае...

Але яму ўспомнілася, што праўда напісана ў Эвангеліі.

— Вось каб ўмеў чытацъ... Купіў бы ды пачытаў... А гэтак што пазнаяш...

Ён пашкадаваў аб тым, што ня ўмеў чытацъ, але ня шкадаваў аб тым, што тыя, каму даручана ягоная душа, ілгалі, ілгалі часта і незаметна. Ён даўно ведае, што яны часам лгуць, але гэта ня трывожыла яго. Ён шчыра слухаў абедню, бо абедня ня падобна да маны. А поп, вядома, грэшны чалавек, вазьме ды й абмане. Яго абавязак вучыцъ людзкасьць, але хто яго праверыць.

І гэтак усюдых, дзе народ нявучоны, думаць ня можа, чытацъ ня ўмее, разважацъ ня ведае дзеля чаго, ўсё навокала здаецца такое, як трэба. Часам маленькая мана пакажацца на від і схаваецца. Ніхто яе не заўважыць, а калі хто й ўбачыць, ня зьверне добрай увагі, мо не дзеля таго, што не вучоны, а дзеля таго, што кожны любіць ілгацъ, пад прымусам тэй-жа прыгожае тайны. І гэта маленькая прызвычка ілгацъ прымушае выбачацъ аблічча маны, якая часам пакажацца на вачу. І ніхто ня можа дагадацца, што гэта маленькае ілганьне хавае пад сабою тайну вялікае маны, ў якое топіцца сьвет.

Гісторыя аднае сьмерці

Калісь-то даўно, — як было яму гадоў восем, — чуў ён ад маткі і запамятаў некалькі эвангэльскіх навучэньняў. Матка ягоная была шчырая хрысьціянка-энтузіястка, але хоць была няграматная, умела цаніць тое сьвятое эвангэльскае, што чула ад другіх і гэтага вучыла і свайго сына.

А сын, цяпер зачынены і замкнёны ў тоўстых сьценах вастрогу, пачаў успамінаць гэтае матчынае навучэньне.

Думкі яго ішлі і далей успамінаў ён усё з нейкай радасьцю і дзіўнасьцю. Успамінаў ён тое, што малым чуў і як ён аб гэтым думаў. Успоміны гэтыя не прайшлі бяз сьледу.

Апрацівела яму хадзіць узад і ўперад па вастрожнай цэлі, ён лёг на сваю жорсткую пасьцель і заснуў. Прысьніўся яму дзіўны сон: быццам сам Хрыстос прышоў на вастрожны двор і пачаў вучыць, а ўсе арыштаваныя павыходзілі яго слухаць. Ззаду стаіць вастрожнае начальства і пазірае. Яму зрабілася добра і лёгка, і ён зсупальвае ўсю сваю памяць і сваё пачуцьцё і, як мага, стараецца ўглыбіцца ў значэньне таго, што гаворыць Вялікі Божы Вучыцель.

І вось Хрыстос кончыў і кліча яго пальцам да Сябе. Ён падходзіць.

— Што ж гэта ты доўга так разважаеш, але ня йдзеш да мяне?

— Я ўжо даўно хачу да Цябе... — адказвае ён — і прачынаецца... тоўстыя сьцены, краты, латка неба...

Ён доўга ляжыць, як адзервянелы, — потым раптам схопліваецца, плача і кідаецца да вакна з крыкам: "Божа! Я жыць хачу!.. Я хачу волі!.. Божа! Я хачу праўды! Дзе праўда?".

А на дварэ яму крычыць штось вастрожнае начальства, але ён ня чуе. Тады ўваходзіць наглядчык і вядзе яго ў карцэр. Вечарам яго йзноў прывялі ў адзіночку.

Праз сон ён ізноў схапіўся, кінуўся да вакна, пачаў біць шыбы, хапіў краты, штось шаптаў і плакаў. Знізу штось крычалі даглядчыкі, але ён ня чуў іх.

І вось дзіўны сон яго ў чуцьці ўзбуранага і паднятага духа зышоўся — крыкнуў, заенчыў і ўпаў.

Ён пачуў, што кроў цячэ па целе і ён ляжыць на памосьце, але ня мог зразумець, што гэта значыць, пакуль не прышлі даглядчыкі і ня вынесьлі яго ў гошпіталь. Толькі тады ён зразумеў, якая яго спаткала ява, успомніў свой сон і апошнюю падзею.

На сэрцы ягоным зрабілася лёгка і неяк радасна. Ён усьмяхнуўся і падумаў: — Далі мне на вечную, але не на век. Цяпер я дастаў ужо сапраўды на вечнасьць...

Цераз гадзіну пасьля гэтага ён адышоў у праўдзівую вечнасьць...

***

А як-жа ён папаў сюды ў гэты вастрог?

Запалілася сэрца пачуцьцём помсты за несправядлівасьць, за зьдзек, за махлярствы. Запала ў голаў неспакойная думка палючай помсты... і ён адамсьціў. Адамсьціў малады батрак несправядліваму гаспадару і ўцёк. Калі апынуўся ён за вёрст дзесяць ад месца сваёй помсты, тады ён пачуў волю і на волі пачаў разважаць.


Я-ж ня зьвер, а чалавек. Калі я бедны, дык гэта няшчасьце маё, але ніхто ня мае права таптаць маю чэсьць чалавечу. Я не рабіў гэтага дзеля свае карысьці, а калі замучыўся ў рабоце, дык ня ў меру і вол не пацягне — і ўсяму ёсьць канец. А калі ён у працы, над маім істнаваньнем зьдзекуецца, дык маю права чалавека з болю заенчыць і застагнаць — нішчыць яго і руйнаваць...

Гэткаю лёгікай апраўдываў сваё палажэньне бедны малады батрак. І ніхто не заступаўся за яго з тых людзей, што капашыліся ў панскім гаспадарстве, праклінаючы яго і жадаючы яму праўдзівае кары. Але гэта кара яшчэ доўга пакуль што не прыткнулася яго.

Быць вольным працаўніком, які зарабляе сабе на хлеб працаю свабоднаю, ён ужо ня мог, бо над ім павіс цяжар закону, закону паноў, закону багатых і вялікіх — які абавязаны быў пакараць яго за варункі ягонае помсты.

Кара спаткала яго цераз два гады.

Два гады таму назад ён адамсьціў за зьдзек і крыўду, а цяпер на жыцьцё глядзеў, як на дарэмнае праваджэньне часу і для яго жыцьцё было бяз сэнсу і вагі — усё роўна: здабываць сабе яду на жыцьцё, катарга ці сьмерць.




Агляд жыцця Заходняе Беларусі

Уступ

Ад нізкага часу, пакі Заходняя Беларусь пачала прадстаўляць адзнакі самастойнага ўчэння, кожны мысляючы і пачасці шукаць нейкага выхаду з утварыўшагася палажэння, справа стан жыцця вялікага культурнага заходу, як у [illegible] даўнюю зрабіць асноўную справу, дзе на разнастайных выхадах будаваць дальнейшае ўлад жыцця. Адзнак на дзеля справа у нас пайшла на рэлігійныя кіруе трыба. Пакуль Заходняя-Бе-


Фрагмент першай старонкі рукапіса П.Сяўрука.



Вільня, [illegible]

Пасылаю ліст. Ліст Ваш я [illegible] Дзякую Вам за усіе Вашыя меры маю надзею пагаварыць аб гэтым справе пры ўезду да Вас каля 24/VII. Вырашу ў тым, што Вам [illegible] Пасылаю прыехаць да Вас за 1–2 дні рамеш.

Адна з паштовак беларускага дзеяча Ігната Двар чаніна да П.Сяўрука.



Дэкляцыя.

Я ніжэй падпісаны(ая) _____ (імя і прозьвішча) грамадзянін (ка) Польскае Рэчыпаспалітае, беларускае нацыянальнасьці, жыхар _____ (назоў воласьці, места) _____ (назоў гміны) _____ павету _____ (назоў павету) як бацька — маці — апякун дзіцяці—дзяцей—у школьным веку.

1. _____ (імя дзіцяці) 3. _____ (імя дзіцяці)

2. _____ (імя дзіцяці) 4. _____ (імя дзіцяці)

на падставе артыкулу з уставу з 31 ліпня 1924 г., зьмяняючага некаторыя пастановы аб арганізацыі школьніцтва (Dz. U. R. P. № 79, рог. 766), жадаю ўвядзенняў істнуючую—маючую адкрыцца публічную народную школу ў _____ (назоў воласьці, места) беларускае выкладовае мовы.

Дня _____ 192__ г. _____ (Уласнаручны подпіс)

Да Школьнага Інспэктара

ў м. _____ (назоў места)


УВАГА: У такіе дэклярацыі непатрэбныя словы закрэсьліць.

Друкарня Я. Плавіка Вільня Нямецкая №

Бланк заявы з патрабаваннем вучыць дзяцей па-беларуску. Сярэдзіна 1920-х г.



Сястра Пятра Сяўрука Вольга Якаўлеўна. Пасля смерці брата ўзначаліла скідзельскі гурток ТБШ. У ліпені 1943 г. загінула ў спаленай фашыстамі вёсцы Пузавічы (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Сястра Пятра Сяўрука Марыя Якаўлеўна. Менавіта дзякуючы ёй захаваліся рукапісы Пятра. Здымак 1928 г. (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Скідзельскія хлопцы на Каляды 1939 г. Чацверты і шосты злева малодшыя браты Пятра Сяўрука Уладзімір і Іван (фота з сямейнага архіву Валянціны Фёдараўны Сяўрук).



Бацька Пятра Сяўрука Якуб Восіпавіч з сынам Іванам, нявесткамі Любай і Валянцінай і ўнукамі Верай і Мішай. 1951 г. (фота з сямейнага архіву В.Ф.Сяўрук).



Пляменнік Пятра Сяўрука пісьменнік Мікалай Іванавіч Дзелянкоўскі – сын малодшай сястры Пятра Надзеі і актывіста ТБШ і КПЗБ Івана Дзелянкоўскага.



Сем'і Сяўрукоў і Чабатарэвічаў у Скідзелі. У другім радзе крайняя злева маці Пятра Сяўрука Юля Міхайлаўна. Канец 1950-х гадоў (фота з сямейнага архіву В.Ф.Сяўрук).



Сябры скідзельскага гуртка ТБШ і прыхільнікі "талстоўства": (злева направа) Вольга Сяўрук, Даніла Скварнюк, Рыгор Быцкевіч, невядомы нам, Марыя Сяўрук. Здымак 1930-х гадоў (фота з сямейнага архіву Маргарыты Францавай).



Прыхільнікі філасофіі непраціўлення злу насіллем. У першым радзе злева направа: Даніла Скварнюк, невядомая нам пацыфістка з Варшавы, Іван Шмойла. У другім радзе: Вольга Сяўрук, Аляксандр Мазалеўскі, Марыя Сяўрук.

Калі яго прывялі на суд і пачалі дапрашываць і абвінавачываць, дык яму нават, як быццам, было дзіўна: чаго яны хочуць, гэтыя людзі, бо справа саўсім простая. Калі не патрэбна, каб ён жыў, дык вяроўку на шыю і... ўсяму канец. Але судзьдзі пастанавілі іначай і асудзілі яго на вечную "адзіночку".

Пад суровым канвоем прывялі яго за вастрожныя сьцены, апісалі з ног да галавы, пасьля завялі яго ў маленькае памяшканьне з адным вакном, з моцнымі кратамі, з жалезнымі дзьвярмі. І вось гэтак будзе яму да сьмерці.

Як прасядзеў ён адзін дзень у вастрозе, дык пабачыў, што ляпей сьмерць, чым гэткая няволя. І нават ён зрабіў бы сабе сьмерць, каб было чым.

Прабыўшы нядзелю, ён як-бы звыкся з становішчам і яму здавалася, што воля бяз радасьці — тое самае, што жыць цё бяз волі. Якую карысьць ён меў з волі, калі трэба было жыць цаною цяжкіх непасільных ахвяр нейкаму кравапіўнаму "бажышчу", а жыцьцё ягонае аберагалі ў няволі вастрожнай даглядчыкі — шмат даглядчыкаў.

Ён памалу звыкся з тоўстымі сьценамі, з цэмантовым памостам, з моцнымі кратамі, з жалезнымі дзьвермі, з дзесяцьмі мінутамі спацэру ў круг па двары вастрогу, з дрэннай стравай і г. д.

Жыцьцё не кацілася, а пхнулася, але жыць прыходзіцца і ніякія абставіны ня могуць яго стрымаць, пакуль у сэрцы б'ецца кроў. Жыцьцё ідзе сваім шляхам, пакідаючы ў баку тое, паміж чаго яно ідзе.

У маладой яго галаве пачалі роіцца дзіўныя думкі і злажыліся свае асабістыя пачуцьці да моцных тоўстых сьцен, строгага каравулу і латачкі неба, якая віднелася з ваконца з кратамі...

І так малады батрак адышоў у праўдзівую вечнасьць.

Такая гісторыя аднае сьмерці.

Чыталі

У хаце селяніна Кастуся Чапенкі сабралася вялікая грамада сялян.

— Што яны там робяць? — спытаюць людзі — Мо так сабе?

Не ... чытаюць.

Міхал Нямыты, які, як кажуць, быў у горадзі і за горадам, і ў турме і за турмою, чытае ім "Программу социал-революционеров".

Перш-на-перш сяляне ніяк не цямяць, што значыць гэта "Программа социал-революционеров". Нямыты, хоць разумее ў гэтым нябольш, як усе, але дзеля таго, што ён адважнейшы за ўсех, бярэцца тлумачыць тое, чаго ніхто не разумее.

— Праграма, — кажа ён — калі нехта нечага хоча, напрыклад, вось ты захочаш нажаць летам збожа і прадаць, дык гэта і будзе твая праграма.

— Ага! — гукнуў Арцём Лапцевіч, як быцца ён адразу ўсё уцяміў як трэба.

— Але што гэта "соцыал-революциянеры"? — пытаюць другія.

Тут нават сам Нямыты не ведаў, што адказаць, і трохі запнуўся, не ведаючы, на што адважыцца. Потым адважыўся.

— Соцыал-ревалцыянеры, гэта бачыце што... Цяпер такі сьвет пашоў, што ўсе разбіліся на партыі, або на гурткі. Дык вось тыя, што хочуць таго, што паказана ў гэтай праграме, завуцца сацыял-революцыянеры.

— Добра, — згадзіўся з гэтым той самы Арцём Лапцевіч.

Іншыя сяляне, хто перхнуў, хто люльку выстукаў, апаражніў ад згарэлага тытуню і папхаў новым. Адным словам усе гатовіліся уважна слухаць.

Слухалі добра, але цямілі слаба, бо словы у праграме былі такія, якія сяляне чулі ў першы раз. Мо, калі быў хто ў судзе, дык даводзілася яму чуць гэтае самае, але ўсе роўна напэўна ніхто ня ведаў, што як трэба разумець, і толькі дагадвалі, што як трэба, вядома, кожнаму была поўная воля разумець ўсе, што захоча, так як ён сам захоча. Дзеля гэтага чытаньне было вельмі цікавае, толькі часам трапляліся такія словы, якія ўжо зусім не лезлі ў галаву, бо сяляне не маглі

ніяк аднесьці іх да якого кольвечы разуменьня. Пыталіся ў Нямытага, што значыць гэты "лёзунг", альбо "прынцып".

— "Лёзунг? — казаў Нямыты, адвярнуўшыся да селян і паклаўшы рукі на брашурку — Лёзунг — гэта значыць тое, чаго асабліва хто хоча: жаданьне вельмі неабходнай рэчы.

Арцём Лапцевіч, якога чытаньне цікавіла больш за ўсіх, слухаў тлумача, падняўшы галаву, другія паспускалі голавы і хто калупаў пальцам у люльцы, хто глядзеў на парваныя лапці. Урэшці "лёзунг" такі зразумелі. Потым спатыкнуліся на "прынцыпі".

Прынцып — тлумачыў Нямыты — будзе тое, дзеля чаго хто чаго хоча, напрыклад, вось ты прадаеш хлеб, каб купіць солі, дык гэта будзе твой прынцып.

Сяляне, якія ўсё роўна ня ведалі ніякіх прынцыпаў, згадзіліся з гэтым. Асабліва рады быў той самы Арцём Лапцевіч, якому ад чытаньня, здавалася, неба адчыняецца.

Пасьля яшчэ зайшла гутарка аб "пазіцыі сацыял-рэвалюцыянераў".

Сяляне ведалі, што "пазыцыя" бывае на вайне, дык не пыталі тлумачэньняў, бо ніхто ня быў на вайне і не ведаў — бы ўсё роўна, ў якой мейсцовасьці займаюць пазыцыю сацыял-революцыянеры.

Чытаньне йшло далей, адчыняючы слухачом нешта вельмі дзіўнае, бо нікому незразумелае. Хоць Арцём Лапцевіч быў вельмі здаволяны, але Навум Забабона, наадварот, ўвесь час усьмехваўся, пазіраў неяк скоса на сялян ды ўрэшці сказаў:

— Э, што тут слухаць, давайце лепей будзем казкі казаць.

Арцём зірнуў на яго за гэтую гутарку як на вялікага грэшніка, другія паглядзелі на яго трохі мякчэй, як бы хацелі сказаць: "Усё роўна, ці Казка, ці праграма".

Урэшце няцярплівы Забабона дачакаўся канца. Іншыя сяляне кашлялі, перхалі, храплі, як быццам перад гэтым ім нешта займала дух. Цераз паўгадзіны яны саўсім заспакоіліся і пачалі абгаворваць справу "Программы социал-революционеров". Хто казаў, што вельмі добра напісана, а хто — што лепей было-б, каб зямлі далі, а не праграмы нам пісалі. Розных дагадкаў і разважаньняў для гутаркі хапала. Толькі аднаму Арцёму нічога не трэба было, бо ён праграмай быў вельмі здаволяны.

Прагаманіўшы гадзін дзьве, селяне пачалі патроху апаражняць хату Кастусю і вяртацца ў звычайнае жыцьцё ад высокай "праграммы".

Кожны ішоў да хаты з такім сумленьнем на душэ, як быццам ён зрабіў нешта вельмі важнае, або праслухаў абедню.

Зразумела, бо-ж сяляне чыталі...

Споведзь Беззямельнага

Адзінае права, якое прызнае яму закон, гэта хадзіць па вялікай дарозе да таго часу, пакуль ён не захістаецца ад зморы, бо ён не можа астанавіцца, але павінен хадзіць.

Грант Ален[1]

Я радзіўся на зямле, але не маю права карыстацца ею, г.з. жыць на ёй. Мне пазволена толькі прайсьці па дарозе між палёў і лясоў, да якіх я не маю права дакрануцца. Я павінен ісьці, і скрозь, дзе не пайду, нідзе не знайду мейсца сабе, бо скрозь знойдзецца чалавек, які мяне пражане з "свае" зямлі. Ёсьць людзі, якія лічаць зямлю сваёю, а я не маю на гэта права, дзеля гэтага я выкінены на дарогу жыцьця і павінен ісьці і ісьці, бо немагчыма астанавіцца. Калі я стану на дарозе, дык мяне стопчуць, здратуюць; дзеля гэтага я павінен ісьці без канца.

А куды ісьці?


Шукаць праўды, бо інакшай мэты на нашым адвечным шляху не магчыма знайсьці. Калі ўжо немагчыма жыць на зямле, дык няхай наша векавечная дарога мае мэту і гэтым здыме з нас цяжар вечнае хады.

Мы пройдзем сьвет, але знойдзем праўду; знойдзем яе не за морам, не за гарамі, але ў пачуцьці крыўды, якую ўчынілі нам тыя, што пазбавілі нас зямлі.

Вас, што заўладалі вялікімі абшарамі зямлі і пазбавілі нас гэтым спакойнага жыцьця на ёй, мы імянем свае крыўды і імянем векавечнае Праўды пытаем: на якой падставе Вы пазбавілі нас права карыстацца зямлёю? Пакажэце той тэстамент, паводле якога прырода адабрала ад нас права жыць на зямле. Дакажыце сваё права перад векавечным законам жыцьця; які заложаны у нашым сэрцы. Мы адчуваем права карыстацца зямлёю і патрабуем яго, дык значыць, прырода нас гэтага права не пазбавіла. Бо каб яна нас пазбавіла права карыстацца зямлёю, дык адабрала-б ад нас патрэбу гэтага права і адчуцьце яго. Калі ж мы гэтую патрэбу і гэтае

адчуцьце маем у сабе, дык значыць мы не пазбаўлены права законна. Вы беззаконна пазбавілі нас нашага законнага права і на мейсцы законаў прыроды паставілі свой закон, закон гвалту, і гвалтам думаеце скасаваць законы прыроды.

Але дарэмна... Мы трэбуем права жыць на зямле і мы адчуваем гэтае права, і ніякі гвалт ваш не скасуе гэтае патрэбы і гэтага пачуцьця, значыць, не скасуе нашага права жыць на зямле. Дык рана ці позна сіла гвалту ўступіць мейсца сіле натуральнага закону, бо натуральнае заўсёды дужэй ад ненатуральнага, якімі-б сіламі зброі і гвалту яно не баранілася.



ЛІСТАВАННЕ

ЛІСТ У "БЕЛАРУСКУЮ КНІГАРНЮ"[1] АД 21 ЛЮТАГА 1922 ГОДА.

21 лютага 1922 г.

Паважны грамадзянін!

Шчыра дзякую Вам за Ваш ліст на мае запытане ў Вашу кнігарню. Дзякую Вам таксама за газэты. Яны хоць трохі асьвяцілі дзеля міне тое, што робіцца ў сьвеце і на нашай пакрыўджанай зямле.

Я, як быў яшчэ ў Расеі, паслаў у Маскоўскі "Наркомпрос" ў выдавецтва некулькі казак. Можа Вам ведама ці яны надрукаваны, ці не.

Цяпер я пачынаю пробаваць сваю моц, тварыць што кольвек пабеларуску. Пасылаю ў гэтам лісьце дзьве вершы. Калі яны пакажуцца Вам не заўсем кепскімі, то прашу Вас перадайце іх у беларускія газэты...

ЛІСТ У БЕЛАРУСКАЕ ВЫДАВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВА[1] АД 28 СТУДЗЕНЯ 1924 г.

Скідзяль 28 студзеня 1924 года.

У Беларускае Выдавецкае Таварыства.

Звяртаюся да Вас з сваею пякучаю патрэбаю збаўленьня. Ад Вас я атрымаў два гады назад першыя прамені прасьвету ў сваім цёмным кутку пад Польшчаю, цяпер звяртаюся да Вас, каб Вы далі мне сьвету больш. Прыкладаю тут "Уступ" да вялікага твору "Бо ёсьць". Гэты твор я пішу па-расейску, але пераклаў уступ па-беларуску. Ня ведаю, ці задаволіць Вас пераклад, не кажучы аб сэнсе твору. Я ведаю, што памылак орфографічных і памылак мовы будзе вельмі шмат. Але за гэта не абвінеця, бо гэты пераклад я зрабіў не прачытаўшы ніводнага радку беларускага правапіса, навучыўшыся першым адзнакам беларускае мовы чытаньнем беларускіх газэт з дапамогаю аднаго "Маскоўска-беларускага слоўніка" Гарэцкіх. Апрача гэтага "слоўніка" да беларускіх газэт я амаль ніц ня чытаў, што вядома, вельмі мала дзеля азнакамленьня з беларускаю моваю. Але я ў гэтым не вінаваты. Я маю пякучае жаданьне як найлепей азнаёміцца з беларускаю літэратураю, асабліва з беларускімі народнымі творамі. Кожны народ наагул цікавіць мяне сваёю сфінксаваю загадкаю свае душы,

якую я [неразборліва ў рукапісе — рэд.] разгадваць у творах народу. Гэтакую разгадку я яшчэ ў 1921 гаду зрабіў над душою расейцаў у сваім твору "Незаметный великан". На жаль я пасьпеў толькі напісаць дзве часткі гэтага твору (I аб народзі, II аб прыказках) а трэцяй не пасьпеў зрабіць затым што хутка выехаў да Польшчы (III аб народным творстві) і тут ужо няма дзе ўзяць гэтага творства, каб растлумачыць яго. Але найбольш цікавяць мяне пытаньні, якія я выкладаю ў твору "Бо ёсьць". Выкладаньне гэта даволі цяжка для маладога хлопца (мне цяпер 19 гадоў), атрымаўшага малую адукацыю (скончыў I год другое ступені ў савецкай школі) ды апрача гэтага без ніякае дапамогі добрых кніжак. Аднак я спраўляюся аднаею любасьцю да свае працы і пішу вельмі хутка, гэтак II разьдзел (крыху большы за уступ) напісаў бадай за 4 гадзіны 26 студзеня.

Я сказаў, што вучыўся беларускае мовы чытаньнем газэт, дык вось цяпер я ў гэткім становішчы, што нават газэты няма за што выпісаць. Шукаючы выхаду з гэтага становішча я ўздумаў ізноў зьвярнуцца да Вас. Найдзеця выдаўца дзеля майго твору, або іншых твораў, бо ёсьць у мяне і апаведаньні, або друкуйце самы ці па беларуску, ці па расейску. У першым выпадку (мяркуйце па перакладу) я або сам перакладу, або нехай хто перакладзе. Ці можа надрукуеце яго ў зборніку "Заходняя Беларусь"[2], у апошнім выпадку я прасіў бы ў лічбу ганарару прыслаць I зборнік, бо выпісаць ня маю магчымасьці. А калі не падыдзе да альманаху, дык у кожным выпадку можаце апублікаваць уступ у беларускае газэці у тым ці іншым сэнсі. Праз газету можаце і адказаць мне, каб не траціць коштаў.

Мой адрэс: miasto Skidel, pow. Grodzieński, Kolejowa, Piotr Siewruk.

У поўнай надзеі на Вас. Пётр Сяўрук.

ЛІСТ АНТОНУ ЛУЦКЕВІЧУ[1] АД 29 ЛЮТАГА 1924 г.

Skidel, ul. Kolejowa P. Grodzieńskiego. Piotr Siewruk

Пав. Грам. Луцкевіч!

Выбачайце мне за маю адвагу. Але вы хочаце ведаць хто я... Дык гэтак: Я малады селянскі хлопец 19 гадоў. Прайшоў курс навучаньня толькі I ступень савецкае школы, але най-

большае навучаньне я атрымоўваў ад свае уласнае смагі асьветы. Гэтая смага прымусіла мяне да чытаньня. Я чытаў шмат, але вось ужо трэйці год як не чытаю ніц. І гэта мяне душыць, як пятля. Не магу жыць бяз кніжак, для гэтага шукаю розных спосабаў, каб дапяць свае мэты. Але ўсё дарма на ўсе мае лісты, якія я пасылаю, не атрымоўваю адказу. Напэўна што не даходзяць, бо тутэйшыя паштавікі мяне добра знаюць, дык ўсё, што пасылаю я да беларусаў напэўна ня пушчаюць. Нават на заказныя пісьмы няма адказу, напр[ыклад] ў "Змаганьне"[2] ад 31/XII — 23. Каб як адсланіць загароду я прыдумаў паслаць ліст на прыватны адрэс, і ў гэтым імкненьні мне дапамагла Ваша абвестка. Дык Выбачайця!

Не гледзячы на тое, што няма кніжак, я не спыняю сваіх думак аб творстве. Ў апошні час напісаў твор "Потому что есть", Уступ якога паслаў ў Беларускае Выдавецкае Таварыства праз Беларускую Кнігарню. Але вось ужо месяц, а адказу няма. Дадаваемы тутакі кароценькі артыкульчык ёсьць толькі адна рыса да велікага твору, які я буду пачынаць "Человек і человечество" (Чатыры кніжкі). Гэты твор абыйме шмат новых паняцьцяў, кшталтам паняцьця аб нацыянальнасьці і патрыятызмі. Гэтыя крытэрыі я разглядзеў тады, як ствараў Х разьдзел ў "Потому что есть" — разьдел аб паняцьцях. Тады я ўбачыў, што ёсьць шмат недарэчных паняцьцяў. Дзеля гэтага думаю нават стварыць вялікі "Слоўнік паняцьцяў" або "Межы", ў якім зьмешчу паняцьці аб Богу, аб дабрэ, аб сіле, аб неабходнасьці, аб магчымасьці, аб прыгожасьці і шмат іншыя ў асьвятленьні свайго крытычнага сьветапогляду.

Дык можаце сабе ўцяміць, якія трудношчы трэба перамагчы, каб стварыць што добрае ня маючы кніжак. Ў асабліваесьці цікавіць мяне ў справе "Человека и человечества" артыкул ў "Нашым шляху"[3] "Праз чалавечаства да беларускасці або праз беларускасьць да чалавецтва". Гэтак сама патрэбныя народныя творы. Але я ад Вас не вымагаю кніжак, я прашу аб іншам. Я прашу толькі пазнаёміць мяне з беларускім грамадзянствам Вільні, дапамагчы мне выйсьці ў сьвет, каб выпусьціць у сьвет якую кніжку, дык гэтакім чынам атрымаць патрэбныя срэдствы дзеля куплі патрэбных кніжак. Прашу аддаць гэты кароткі артыкульчык у "Беларускі Голас" [4].

Спадзеваюся на Вашу увагу. Чакаю ад Вас дапамогі... А калі не, дык мушу буду змагацца далей, купляць за апошнія

грошы паперу, аддаваць іх на паштовыя маркі і шукаць новых сьцежачак да выхаду, хоць толькі выпадак можа паказаць мне іх, падобна, які паказаў мне Ваш адрас. Дык заўважце, якія гэтыя траты, калі я нават ня маю кафтана на плечы. Толькі смага асьветы, смага ведаць праўду ня спыняе ў-ва мне імкненьня адчыніць сабе сьвет.

Буду чакаць ад Вас адказу. Адказаць можаце нават ў "Голасі Беларуса", бо беларускую газэту я атрымліваю так сама за апошнія грошы. Калі пажадаеце надашлю Вам свае творы ў расейскіх арыгіналах, бо па беларуску я пішу слаба. Перакладаў гэты артыкульчык з дапамогай маскоўска-беларускага слоўніка. Калі гэты пераклад добры, дык магу пералажыць і вышайупомяненыя творы. Каб навучыцца па беларуску мушу мець іншыя падручнікі, а каб купіць іх ня маю грошы.

Дык дапамажыце... Або выбачайце за тое, што патурбаваў Вас.

29 лютага 1924 году. З пашанай П. Сеўрук.

ЛІСТ АД АНТОНА ЛУЦКЕВІЧА АД 18 КРАСАВІКА 1924 г.

Малады Таварышу!

Выбачайце, што так доўга не адпісваў на Вашае пісьмо: усё парашкаджала то хвароба, то работа, якой заўсёды лішне многа.

Прачытаў Вашу заметку аб мове і нацыянальнасьці. На жаль, ёсьць у ёй адна вялікая хіба: гэта — няправільнае прадстаўленьне аб паходжаньні нацыянальнасьцей і аб значэньні мовы. Віна гэтаму — недастатачнае веданьне гісторыі і гісторыі культуры.

Вось-жа зусім справядліва рвецеся да навукі: гэта — першая аснова публіцыстычнае працы, да якое відаць, маеце нахіл і некаторую здольнасьць.

Ведама, узьнімаецца пытаньне, якім-жа спосабам Вам здабываць гэту навуку? На гэта ў гэты момант нічога адказаць не здолею, але буду мець Вас у памяці, калі здарыцца магчымасьць даць Вам нейкую работу ў горадзе. Тут Вы прынамся будзеце мець кніжкі, якіх у вёску пасылаць немагчыма.

Пакуль-жа, загадаў выслаць Вам экзэмпляр "Заходняе Беларусі", у якой знойдзеце адказ на некаторыя пытаньні,

што Вас цікавяць. Ахвотна адкажу Вам, калі будзеце мець нешта да мяне.

Шчыры прывет Ант[он] Луцкевіч.

Вільня, 18.IV.24.

Прыпіска рукой П. Сяўрука: "Атрымаў 26 красавіка 1924 года. Пётр Сяўрук."

ЛІСТ АНТОНУ ЛУЦКЕВІЧУ АД 29 КРАСАВІКА 1924 г.

Паважаны Грам[адзянін] Луцкевіч!

Вялікую падзяку прыміце ад мяне за Ваш адказ і за ваш падарунак — кніжку "Заходняе Беларусі". Вашае імя застанецца сьвятым у маёй памяці. Вы першыя пачулі мой голас, пачулі яго ў маленячкай і мала значнай заметцы. Вы адказалі мне, што я абмыляюся, я ў гэтым пераканаўся яшчэ перш, і вынікам гэтага зьявілася мая заметка "Псыхіка — голас, акцэнт — народ". Аднак ў артыкуле "народ і дзяржава" не найшоў адказу на пытаньне, што такое народ. Толькі гэты артыкул дапамог мне ўласнаю думкаю знайсьці адказ. І вось ён: Пачатак народу — ёсьць мова, якая творыць народу культуру. Культура ёсьць вышэйшы тып народу, дзеля гэтага, калі на адной мові творыцца дзьве культуры, дык у вышэйшым тыпе ёсьць ужо два народы. Гэтак сама, калі дзьве мовы маглі-б стварыць адну культуру, дык тады быў бы народ з дзьвумя мовамі ў вышэйшым тыпе, і два ў ніжэйшым.

Вы назвалі маю заметку творам, але гэта дзеля мяне не твор. Гэта лёт думкі, якая робіць колазварот, і кружыцца няўстанна. Яна абхоплівае рэч, дасць аб ім мне прадстаўленьне і імкнецца далей, навучаецца іншым рэчам, зварочвае да старое, злучае ўсе думкі і шукае праўдзівага і [неразборлі-ва ў рукапісе]. Гэткім чынам я і пераканаўся ў непраўдзівасьці сваго ранейшага разуменьня мовы і нацыі.

Артыкул "Гэтым пераможаш!" найбольш аказаўся каштоўным дзеля мае думкі, я ў ім знайшоў шмат чаго не ведаў, а яшчэ больш, на падставах многіх думак артыкулу я зрабіў уласныя доследы. На падставах шмат якіх думак я думаю напісаць "Чым жыве народ?" З гэтага артукулу я ў першы раз пазнаёміўся (вядома коратка) з Кантам[1], Фіхтэ[2], Лейбніцам[3], Гэгэлем[4], Марксам[5], Бэконам[6] і інш. філёзофамі. Да гэтага часу я ведаў адну толькі велізарную думку славяніна Л. Тал-

стога. У яго я навучыўся думаць, ад яго я пачаў думаць і думкі мае ляцяць колазваротам, тым колазваротам, які абхоплівае ўсё, адно адкідае, другое прызнае, трэцья імкнецца зьмяніць. У гэтай зьмене я асабліва заняты чалавечымі паняцьцямі адносна чалавека, ягонае істоты, духа праўды і многага іншага. Усе гэтыя зьмененыя паняцьці я імкнуся выкласьці ў "Слоўніку" ("Межы, або Слоўнік паняцьцяў"). Я напісаў ужо два артыкулы да гэтага слоўніка, што раўняецца двум ці чатыром словам ("Грунтоўнае паняцьце" і "Вера і бязвер'е"). Адзін з гэтых артыкулаў я падаю Вам. Разгледзьце лёт мае думкі, можа ўбачыце, што і беларус жыве так сама як немцы.

Калі Бэкон адшукаў тэорыю тэхнічнага дабрабыту ў барацьбе з морам, дык я — беларус — с контыненту, стаю за тэорыю маральнае "тэхнікі", якая павінна аднавіць сьвет, каб ня было ў ім зла. Бяз аднаўленьня маралі праз "тэхнічнае" заваеваньне сваяго роду мы будзем вечна пакутаваць. Што дала "тэхніка" Бэкона. Экономію? Заваяваньне прыроды? Не... Яна дала заваяваньне руіны, заваяваньне зьвярства. Я гэта сьмею сьцьвердзіць. Тысячу гадоў наперад Бэкона цэлая вайна не марнавала гэтулькі жалеза, гэтага добрага мэталу, і не губіла столькі жыцьцяў, колькі цяпер губіць і марнуе адзін зарад цяжкае батарэі.

І тэхнічнае заваяваньне, пачатак якому даў Бэкон, акурат у гэтым кірунку вельмі было пашырана на Беларусі нядаўна каля Х-гадоў і ізноў імкнецца ўзарвацца.

Дык вось я беларус ад вечнае мыслі Л. Талстого, паўстаю проціў гэтага руйнуючага зла і імкнуся даць ці знайсьці добрыя паняцьці, добры грунт, праўдзівае імкненьне чалавечае волі, якая тэхніку ня пушчала-б у служэньне зьвярству, а толькі чалавецтву.

Дарэчы тут трэба зьвярнуць увагу на тое апраўданьне зла, якое дае Суліма[7] ў сваім артыкуле. Роль зла неяк містычна-догматычна разглядаецца ў гэтым артыкуле. Я не ведаю ці дазнаўся хто ці не аб тым, што знайшоў я ў самастойным кружэньні думкі.

"У зле няма ніякае неабходнасьці, бо зло ўсё руйнуе, але гэта ёсць спрацівам дабра. Як сказана ў Фізыцы: кожная сіла мае спраціў, дык якую ж роль адыграло зло ў прагрэсіі. Вось дзе сэнс мае думкі.

Калі чалавек ня ведаў дабра (якога ўсё роўна) дык усё ж ён быў чалавек. Дык вось зло пачало ўзьнікаць перад ім і ў барацьбе з злом чалавек змушаны быў шукаць дабра. Гэткім чынам зло выклікала дабро. А калі паўстала дабро, тады зло павінна зьнікнуць — стаць у значэньні звычайнага спраціву. Ці зьяўляецца цяпер зло спрацівам? Не. Яшчэ яно служыць таму, што прадаўжае выклікаць дабро. І калі гэта дабро пераважыць зло, тады зло будзе ў становішчы звычайнага спраціву.

Неяк нялоўка я тут выклаў думку, але пэўна зразумееце. Гэтая думка адчасьці і закранута ў маім творы "Бо ёсьць" (160 ст. гэткага сшыт[кавага] фармату) на падставе гэтае думкі я пішу артыкул "Ад паходжаньні рэлігыі" і на паставе гэтае думкі я думаю напісаць "Слоўнік прагрэсу", у якім каждае слова злого сэнсу будзе апісана ў ролі выключаючай праціўнае яму дабро.

Так сама яшчэ аб песьні Суліма ня дагаварыўся да яснасьці. На падставе ўласнае думкі, якую я знайшоў ужо два гады назад "Песьня — пачатак думаньня" я зразумеў, што гэта справядліва.

Але аб "радасьці" трэба пагаварыць больш. Я не ведаю у якім сэнсе ўжывае Суліма слова "радасьць". Калі ў сэнсе расейскага блага дык было б так. Але гэта ня так. "Радасьць дапамагае росту чалавечае душы, а сум яе забівае" кажа Суліма. Але гэта ня так. На жаль у беларусаў німа слова каб пералажыць яго на расейскае благо, а ўжываць гэтае благо немагчыма з прычыны таго, што гэтае слова ўжываецца ў нас наадварот. Благо ёсьць не радасьць (Гэтая думка ў творы маім "Бо ёсьць"). Сум аднолькава гэтулькі дапамагае росту чалавечае душы, як і іншая радасьць. Гэта я кажу сьмела. Бо сум (скорбь) столько-ж дае пачуцьця свае душы, як і радасьць калі ня больш. Толькі адчай забівае душу, так сама як і ідэотычная радасьць. Аб ёй пэўна ведае аўтар гэтага артыкулу здаецца яго ж артыкул "У сэнаторый д-ра Грабскага[8]".

Сум выклікае пачуцьцё душы, а пачуцьцё душы ёсьць пачуцьцё сілы, а пачуцьцё сілы ёсць тое, што па-расейску завецца благо. У гэтым німа сумніву, бо шляхам суму праходзіла чалавечая гісторыя, якая як мы бачым ня забівала а ўзрашчала душу. Гэтый-жа сум апанаваў нашу бацькаўшчыну толькі-ж ён ня губіць беларускіх душ. Аб гэтым добра ведае аўтар ("Tryumfuje Białoruś").

Яшчэ шмат чаго маю сказаць німа часу, німа мейсца, і не ведаю ці упадабаецца Вам. Да рэчы трэба ўспамянуць яшчэ, што датычыць адчаю.

Адчай забівае душу, і аўтар "Перамогі" ў значным ліку зьмясьціў артыкулаў у беларускае прэсе, якая ў пэўнае меры магла-б давясьці каго да адчаю, да халоднае радасьці, да зьдзеку над пакараным ворагам, да адчаянай радасьці. Наагул беларуская прэса дапамагае бадай адчаю. Я чытаў цэлы год газэту і вечна палітыка, вечна адны апісаньні адчаю, крыку, гвалту — што аж мароз пад шкуру бярэ. І вось аўтар, які ў значнай меры працаваў дзеля гэтага адчаю, дзеля суму усё-ж, кліча да радасьці. Якая-ж можа быць у нас радасьць? Не радасьць а расейскае благо ўзгадаўвае душу. А гэта благо як у разумнае радасьці так і цьвярдым суму. Толькі наша "туга" і "сум" неяк гучыць панура. Расейцы маюць больш урачыстыя словы "скорбь", "печаль". Часткова гэты самы сум ёсьць у той паэзіі, якую Суліма лічыць пад'ёмам нацыянальнага духу. Гэты сум ёсьць нават пачатак паэзіі, якая зьяўляецца пачаткам думаньня. Першая пачатковая паэзія гэта ёсць тая самая гутарка, у якой словы гучаць сумна і задуменна (Караленка[9] [неразборліва ў рукапісе]). Як раз у гэтай паэзіі ўсё і сум, і задумленьне, і пачуцьце душы, ці пад'ём народнага духу. Нават у вышайшай паэзіі ўсяго гэтага ня знойдзецца ў гэтакім выразным абліччу.

Дык вось здаецца скарочаны колазварот думкі, якая хутка ў адзін дзень навярнулася, дзякуючы Вашаму падарунку. Вы адклікнуліся, хоць і праз 7 тыдняў. Я чакаў чакаў і ды перастаў чакаць, спадзяваючыся, што пісьмо нейдзі прапала. Я забыўся, што ёсьць людзі якім шмат, за лішня, работы, — а я дык вось і марнею так сабе. Сколькі я не думаў, сколькі не думаю, сколькі ўсяго напісаў у кароткі час сваяго думаньня але ўсё нікому невядома. Асабліва значны твор па багацьцю думкі „Бо ёсьць". Пісаны па расейску. Я ўсё пішу па расейску, бо лепш уладаю гэтаю мовай і ў ёй большае багацьце словаў. Гэтак напр. у нашай, так сама даволі багатай мове німа адпаведнага дзеля расейскага благо. Ды і наагул я добра ня уладаю беларускаю мовай.

Дык вось: дзякуючы Вашай ахвоце адказваць мне я ў Вас прашу адказаць: ці не знойдзецца якое расейскае выдавецтва, каб магло выдаць мае творы, хоць тое "Бо ёсьць." Можа я залішне вялікую сьмеласць дапушчаю сабе, у такім выпадку выбачайце. Не ведаю, мо я іду нават супроць пераканя-

наньняў, — але я ня магу цярпець. Адносна Вашага прапанаваньня дастаць мне працу ў горадзі ня магу Вас запэўніць. У мяне німа пашпарта, а Вы ведаеце, якая цяжкая справа пашпарт. У кожным выпадку ніц аканчальна ня ведаю. Яшчэ раз выбачайце і яшчэ раз дзякую за Ваш ліст і Вашу кніжку. Выбачайце, я прасіў-бы і адказу хутчэй, бо надта цяжка чакаць у невядомасьці.

Выбачайце і дзякуй.
З шчырай Пашанай.
Скідзяль 29 красавіка Пётр Сяўрук.

ЛІСТ АД АДОЛЬФА ЗЯНЮКА[1] АД 4 ТРАЎНЯ 1925 г.

Вільня, 10.V.25.

Паважаны Грамадзянін.

Усе В. лісты і матэрыялы да Студэнцкае Думкі[2] Рэдакцыя атрымала, аб чым паведамляем Вас цераз Крыніцу[3],у аддзеле карэспандэнцыі.

Мой ліст да Вас яшчэ з 1924 г. быў вызваны дзеля вось якіх прычын: у эскізе, друкаваным у №1 "С.Д."[4] рэдакцыя ўбачыла думку, зьверненую ў бок соцыяльных разважаньняў, прычым матэрыял да гэтае думкі пачарпнулі Вы з адвечнае крыніцы клясавых "непаразуменьняў" у ўкладзе сучаснасьці, даючы чытачу заданьне разважаць, увайсьці ў прычыны апісыванага здарэньня і задумацца над афармляным "правам" укладам сёньняшніх дзён. Другое, што ў гэтым-жа эскізе коратка, характэрна і прыгожа наштрыхаваны быў "эпізод" з жыцьця, ці ляпей сьмерці. Убачылі мы тое, чаго ў нашай літаратуры, асабліва ў празаікаў — а іх на жаль так мала у нас — спатыкаемо рэдка: гэта мастацтва.

Як Вы ужо пэўне прыкмецілі "Ст[удэнцкая] Думка" мелася выходзіць на 3-х лістох, але нехват грошай і малая ўвага падпісчыкаў, ляпей ізноў нехват іх змусілі агранічыцца да 2-х лістоў. Вось прычына, чаму болей нічога Вашага ня зьмесьцілі. Пры тым ня ўсё да студэнцкае часопісі падходзіла — апошні апокрых да гісторыі саўсім бы надаўся, але ня маем пэўнасьці, ці стане нам сілы выдаць якіх [неразборліва ў рукапісе].

Цяпер, вяртаючыся да Вас, як беларускага працаўніка, ад імяні рэдакцыі прашу Вас і раджу працаваці над сабою, бо талент у Вашых словах відаць. Трэба толькі дзьвух рэчаў: 1) пазнаньня грунтоўнага беларускае мовы і літэратуры і 2) учытвацца ў сусьветную літаратуру, дзе пачэрпнеце шматлікія прыклады і разшырыце свой літэрацкі кругазор. Мы як студэнты, занятыя асабліва цяпер работаю, дый людзі з малым жыцьцёвым досьледам, мо не надаемся на літэрацкіх кіраўнікоў Вас, а вось становішча "рэдактара" кажэць напісаць Вам гэтыя словы. Раіў бы ад сябе зьвярнуцца з лепшымі Вашымі творамі да грам. Антона Луцкевіча з просьбай, каб ён даў сваю ацэнку і параду, гэта найлепшы наш крытык, а мо й стыліст.

Усё-ж ня помніце нас ліхам, а калі з восені мы йзноў прыймемся за выдавецтва, ня трацьце з намі кантакту.

З пашанай Адольф Зянюк.

ЛІСТ АД МІКАЛАЯ МАРЦІНЧЫКА[1] АД 4 ВЕРАСНЯ 1926 г.

Грам. Сеўрук!

Пісьмо, дэкляцыі і сяброўскія складкі ад Вас атрымалі і высылаем Вам сяброўскія білеты, паведамленьне і статут старосце.

Вы пішаце, што ў Вас некаторыя не могуць уступіць у Т-ва з прычыны сяброўскіх складак; хай гэта не будзе ім перашкодай, гурток хай напіша нам, што такія-то і такія то маламожныя і ня могуць плаціць 50 гр[ошай] і Галоўная Управа пастараецца зьменьшыць складку або нават зусім звольніць.

Сяброўскія білеты выдае толькі Галоўная Управа.

Т-ва Беларускае Школы для нова адчыніўшайся бібліятэкі дае толькі беларускія кніжкі на льготных варунках, — другія — расейскія і польскія — нават каб і хацела даць, то ня мае іх. За кніжкі трэйцюю частку грошай трэба ўнясьці адразу а дзве трэйція — у працягу году.

На публічныя рэфэраты, як Вы самы пішаце, — трэба дазвол. А вось як Вы зарганізуеце гурток свой і будзеце мець ад нас пасьведчаньне, што Вас зацьвердзіла Галоўная Управа, то тады Вы, будучы залегалізованым гуртком можаце для

сваіх сяброў чытаць лекцыі на тэмы культурна-асьветныя, літэратурныя, аб мастацтве і іншым без дазволу і нават без паведамленьня, але ляпей на ўсялякі выпадак паведаміць паліцыю.

4.IX.26 г.

Сэкрэтар М. Марцінчык.

ЛІСТ АД ЛЮДВІКІ ВОЙЦІК (ЗОСЬКІ ВЕРАС)[1] АД 6 КРАСАВІКА 1927 г.

Вільня 6-га красавіка
1927.

Паважаны Грамадзянін.

Падпіску на "Заранку" ад Вас атрымала. Не памятаючы, ці 1-шы нумар — "пробны", быў Вам высланы ці не, пасылаю яго.

Чула я шмат ад Вашым заінтэрэсаваньні справай дзіцячай асьветы і дзеля гэтага пастанавіла зьвярнуцца да Вас з просьбай быць супрацоўнікам "Заранкі" — прысылаць для друку ў ёй адпаведныя матэр'ялы і апроч таго заахвочваць Вашых знаёмых дзяцей, каб прысылалі разгадкі "круцігаловак" і задач, зьвярталіся з рознымі пытаньнямі, каб даць пачатак шырокай перапісцы "Заранкі" з яе чытачамі, ды прысылалі свае працы: запісаныя казкі, прыпеўкі, ды дзіцячыя сьмяхотныя песьні, дзеля друкаваньня іх у аддзеле: "Працы нашых чытачоў".

Такім чынам навяжэцца цесны і моцны кантакт паміж рэдакцыяй "Заранкі" і нашымі дзяцьмі, пры якім змагу працаваць у пэўным, самымі дзяцьмі і іх духовымі патрэбамі, намечаным напрамку; і такім чынам паставіць "Заранку" на патрэбную вышыню. Маю вялікую надзею знайсьці ў Вашай асобе рупнага і спагадлівага супрацоўніка якіх мне вельмі, вельмі нехапае.

Адказу чакаю з нецярплівасьцю.
З пашанай рэдактарка Л. Войцікава.
Калі ласка пішэце на адрас Вільня. Віленская 12-6.
рэд. "Заранкі"

ЛІСТ АД ЛЮДВІКІ ВОЙЦІК (ЗОСЬКІ ВЕРАС) АД 17 ЛІПЕНЯ 1927 г.

13/VII. 27 г.

Паважаны Грамадзянін.

[6] Мамона — у старажытных вераваннях дэманічная істота, адзін з прадстаўнікоў "д'ябальскай сілы", якая супрацьстаіць Богу і анёлам.

[7] Малох — паводле Біблii, боства, якому прыносіліся ахвяры (у першую чаргу дзеці) ў Палестыне, Фінікіі і Карфагене.

Нацыя і нацыяналізм (с. 58)

Друкуецца паводле аўтографа П.Сяўрука; ГДГАМ, КП-85095/20. Дата напісання — 2 красавіка 1927 г. Матэрыял знаходзіцца ў сшытку пад назвай "Сьпевы і дэкламацыі", у якім змешчаны патрыятычныя вершы беларускіх паэтаў, што чыталіся П.Сяўруком і іншымі сябрамі Скідзельскага гуртка ТБШ падчас сходаў арганізацыі.

Аб чым пішуць газэты (с. 62)

Друкуецца паводле аўтографа П.Сяўрука; ГДГАМ, КП-85095/31. Дата напісання — 6 чэрвеня 1928 г.

[1] Маецца на ўвазе Беларускі сялянскі саюз — палітычная партыя, якая існавала ў Заходняй Беларусі з лістапада 1925 па канец 1920-х г. Яе лідэрамі былі Фабіян Ярэміч і Васіль Рагуля.

[2] Хадэкі — члены Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

[3] Маецца на ўвазе Беларуская сялянская партыя, заснаваная вядомым беларускім дзеячам Янкам Станкевічам пасля ягонага скандальнага выхаду з шэрагаў Беларускага сялянскага саюза ў сярэдзіне 1927 г. Шырокай дзейнасці разгарнуць не здолела.

[4] Гандзі Махандас Карамчанд (1869—1948) — ідэолаг індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху. Змагаўся за свабоду Індыі шляхам негвалтоўнага супраціву. У 1920-х выступаў за адраджэнне індыйскага ручнога ткацтва, нашэнне нацыянальнай вопраткі і байкот англійскіх тавараў.

Хто сьвядомы чалавек (с. 65)

Друкуецца паводле аўтографа П.Сяўрука; ГДГАМ, КП-85095/32. Дата напісання — 20-21 лютага 1929 г.

[1] "Справы" ды "Працы" — маюцца на ўвазе заходнебеларускія газеты леварадыкальнага напрамку, выхад якіх рэгулярна прыпыняўся польскімі ўладамі і пасля аднаўляўся пад новай назвай, пры гэтым звычайна элементам назвы былі словы "справа" ці "праца".

[2] "Крыніца" альбо "Сял[янская] Ніва" — заходнебеларускія газеты незалежніцкага накірунку. П.Сяўрук намякае тут на супрацьстаянне леварадыкальнай і незалежніцкай беларускай прэсы. Прыхільнікі першай сцвярджалі, што беларускае сялянства, ідучы за сацыяльнымі пракамуністычнымі лозунгамі, выказвае сваю вялікую свядомасць, другія, наадварот, падкрэслівалі нацыянальную несвядомасць беларусаў.

Да "правадыроў" беларускага народу (с. 68)

Друкуецца паводле аўтографа П.Сяўрука; ГДГАМ, КП-85095/26. Дата напісання — 2 сакавіка 1929 г. У рукапісе таксама пазначана месца напісання твора — Скідзель. Раней друкаваўся ў часопісе "ARCHE" (2005, №4).

[1] Пад "правадырамі" беларускага народа П. Сяўрук меў на ўвазе сеймавых паслоў Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба, які стаяў на радыкальнай, надзвычай блізкай да камуністычнай платформе.

Ліст да кіраўніцтва Таварыства Беларускай Школы (с. 71)

Друкуецца паводле аўтографа П.Сяўрука; ГДГАМ, КП-85095/25. Дата напісання — 27 чэрвеня 1929 г.

[1] Як "фашысты" ва ўсіх рэзалюцыях ТБШ таго часу акрэсліваліся Антон Луцкевіч, Радаслаў Астроўскі, Антон Трэпка, Язэп Шнаркевіч і інш.

У ПОШУКАХ СЭНСУ ЖЫЦЦЯ: ФІЛАСОФСКІЯ РАЗВАЖАННІ П.СЯЎРУКА

Бо ёсьць... (с. 75)

Друкуецца толькі фрагмент уступнай часткі філасофскага твору Пятра Сяўрука "Бо ёсьць". Дата напісання — 23-29 студзеня 1924 г. Рукапіс П.Сяўрук даслаў у "Беларускае выдавецкае таварыства" ў лісце ад 28 студзеня 1924 г. Усяго ён планаваў напісаць 12 раздзелаў гэтай працы: "1) Бо ёсьць розум (сэнс жыцьця і тварэц яе). 2) Бо ёсьць запраўднасьць (ня тое, што ёсць і бывае, а што павінна быць). 3) Бо ёсьць жыцьцё (разумнае істнаваньне чалавека). 4) Бо ёсьць ісціна (праўда ўсяго істнуючага і творчага). 5) Бо ёсць любасьць (крыніца чалавечага дабрабыту). 6) Бо ёсьць дабро (сэнс чалавечага жыцьця). 7) Бо ёсьць закон (творчая сіла жыцьця). 8) Бо ёсьць права (працэс творчасьці закону). 9) Бо ёсьць сумленьне (агарода або руйнаваньне процізаконнасьці). 10) Бо ёсьць паняцьці (крысталізацыя вонкавых зьяваў ў чалавеку). 11) Бо ёсьць "я" (істота чалавечае магчымасьці тварыць добра і разумна). 12) Бо ёсьць Бог (пачатак творчае разумнае і добрае сілы ў чалавечым "я")". Захоўваецца ў Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы. Фонд. 21. Справа 546. Арк. 4 — 4 адв., 7 адв.

[1] Фермапілы — горны пераход на мяжы Фесаліі і Сярэдняй Грэцыі, дзе ў 480 г. да н.э. адбылася бітва падчас грэка-персідскіх войнаў 500—449 г. да н.э.

Абкружаны з усіх бакоў, спартанскі атрад у 300 чалавек на чале з царом Леанідам гераічна змагаўся супраць персаў і цалкам загінуў у рукапашным баі.

[2] Гордзіявы вузлы — у Старажытнай Грэцыі фрыгійскі цар Гордзій завязаў такі заблытаны вузел, які ніхто не мог развязаць. Толькі Аляксандр Македонскі здолеў справіцца з задачай, рассекшы вузел мячом.

[3] Аляксандр Македонскі (356–323 да н. э.) — цар Македоніі, адзін з найслаўцейшых у свеце палкаводцаў.

[4] Мінатаўр — паводле грэчаскага падання, страшыдла з целам чалавека і галавой быка. Хаваўся царом Мінасам у г.зв. Кнасійскім Лабірынце, куды яму кідалі на з'ядзенне злачынцаў, а таксама прысыланых з Афінаў кожныя дзевяць гадоў 7 дзяўчат і 7 юнакоў.

Моя философия (с. 77)

Дата напісання — 11-15 студзеня 1924 года. Рукапіс працы захоўваецца ў ММБ, КП – 3973.

Мое исповедание (с. 88)

Дата напісання — 2 лютага 1925 г. Друкуецца са скарачэннямі. Рукапіс працы захоўваецца ў ММБ, КП – 3973.

Што такое п'янства (с. 94)

Дата напісання — 4 ліпеня 1927 г. Паводле прыпіскі П.Сяўрука можна меркаваць, што тэкст пісаўся ў маі-ліпені 1927 г. У гэты перыяд Гарадзенская акруговая ўправа ТБШ пастанавіла актывізаваць барацьбу з п'янствам. П.Сяўрук, як старшыня ўправы, напісаў гэты тэкст дзеля выкарыстання яго ў агітацыйнай дзейнасці гурткоўцаў. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 4086. Выказваем падзяку за падрыхтоўку гэтага тэксту мовазнаўцу і філосафу Юрасю Пацюпу.

[1] Гарэцкі Максім (1893–1938) — беларускі пісьменнік і літаратуразнаўца. Маецца на ўвазе драматычны абразок М.Гарэцкага "Атрута" (1913 г.).

[2] Мармеладаў — герой раману Ф.М.Дастаеўскага "Злачынства і пакаранне".

[3] У рукапісе неразборліва, па сэнсу найбольш адпавядае слова "зло".

[4] Святагор — герой усходнеславянскага эпасу.

[5] У рукапісе неразборліва, маецца на ўвазе старажытнагрэцкі філосаф і вынаходнік Архімед.

[6] Роскин Джон (англ. John Ruskin; 1819–1900) — англійскі пісьменнік, тэарэтык мастацтва, літаратурны крытык і паэт.

[7] Праметэй — герой старажытнагрэчаскага эпасу, які падараваў людзям агонь, за што па загаду бога Зеўса яго прыкавалі да скалы і арол дзяўбаў яго пячонку.

[8] Маецца на ўвазе верш М.Ю.Лермантава "Тры пальмы" (падзагаловак — "Усходняе паданне", 1839 г.)

[9] Філасофскі кірунак у антычнасці, створаны грэцкім філосафам Эпікурам. Усхваляе разумнае імкненне да асалоды. У дадзеным выпадку П.Сяўрук разумее пад эпікурэйствам неабмежаванае імкненне да пачуццёвай асалоды.

Краса і радасьць жыцьця (с. 106)

Дата напісання невядомая. Копія захоўваецца ў прыватным архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

Самаузгадаваньне (с. 106)

Дата напісання невядомая. Копія захоўваецца ў прыватным архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

Тэстамэнт свабоды (с. 106)

Дата напісання невядомая. Копія захоўваецца ў прыватным архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

Права на зямлю (с. 107)

Дата напісання невядомая. Копія захоўваецца ў прыватным архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

ПАЭЗІЯ

Сяляне цёмныя пакутнай Беларусі (с. 111)

Дата напісання — прыкладна канец 1923 г. Копія захоўваецца ў прыватным архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

Пра сваю працу (с. 112)

Дата напісання — хутчэй за ўсё люты 1923 г. Рукапіс верша захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі Навук Літвы. Фонд 21. Спр. 546. Арк. 17.

Не хачу (с. 113)

Дата напісання — 5 траўня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3945.

Вымаганне (с. 114)

Дата напісання — 6 траўня 1926 г. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3945.

Песні сэрца (с. 115)

Дата напісання — 7 траўня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3945.

Як пачуеш... (с. 116)

Дата напісання — 8 траўня 1926 г. Друкаваўся ў зборніку "Шляхам гадоў" (Мінск: "Мастацкая літаратура", 1994). Арыгінал рукапіса захоўваецца ў ММБ, КП — 3946.

Хто шчасьця жадае... (с. 117)

Дата напісання — 9 траўня 1926 г. Друкаваўся ў зборніку "Шляхам гадоў" (Мінск: "Мастацкая літаратура", 1994). Арыгінал рукапіса захоўваецца ў ММБ, КП — 3946.

Хто хоча мяне зразумець... (с. 119)

Дата напісання — 16 траўня 1926 г. Друкаваўся ў зборніку "Шляхам гадоў" (Мінск: "Мастацкая літаратура", 1994). Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3946.

Здавальненьне (с. 120)

Дата напісання — 22 траўня 1926 г. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3947.

Памяці Казімера Сваяка (с. 122)

Дата напісання — 23 траўня 1926 г. Друкаваўся ў зборніку "Шляхам гадоў" (Мінск: "Мастацкая літаратура", 1994). Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3947.

[1] Сваяк Казімір (сапр. Канстанцін Стэповіч; 1890—1926) — беларускі пісьменнік, каталіцкі святар. Як і Пётр Сяўрук, памёр ад сухотаў.

Найвялікшая ў жыцьці людзкая задача (с. 123)

Дата напісання — 23 траўня 1926 г. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3948.

Прыкметы (с. 124)

Дата напісання — 25 траўня 1926 г. Фрагменты верша друкаваліся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца поўны варыянт з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3949.

Пранясі мяне лёт па-над сьветам... (с. 125)

Дата напісання — 28 траўня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3950.

Песня ратая-беларуса (с. 126)

Дата напісання — 29 траўня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапіса арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3950.

Як сум у душэ маей таўпіцца (с. 127)

Дата напісання — канец траўня 1926 г. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3953.

Маё... (с. 128)

Дата напісання — 22 чэрвеня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3953.

Самае лепшае (с. 129)

Дата напісання — канец чэрвеня 1926 г. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3953.

У касьбу (с. 129)

Дата напісання — 12 ліпеня 1926 г Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3960.

Мне не страшна... (с. 130)

Дата напісання — 12 ліпеня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3954, 3960.

Камбінацыя думак М.Багановіча (с. 131)

Дата напісання — 12 ліпеня 1926 г. Арыгінал рукапісу захоўваецца ў ў ММБ, КП — 3954.

Міхасю Васільку (с. 131)

Дата напісання — 8 жніўня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3961.

Вязьням (с. 133)

Дата напісання — 8 жніўня 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3954, 3970.

Памяці Максіма Багдановіча (с. 134)

Дата напісання — 26 кастрычніка 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3955.

Чаго сэрца баліць?.. (с. 135)

Дата напісання — 26 кастрычніка 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3955.

Гляне сонца з-за хмараў (с. 136)

Дата напісання — 30 кастрычніка 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3969.

Адказ на пытаньне Максіма Багдановіча (с. 137)

Дата напісання — 30 кастрычніка 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3969.

Розныя колеры вясёлкавай дугі (с. 138)

Дата напісання — 1 лістапада 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3955.

На магілу М.Багдановіча (с. 138)

Дата напісання — 5 лістапада 1926 г. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3957.

Нудную песьню вецер заводзіць (с. 139)

Дата напісання — 8 лістапада 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 5958.

Агарнуліся родныя далі туманамі (с. 139)

Дата напісання — 8 лістапада 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 5958.

Мы маліліся... (с. 140)

Дата напісання — лістапад 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3959.

Песьня сьмерці. Наследаваньне з Некрасава (с. 141)

Дата напісання — лістапад 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3959.

Працоўны Волат, бяры свой молат (с. 141)

Дата напісання — 19 лістапада 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3959.

Я працую, як вол... (с. 142)

Дата напісання — канец 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3959.

Усё шуміць і шуміць векавечны наш бор (с. 143)

Дата напісання — канец 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3959.

Якубу Коласу (с. 143)

Дата напісання — лістапад 1926 г. Рукапіс захоўваецца ў ММБ, КП — 3958.

З зімовых настроўя (с. 143)

Дата напісання — 3 студзеня 1927 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Намі друкуецца з захаваннем правапісу арыгінала. Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3959.

Беларусь! Ты мой край дарагі (с. 144)

Дата напісання — лістапад 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3968.

Запалілася сэрца каханьнем (с. 144)

Дата напісання — 11 лютага 1926 г. Друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1986, №10). Рукапіс верша захоўваецца ў ММБ, КП — 3968.

Я радзіўся ў краіне лясоў і балотаў (с. 144)

Дата напісання нам невядомая. Друкаваўся ў зборніку "Шляхам гадоў" (Мінск: "Мастацкая літаратура", 1994). Копія верша захоўваецца ў прыватным архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

Нашто вы сэрца мае растраўляецца... (с. 145)

Дата напісання нам невядомая. Друкаваўся ў зборніку "Шляхам гадоў" (Мінск: "Мастацкая літаратура", 1994). Копія верша захоўваецца ў асабістым архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

ПРОЗА

Тайна маны (с. 149)

Друкуецца фрагмент апавядання П.Сяўрука, напісанага, хутчэй за ўсё, у канцы 1923 — пачатку1924 г. і дасланага аўтарам у "Беларускае выдавецкае таварыства" ў Вільню. Захоўваецца ў Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы. Фонд. 21. Справа 547. Арк. 12 — 14.

[1] Люльку ў Яўхіма скраў нядобрасумленны аднавясковец Павел якраз у той момант, калі Яўхім атрымаў звестку пра смерць на фронце свайго сына Сідара.

Гісторыя аднае сьмерці (с. 151)

Дакладная дата напісання невядомая. Твор быў надрукаваны: Студэнцкая думка. 1924. № 1. С. 32–34.

Чыталі (с. 154)

Дата напісання — 11 студзеня 1925 г. Рукапіс апавядання захоўваецца ў асабістым архіве Мікалая Дзелянкоўскага.

Споведзь Беззямельнага (с. 157)

Дата напісання нам невядомая. Рукапіс твора захоўваецца ў ММБ, КП — 4063.

ЛІСТАВАННЕ

Ліст у "Беларускую кнігарню" ад 21 лютага 1922 года. (с. 161)

Адзін з першых лістоў Пятра Сяўрука на беларускай мове. ММБ, КП — 3977.

[1] Маецца на ўвазе Беларуская кнігарня ў Вільні, якая дзейнічала яшчэ з перадваенных часоў і знаходзілася па адрасе: вул. Завальная, 7.

Ліст у "Беларускае выдавецкае таварыства" ад 28 студзеня 1924 г. (с. 161)

Аўтограф П. Сяўрука; Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы. Фонд. 21. Справа 546. Арк. 3 — 3 адв.

[1] Беларускае выдавецкае таварыства — існавала ў Вільні ў 1913-1915, 1919 — пач. 1930-х г., друкавала беларускую мастацкую літаратуру, пераклады на беларускую мову класікаў сусветнай літаратуры, календары, падручнікі, сярод іншых — творы І. Дварчаніна, А. Луцкевіча, І. Канчэўскага.

[2] "Заходняя Беларусь" — зборнік "грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры, мастацтва Заходняй Беларусі", першая кніжка якога (намінальна за 1923 год) выйшла ў свет у пачатку 1924 г. Планавалася, што гэты зборнік

будзе выходзіць перыядычна, але далей выпуску першай кніжкі справа не пайшла. Аўтарамі матэрыялаў, змешчаных на старонках гэтай адзінай кніжкі, былі Антон Луцкевіч, Ігнат Канчэўскі, Уладзімір Самойла, Рамуальд Зямкевіч і інш.

Ліст Антону Луцкевічу ад 29 лютага 1924 г. (с. 162)

Аўтограф П. Сяўрука; Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы. Фонд. 21. Справа 546. Арк. 9 — 9 адв.

[1] Луцкевіч Антон (1884—1942) — беларускі нацыянальны дзеяч, адзін з галоўных ідэолагаў беларускага нацыянальнага адраджэння. У міжваеннай Польшчы некаторы час быў нефармальным лідэрам беларускага руху.

[2] "Змаганьне" — газета, якая выходзіла ў Вільні з канца 1923 да канца студзеня 1924 г. Орган Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА).

[3] "Наш шлях" — часопіс, які выдаваўся з сакавіка 1922 па снежань 1923 г. у Вільні Беларускім студэнцкім саюзам. Усяго выйшла 4 нумары часопіса.

[4] "Беларускі голас" — маецца на ўвазе газета "Голас беларуса", якая выдавалася з лютага да красавіка 1924 г. Неафіцыйны орган Беларускага пасольскага клуба.

Ліст ад Антона Луцкевіча ад 18 красавіка 1924 г. (с. 164)

Аўтограф А. Луцкевіча; ГДГАМ, КП — 85095/10.

Ліст Антону Луцкевічу ад 29 красавіка 1924 г. (с. 165)

Аўтограф П. Сяўрука; Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы. Фонд. 21. Справа 546. Арк. 14 — 16 адв.

[1] Кант Іммануіл (1724—1804) — нямецкі філосаф, родапачынальнік нямецкага класічнага ідэалізму.

[2] Фіхтэ Ёган Готліб (1762—1814) — нямецкі філосаф, прадстаўнік нямецкага класічнага ідэалізму.

[3] Лейбніц Готфрыд Вільгельм (1646—1716) — нямецкі філосаф-ідэаліст, матэматык.

[4] Гегель Георг Вільгельм Фрыдрых (1770—1831) — нямецкі філосаф, стваральнік тэорыі дыялектыкі.

[5] Маркс Карл (1818—1883) — нямецкі філосаф і эканаміст, стваральнік дыялектыка-матэрыялістычнай філасофіі.

[6] Бэкан Фрэнсіс (1561—1626) — англійскі філосаф, стваральнік эмпірызму.

[7] Суліма (сапр. Самойла Ул.І.) (1878—1941) — беларускі і рускі літаратурны крытык, філосаф. Супрацоўнічаў з "Нашай Нівай", аўтар філасофскага эсэ "Гэтым пераможаш!", надрукаваным у альманаху "Заходняя Беларусь".

[8] Грабскі Уладзіслаў (1874—1938) — польскі палітык, прэм'ер-міністр Польшчы ў 1920, 1923—1925 г.

[9] Караленка Уладзімір Галакціёнавіч (1853—1921) — рускі пісьменнік.

Ліст ад Адольфа Зянюка ад 4 траўня 1925 г. (с. 169)

Аўтограф Ад. Зянюка; ГДГАМ, КП – 85095/13.

[1] Зянюк Адольф (1894–1938) беларускі дзяч з Сакольшчыны, адзін з стваральнікаў Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі, адвакат, рэдактар часопіса "Студэнцкая Думка".

[2] "Студэнцкая Думка" – грамадска-палітычны, навуковы і літаратурны орган Беларускага Студэнцкага Саюза. Выдаваўся з перапынкамі ў 1924–1931 г. У № 1 часопіса было надрукавана апавяданне П. Сяўрука "Гісторыя аднае сьмерці".

[3] "Крыніца" ("Беларуская Крыніца") – беларуская грамадска-палітычная газета, орган Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, выходзіла ў 1917–1937, 1939–1940 г.

[4] Маецца на ўвазе эскіз Пятра Сяўрука "Гісторыя аднае сьмерці".

Ліст ад Мікалая Марцінчыка ад 4 верасня 1926 г. (с. 170)

Аўтограф М.Марцінчыка; ГДГАМ, КП – 85095/17. Ліст зацверджаны пячаткай Галоўнай Управы ТБШ у Вільні.

[1] Марцінчык Мікалай (1901–1980) – беларускі дзеяч, лекар, старшыня Беларускага Студэнцкага Саюза, з 1934 г. намеснік старшыні галоўнай управы ТБШ.

Ліст ад Людвікі Войцік (Зоські Верас) ад 6 красавіка 1927 г. (с. 171)

Аўтограф Л. Войцік; ГДГАМ, КП – 85095/8.

[1] Войцік Людвіка (дзявоч. Сівіцкая) (1892–1991) – беларуская пісьменніца, грамадска-культурная дзяячка, друкавалася пад псеўданімам Зоська Верас.

Ліст ад Людвікі Войцік (Зоські Верас) ад 17 ліпеня 1927 г. (с. 172)

Аўтограф Л. Войцік; ГДГАМ, КП – 85095/9.

[1] Баран Сяргей (1892 – пасля 1935) – беларускі грамадскі дзеяч, старшыня гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэта, пасол Сейма Польшчы, у 1923 г. асуджаны польскім судом за антыўрадавую дзейнасць. Пасля выхаду з польскай турмы выехаў у БССР, дзе быў асуджаны і памёр у лагеры.

Ліст ад Васіля Сіткевіча ад 30 мая 1927 г. (с. 172)

Аўтограф В. Сіткевіча; ГДГАМ, КП – 85095/11.

[1] Сіткевіч Васіль (1896–1970) – настаўнік, актывіст беларускага нацыянальнага руху. Падрабязна пра В. Сіткевіча гл.: Токць С. Лёс беларускага настаўніка // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2004. № 21. S. 207-217.

[2] Княжаводцы – вёска ў Дубнаўскай гміне Гарадзенскага павета. Цяпер у Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці.

Ліст ад Васіля Сіткевіча ад 26 чэрвеня 1927 г. (с. 173)

Аўтограф В. Сіткевіча; ГДГАМ, КП – 85095/12.

[1] Заполле – вёска ў Дубнаўскай гміне Гарадзенскага павету. Цяпер ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці.

[2] "Ня розумам сьцяміў, а сэрцам" — спектакль па п'есе, напісанай у 1909 г. малавядомым беларускім пісьменнікам Касьянам Вясёлым (сапр. імя і прозвішча Вінцук Аўдзей) (1886–1916).

[3] "Пан Міністар" — спектакль па аднайменнай п'есе Францішка Аляхновіча.

[4] Староства давала дазвол на спектаклі, якія былі адцэнзураваныя паліцыяй, г. зн. на рукапісе п'есы або яе друкаваным выданні стаяла спецыяльная пячатка і подпіс адказнай службовай асобы.

[5] Луневіч — сябар Пятра Сяўрука, жыхар вёскі Рыскі Скідзельскай гміны, прыхільнік ідэй Льва Талстога.

Ліст ад Івана Савіцкага ад 22 верасня 1927 г. (с. 174)

Машынапіс на бланку з пячаткай Галоўнай Управы ТБШ, подпіс І.Савіцкага, ГДГАМ, КП – 85095/14.

[1] Савіцкі Іван (1893 – ?) — беларускі настаўнік і грамадскі дзеяч левай арыентацыі, віцэ-старшыня і кіраўнік канцылярыі ТБШ. Выкладаў сусветную гісторыю і гісторыю Беларусі ў Віленскай беларускай гімназіі. У 2-ой палове 1920-хг. быў старшынёй Віленскага Беларускага нацыянальнага камітэта. У 1927 г., пасля арышту лідэраў Грамады, кароткачасова ўваходзіў у дырэкцыю Беларускага кааператыўнага банка. Па некаторых звестках, у 1930-х г. жыў у БССР.

Ліст ад Івана Савіцкага ад 30 лістапада 1927 г. (с. 174)

Машынапіс на бланку з пячаткай Галоўнай Управы ТБШ, подпісы І.Савіцкага і Н. Калядзянкі, ГДГАМ, КП – 85095/15.

[1] Калядзянка Н. (магчыма Калядзячка) — біяграфічныя звесткі адсутнічаюць.

Ліст ад Ігната Дварчаніна (лета 1927 г.) (с. 175)

Аўтограф І. Дварчаніна; ГДГАМ, КП – 85095/6.

[1] Дварчанін Ігнат (1895–1937) — беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч. У 1921–1925 г. вучыўся ў Карлавым універсітэце ў Празе. З 1928 па 1930 г. быў паслом у польскі сойм, уваходзіў у склад Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клубу "Змаганьне". У жніўні 1930 г. арыштаваны польскімі ўладамі. Выехаў у БССР, дзе быў рэпрэсаваны і расстраляны.

[2] Васілёк Міхась (сапр. Касцевіч Міхал) (1905-1960) — заходнебеларускі паэт, грамадскі і культурны дзеяч, сябра і зямляк П. Сяўрука.

Ліст ад Ігната Дварчаніна ад 5 ліпеня 1927 г. (с. 176)

Аўтограф І. Дварчаніна; ГДГАМ, КП – 85095/7.

Паштоўка ад Ігната Дварчаніна ад 13 ліпеня 1927 г. (с. 177)

Аўтограф І. Дварчаніна; ГДГАМ, КП – 85095/2.

Паштоўка ад Ігната Дварчаніна ад 12 жніўня 1927 г. (с. 177)

Аўтограф І. Дварчаніна; ГДГАМ, КП – 85095/3.

Паштоўка ад Ігната Дварчаніна ад 14 кастрычніка 1927 г. (с. 177)

Аўтограф І. Дварчаніна; ГДГАМ, КП – 85095/4.

Паштоўка ад Ігната Дварчаніна, 20 кастрычніка 1927 г. (с. 178)

Аўтограф І. Дварчаніна; ГДГАМ, КП – 85095/5.

Урыўкі з дзённіка Пятра Сяўрука (1921—1929 г.) (с. 181)

[1] Сяргей Іванавіч — настаўнік, адзін з лідэраў беларускага зямляцтва ў Ліпецку. Прозвішча яго нам невядомае.

[2] Авенарыус Васіль Пятровіч (1839 — 1919) — рускі пісьменнік, пісаў для дзяцей і юнацтва.

[3] Ал. Алтаеў (сапр. імя і прозвішча Яшчыкова Маргарыта Уладзіміраўна) (1872—1959) — руская пісьменніца, пісала для дзяцей і юнацтва.

[4] Аксакаў Сяргей Цімафеевіч (1791 — 1859) — рускі пісьменнік і мемуарыст. Маглі тут таксама мецца на ўвазе ягоныя сыны — галоўныя ідэолагі славянафільства Канстанцін Сяргеевіч (1817—1860) і Іван Сяргеевіч (1823 — 1886) Аксакавы.

[5] Бялінскі Вісарыён Рыгоравіч (1811—1848) — рускі літаратурны крытык.

[6] Верасаеў Віктар Віктаравіч (1867—1945) — рускі пісьменнік.

[7] Грыбаедаў Аляксандр Сяргеевіч (1790 ці 1795—1829) — рускі пісьменнік і дыпламат.

[8] Грыгаровіч Дзмітрый Васільевіч (1822—1899/1900) — рускі пісьменнік, прадстаўнік г.зв. дваранскага народніцтва.

[9] Ганчароў Іван Аляксандравіч (1812—1891) — рускі пісьменнік.

[10] Гётэ Ёган Вольфганг (1749—1832) — нямецкі пісьменнік, пачынальнік нямецкай літаратуры новага часу.

[11] Гейнэ Генрых (1797—1856) — нямецкі паэт і публіцыст.

[12] Гюго Віктор Мары (1802—1885) — французскі пісьменнік-рамантык.

[13] Данілеўскі Мікалай Якаўлевіч (1822—1885) — расійскі публіцыст і сацыёлаг, ідэолаг панславізму.

[14] Відаць, маецца на ўвазе Дрожжын Спірыдон Дзмітрыевіч (1848—1930) — рускі сялянскі паэт.

[15] Златаўрацкі Мікалай Мікалаевіч (1845—1911) — рускі паэт-народнік.

[16] Дзюма Аляксандр (1802—1870) — французскі пісьменнік.

[17] Заля Эміль (1840—1902) — французскі пісьменнік.

[18] Дзікенс Чарлз (1812—1870) — англійскі пісьменнік.

[19] Лажэчнікаў Іван Іванавіч (1792—1869) — рускі пісьменнік.

[20] Ляскоў Мікалай Сямёнавіч (1831 — 1895) — рускі пісьменнік.

[21] Мамін-Сібірак Дзмітрый Наркісавіч (1852—1912) — рускі пісьменнік.

[22] Маецца на ўвазе Мельнікаў Павел Іванавіч (пс. Андрэй Пячэрскі) (1828—1883) — рускі пісьменнік, белетрыст-этнограф.

[23] Майкоў Апалон Мікалаевіч (1821—1897) — рускі паэт.

[24] Мей Леў Аляксандравіч (1822—1862) — рускі паэт і драматург.

[25] Някрасаў Мікалай Аляксеевіч (1821—1877/78) — рускі паэт.

[26] Надсан Сямён Якаўлевіч (1862—1887) — рускі паэт.

[27] Лесінг Готхальд Эфраім (1729—1781) — нямецкі драматург, родапачынальнік нямецкай класічнай літаратуры.

[28] Астроўскі Аляксандр Мікалаевіч (1823—1886) — рускі драматург.

[29] Пушкін Аляксандр Сяргеевіч (1799—1937) — рускі паэт.

[30] Пісемскі Аляксей Феафілактавіч (1821—1881) — рускі пісьменнік.

[31] Даль Уладзімір Іванавіч (1801—1872) — рускі пісьменнік, лексікограф і этнограф.

[32] Памялоўскі Мікалай Герасімавіч (1835—1863) — рускі пісьменнік.

[33] Салтыкоў-Шчадрын Мікалай Яўграфавіч (1826—1889) — рускі пісьменнік-сатырык, публіцыст.

[34] Сянкевіч Генрык (1846—1916) — польскі пісьменнік.

[35] Карамзін Мікалай Міхайлавіч (1766—1826) — расійскі гісторык і пісьменнік.

[36] Гамэр — старажытнагрэчаскі эпічны паэт.

[37] Лермантаў Міхаіл Юр'евіч (1814—1841) — рускі паэт.

[38] Салаўёў Сяргей Міхайлавіч (1820—1879) — расійскі гісторык.

[39] Сэрвантэс Сааведра Мігель дэ (1547—1616) — іспанскі пісьменнік.

[40] Паскаль Блез (1623—1662) — французскі матэматык, фізік, рэлігійны філосаф і пісьменнік.

[41] Русо Жан Жак (1712—1778) — французскі пісьменнік і філосаф.

[42] Песталоцы Ёган Генрых (1746—1827) — швейцарскі педагог.

[43] Тургенеў Іван Сяргеевіч (1818—1883) — рускі пісьменнік.

[44] Сетан-Томпсан Эрнест (1860—1946) — канадскі пісьменнік, мастак-анімаліст.

[45] Твен Марк (1835—1910) — амерыканскі пісьменнік.

[46] Успенскі Глеб Іванавіч (1843—1902) — рускі пісьменнік.

[47] Фет Афанасій Афанасьевіч (1820—1892) — рускі паэт.

[48] Крылоў Іван Андрэевіч (1769—1844) — рускі паэт-байкапісец.

[49] Шэлер-Міхайлаў Аляксандр Канстанцінавіч (1838—1900) — рускі пісьменнік.

[50] Шылер Ёган Фрыдрых (1759—1805) — нямецкі паэт, драматург і тэарэтык мастацтва Асветніцтва.

[51] Шэкспір Уільям (1564—1616) — англійскі драматург і паэт.

[52] Цютчаў Фёдар Міхайлавіч (1803—1873) — рускі паэт.

[53] Дабралюбаў Мікалай Аляксандравіч (1836—1861) — рускі літаратурны крытык, публіцыст, рэвалюцыйны дэмакрат.

[54] Шапенгаўэр Артур (1788—1860) — нямецкі філосаф, прадстаўнік валюнтарызму.

[55] Герцэн Аляксандр Іванавіч (1812—1870) — рускі пісьменнік і філосаф, рэвалюцыянер.

[56] Агароў Мікалай Платонавіч (1813—1877) — расійскі рэвалюцыйны паэт і публіцыст.

[57] Да-Амочыс — асоба аўтара не ўстаноўлена.

[58] Бічэр-Стоў Гарыет (1811—1896) — амерыканская пісьменніца.

[59] Веды — свяшчэнныя індуісцкія тэксты.

[60] Зендавеста — свяшчэнная кніга старажытных іранцаў.

[61] Ксенафонт (каля 430—355 ці 354 да н. э.) — старажытнагрэчаскі пісьменнік і гісторык.

[62] Платон (428 ці 427—348 ці 347 да н. э.) — старажытнагрэчаскі філосаф.

[63] Арыстоцель (348—322 до н. э.) — старажытнагрэчаскі філосаф.

[64] Марк Аўрэлій (121—180) — рымскі імператар з 161 г., філосаф, прадстаўнік позняга стаіцызму.

[65] Спіноза Бенядыкт (Барух) (1632—1677) — галандскі філосаф-пантэіст.

[66] Гус Ян (1371—1415) — чэшскі філосаф, ідэолаг чэшскай Рэфармацыі.

[67] Хельчыцкі Пётр (каля 1390 — каля 1460) — чэшскі філосаф, адзін з паслядоўнікаў Яна Гуса, ідэолаг памяркоўных табарытаў.

[68] Ламенэ Фелісітэ Рабэр дэ (1782—1854) — французскі публіцыст і рэлігійны філосаф, адзін з родапачынальнікаў хрысціянскага сацыялізму.

[69] Канфуцый (каля 551—479 да н. э.) — кітайскі філосаф, заснавальнік канфуцыянства.

[70] Лао-Цзы — кітайскі філосаф 4 — 3 ст. да н. э., ідэолаг даасізму.

[71] "Горн" — часопіс, які выдаваўся ў Маскве ў 1918—1923 г. "пралетарскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі ("Пралеткультам").

[72] У сваім дзённіку П.Сяўрук захоўваў ліст, які ён атрымаў з рэдакцыі маскоўскага выдання "Горн". Гэты ліст утрымліваў такія радкі: "Уважаемый товарищ, Присланные Вами стихи напечатаны быть не могут, т.к. слишком слабы [...] Нет поэтического чувства. Ваши стихи неудачно срифмованная проза и проза при этом бесформенная, туманная. Вы мало читаете, товарищ! Только путем чтения возможно углубить мысль. Отбросьте желание печататься и начинайте прежде всего учиться. А учиться Вам нужно долго! Илья [подпіс неразборлівы] Москва 15.IV.21".

[73] Фурман — жыхар Скідзельшчыны, які быў у бежанстве ў Ліпецку разам з сям'ёй П.Сяўрука.

[74] Вярхоўе — буйная станцыя на тагачаснай Арлоўска-Гразскай чыгуначнай лініі. Цяпер уваходзіць у склад Арлоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

[75] Жудзілава — вёска і чыгуначная станцыя ў тагачаснай Бранскай губерні, цяпер уваходзіць у склад Унечскага раёна Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

[76] Унеча — вёска і чыгуначная станцыя на мяжы тагачасных Бранскай і Гомельскай губерняў, цяпер горад і раённы цэнтр у Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

[77] Навазыбкава — маецца на ўвазе горад Навазыбкаў — уездны цэнтр тагачаснай Гомельскай губерні, цяпер — раённы цэнтр у Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

[78] Злынка — чыгуначная станцыя ў Навазыбкаўскім уездзе тагачаснай Гомельскай губерні, цяпер — у складзе Навазыбкаўскага раёна Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі, за 8 км ад аднайменнага горада.

[79] "Беларускі Партызан"— нелегальная беларуская газета, якая ў 1922 г. распаўсюджвалася сярод жыхароў Заходняй Беларусі і заклікала да ўзброенага паўстання супраць польскіх уладаў.

[80] "Беларускі Каляндар" — віленскае беларускае штогадовае выданне перадусім культурна-асветніцкай скіраванасці.

[81] "Новае жыцьцё" — беларуская газета, якая выходзіла ў Вільні ў сакавіку–траўні 1923 г., выдавалася Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыяй.

[82] "Вялікую галаву маеш" (пол.).

[83] "Лупіць бульбу" (пол.).

[84] Трупаў — настаўнік П.Сяўрука ў Ліпецку, кіраўнік мясцовага краязнаўчага таварыства.

[85] Паліцэйскі ўчастак на чале з камендантам. Існаваў у кожнай гміне.

[86] "Православный календарь" — магчыма, маецца на ўвазе "Варшавский православный календарь", які штогод выходзіў у сталіцы Польшчы.

[87] "Беларуска-маскоўскі слоўнік"— маецца на ўвазе "Маскоўска-беларускі слоўнік", супольная праца Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, другое выданне якой выйшла ў Вільні ў 1921 годзе.

[88] Маецца на ўвазе зборнік вершаў Уладзіміра Жылкі "Уяўленьне", выдадзены ў Вільні ў 1923 г.

[89] "Вольны сьцяг"— беларуская газета, якая выходзіла ў Вільні ў жніўні–кастрычніку 1923 г., выдавалася Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыяй.

[90] Лагіновіч Язэп (1891–1940) — беларускі нацыянальны дзеяч. Адзін са стваральнікаў Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, рэдагаваў яе выданні. Пазней — сябра ЦК КПЗБ. Рэпрэсаваны.

[91] "З.-Ж." — скарачэнне расшыфраваць не ўдалося.

[92] Міністэрства беларускіх спраў у Літве — орган выканаўчай улады ў Літве. Было створана паводле дамовы Віленскай Беларускай Рады і Літоўскай Тарыбы ад 27 лістапада 1918 г. для прадстаўніцтва беларускага насельніцтва пры ўрадзе Літвы. У 1923 г. міністэрства фактычна спыніла сваю дзейнасць.

[93] Маслоўская-Матэйчук Вера (1896–1981) — беларуская нацыянальная дзяячка, адна з арганізатарак беларускага партызанскага руху ў 1922–1923 г. Была асуджана на Беластоцкім працэсе на 6 год турэмнага зняволення.

[94] Беластоцкі працэс — судовы працэс над 45-цю арганізатарамі і ўдзельнікамі беларускага партызанскага руху, які праходзіў у Беластоку ў траўні 1923 г. Увайшоў у гісторыю таксама як "Працэс 45-ці".

[95] Багдановіч Вячаслаў (1876 — пасля 1939) — беларускі царкоўны і грамадска-палітычны дзеяч. У 1922—1930 г. сенатар Польскай Рэспублікі, член Беларускага пасольскага клуба.

[96] Жыдомля — вёска, цэнтр гміны ў Гарадзенскім павеце. Цяпер у Гродзенскім раёне.

[97] Белорусское Крестьянско-Рабочее Общество — маецца на ўвазе Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада

[98] Валошын Павел (1891—1937) — беларускі дзеяч. У 1923—1927 г. пасол польскага сойму, адзін са стваральнікаў БСРГ.

[99] Якімовіч Мікалай (1896—1929) — беларускі актывіст у Гарадзенскім павеце. Старшыня Гарадзенскага павятовага сакратарыята БСРГ. Неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі.

[100] Гуліда Міхал — адзін з заснавальнікаў і актыўных сябраў скідзельскага гуртка ТБШ.

[101] Чанінг Уільям Элеры (1780—1842) — амерыканскі пісьменнік, тэолаг, прапаведнік.

[102] Варфаламееўская ноч — масавае забойства гугенотаў каталікамі, якое было ўчынена ў Парыжы ў ноч на 24 жніўня 1572 г., на свята святога Варфаламея.

[103] П. Сяўрук мае на ўвазе тыя дні ў сярэдзіне студзеня 1927 г., калі польскімі ўладамі былі арыштаваныя лідэры Беларускай сялянска-работніцкай грамады.

[104] Дзмітрый Растоўскі (1651—1709) — рускі царкоўны пісьменнік і прапаведнік, у 1701—1709 г. растоўскі мітрапаліт. Пасля смерці быў прылічаны да ліку святых. Аўтар працы "Чэцьі-Мінеі" — 12-томнага зводу жыццяў святых, які ахопліваў усё гадавое кола.

[105] Хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе "Беларускі правапіс" Радаслава Астроўскага.

[106] Маецца на ўвазе "Гісторыя беларускай літаратуры" Максіма Гарэцкага.

[107] Дзенькаўцы — вёска ў Мастоўскай гміне Гарадзенскага павета, цяпер у Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці.

[108] Дубна — вёска, цэнтар гміны ў Гарадзенскім павеце, цяпер у Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці

[109] Маецца на ўвазе Васіль Сіткевіч.

[110] Маецца на ўвазе спрэчка, якая ў 1927 г. вялася на старонках беларускіх газет рознай палітычнай агітацыі ў асноўным паміж Антонам Луцкевічам і ягонымі ідэалагічнымі апанентамі — лідэрам Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Адамам Станкевічам і лідэрамі Беларускага сялянскага саюза Фабіянам Ярэмічам і Васілём Рагулем. Падчас гэтай спрэчкі бакі не скупіліся на цяжкія абвінавачанні і нават на ўзаемныя абразы.

[111] Касяк — біяграфічныя звесткі адсутнічаюць.

[112] Маецца на ўвазе Міхал Касцевіч (Міхась Васілёк).

[113] "Беларускі дзень" — штотыднёвая грамадска-палітычная, сельскагаспадарчая і літаратурная газета паланафільскай арыентацыі, якая выдавалася ў 1927—1928 г. у Вільні пад рэдакцыяй Францішка Ўмястоўскага.

[114] "Strzelec" ("Стралец") — ваенізаваная маладзёжная арганіацыя ў міжваеннай польскай дзяржаве, вызначалася шавіністычным духам.

[115] Пад № 43 на выбарах у Сенат у Беластоцкім ваяводстве пад шыльдай Беларускага незалежнага выбарчага камітэта сялян і рабочых выступалі беларускія дзеячы левай палітычнай арыентацыі (былыя радыкальныя грамадоўцы).

[116] Староста — кіраўнік павятовай адміністрацыі ў міжваеннай польскай дзяржаве.

[117] "Swięty Krzyż" ("Святы Крыж") — Маецца на ўвазе турма, якая знаходзілася ў Келецкім ваяводстве Польшчы ў будынках былога г.зв. Сьвентакшыскага бенедыктынскага манастыра на Лысай гары (адсюль назва). Ад найбліжэйшага горада да яе трэба было ехаць 4 гадзіны. Прызначалася ў асноўным для ўтрымання асуджаных на пажыццёвае зняволенне і была вядомая надзвычай кепскімі ўмовамі ўтрымання вязняў. Кіраўнікі БСРГ у гэтую турму ў рэшце рэшт не патрапілі.

[118] Магчыма, П.Сяўрук згадаў гісторыю забойства Міхала Гурына-Маразоўскага, беларускага дзеяча, лідэра г.зв. "сэцэсіі" ў КПЗБ, які быў забіты за супрацоўніцтва агентам КПЗБ як правакатар. Хаця Гурын быў забіты ў Вільні.

[119] Ласосна — вёска ў ваколіцах Гародні.

[120] Булгакаў Валянцін Фёдаравіч (1886-1966), пісьменнік, мемуарыст, сакратар Ільва Талстога і адзін з лідэраў "талстоўства".

[121] Ралан Рамэн (1866—1944) — французскі пісьменнік.

[122] Маецца на ўвазе Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб.

БІБЛІЯГРАФІЯ

публікацый твораў Пятра Сяўрука і прац аб яго жыцці і творчасці.

1. Брыль Я. З рукапісаў, якія не гараць // Полымя. 1986. №10.

2. Вашкевіч А. Архіў, які не знік // Гродзенская праўда. 2005. 9 ліпеня.

3. Вашкевіч А. Пётра Сяўрук і яго справа // Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX — першая траціна XX ст. Менск: "Тэхналогія", 2007.

4. Вашкевіч А. Галасы з мінулага стагоддзя (перапіска заходнебеларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў з Пятром Сяўруком) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2007. №28.

5. Голуб Ю. Не знала думка бездарожжа // Гродзенская праўда. 2005. 19 сакавіка.

6. Голуб Ю. Чаму сэрца маё засмуцілася? // Гродзенская праўда. 2000. 12 лютага.

7. Дзелянкоўскі М. "Душа баліць і рвецца". Пятру Сяўруку споўнілася б 100 год // Народная Воля. 2005. 12 ліпеня.

8. Дзелянкоўскі М. З грудзей рваўся крык пратэсту // Шляхам гадоў. Мінск: "Мастацкая літаратура", 1994.

9. Дзелянкоўскі М. Край паэтаў // Беларуская мінуўшчына. 1993. № 5–6.

10. Дзелянкоўскі М. Скідзель: Дакументальна-лірычны нарыс. — Мн.: Полымя, 1987. — 111 с.

11. Калеснік У. Этапы ростані і волі // Ростані волі. Мінск: "Мастацкая літаратура", 1990.

12. Калеснік У. Час і песні. Мінск. 1962.

13. Нікіпорчык А. "Мой прастор — гэта думкі палёт..." // Гродзенская праўда. 2000. 20 чэрвеня.

14. Пётр Сяўрук // Беларускія пісьменнікі. Мн: БелЭн, 1995. Т. 5.

15. Ростані волі. З заходнебеларускай паэзіі. Мн.: Маст. Літ, 1990.

16. Сяўрук М. Што нагадаў фотаздымак? // Памяць. Гродзенскі раён. Мн.:БелЭн, 1993.

17. Сяўрук П. З архіву Пётры Сяўрука // Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX — першая траціна XX ст. Менск: "Тэхналогія", 2007.

18. Сяўрук П. Да "правадыроў" беларускага народу // ARCHE. 2005. № 4.

19. Черепица В.Н. Счастье для других. Западнобелорусские последователи религиозно-философского учения Л.Н. Толстого (1921—1939 г.). Гродно, 2007.

20. Яшчэ адно імя, яшчэ адзін талент // Памяць. Гродзенскі раён. Мн.: БелЭн, 1993.

Ад выдаўцоў

"Небыцця не існуе. Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху" — трэці том, заснаванай намі ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ.

Пётр Сяўрук (1905—1929) быў актыўным удзельнікам беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1920-х г., адным з лідэраў Таварыства беларускай школы на Гарадзеншчыне. Пайшоўшы з гэтага свету ў 24 гады, П.Сяўрук пакінуў багатую рукапісную спадчыну. П.Сяўрук пісаў на беларускай і рускай мовах філасофскія і публіцыстычныя творы, вершы і апавяданні, вёў дзённік, у якім занатоўваў і каментаваў падзеі тагачаснага жыцця Заходняй Беларусі. Большасць з напісанага П.Сяўруком ніколі не друкавалася. Спадчына П.Сяўрука — гэта погляд мясцовага дзеяча нацыянальнага руху, які дазваляе сучаснаму чытачу больш глыбока зразумець гістарычныя падзеі той складанай і гераічнай эпохі ў гісторыі беларускага народа.

Дзякуем пляменніку Пятра Сяўрука, пісьменніку Мікалаю Дзелянкоўскаму, за неацэнную дапамогу ў падрыхтоўцы гэтай кнігі.

Дзякуем пляменніцы Пятра Сяўрука, Маргарыце Францавай, за дапамогу архіўнымі матэрыяламі і фотаздымкамі.

Дзякуем усім, хто з намі.

На старонках кніг, якія складаюць ГАРАДЗЕНСКУЮ БІБЛІЯТЭКУ, прадстаўлена забытая гісторыя Гародні, традыцыя суіснавання розных народаў і культур, памяць пра гістарычную спадчыну, культурніцкія і літаратурныя дасягненні творцаў горада на працягу стагоддзяў.

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА — гэта яшчэ адзін напамін гарадзенцам, што лёс горада ў іх руках. Толькі агульнымі намаганнямі мы здолеем перанесці ў наступныя стагоддзі непаўторнасць гістарычнай Гародні, зберагчы яе ўнікальнасць для нашчадкаў.

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА прысвячаецца той Гародні, якой мы можам ганарыцца.

Выйшлі з друку:
Юры ГАРДЗЕЕЎ "Магдэбургская Гародня"
Данута БІЧЭЛЬ "Хадзі на мой голас"

Рыхтуюцца да друку:
Аляксей КАРПЮК "Развітанне з ілюзіямі"

Па ўсіх пытаннях, звязаных з ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭКАЙ, звяртацца **zasvabodu.hrodna@gmail.com**

Правадыры ніколі ў нас не будавалі нацыянальнай супольнасці, не вызначалі стратэгічных мэтаў, не стварылі, узорам суседніх народаў, нацыянальнай міфалогіі, сваімі паводзінамі вялі да разгубленасці грамадства і замацоўвання ўсялякіх праяваў тутэйшасці... ...Чалавек фармату Пётра Сяўрука – гэта рэдкасць у гісторыі беларускага руху.

Яўген Мірановіч

Пётр Сяўрук заслугоўвае сёння памяці як адзін з пачынальнікаў сучаснай беларускай ідэі нацыянальнай незалежнасці.

Ежы Тамашэўскі

Сябры:

ISBN 978-83-89185-88-4

Невядомыя старонкі
беларускага нацыянальнага руху

НЕБЫЦЦЯ НЕ ІСНУЕ

